

ЯК ПАБУДАВАЦЬ ДЗІЦЯЧУЮ ПЛЯЦОЎКУ

МС

ШТО НАЙМАЛЬНІКІ ПРАПАНУЮЦЬ МАЛАДЫМ СПЕЦЫЯЛІСТАМ

МС




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

16 ЖНІЎНЯ 2019 г.
ПЯТНІЦА
№ 154 (29021)



9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TVПРАГРАМА


## ЛІЧБА ДНЯ

**На 82 %**

*выкананы план паставак збожжа ў лік дзяржзаказу, ужо пастаўлена 668 тысяч тон, паведамляе Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання. Па стане на 15 жніўня збожжавыя і зернебабовыя культуры (без кукурузы, грэчкі і проса) сабраны з 1,79 мільёна гектараў, што складае 83,7 % ад запланаванага. Беларускія аграрыі намалацілі амаль 5,7 мільёна тон збожжа пры сярэдняй ураджайнасці 31,8 цэнтнера з гектара (летась на гэтую дату — 26,7 цэнтнера з гектара). У лідарах Брэсцкая вобласць: тут убрана 98,7 % плошчаў, намалочана звыш 1189 тысяч тон збожжа. Аграрыі Гродзенскай вобласці сабралі 94 % плошчаў, намалаціўшы больш за 1147 тысяч тон збожжа. У тройцы лідараў уборачнай кампаніі і Мінская вобласць. Тут план па ўборцы збожжавых і зернебабовых выканаIны на 84,7 %, намалот складае 1466,9 тысяч тон.*



## КОРАТКА

- **На 7 % выраслі рэальныя грашовыя даходы беларусаў у I паўгоддзі 2019 года.**
- У Беларусі пашыраны спіс сацыяльна значных тавараў з часова рэгуляванымі цэнамі.
- **У Беларусі асвоілі вытворчасць комплексаў берагавой аховы з самалётамі-амфібіямі.**
- У Драгічыне (Брэсцкая вобласць) за суткі выпала каля 70 % месячнай нормы ападкаў.
- **Рэгіянальны фестываль «Дрыбінскія таржкі» пройдзе 15—17 жніўня ў Дрыбіне.**


ISSN 1990 - 763X


Тэхналогіі

# Бяспечныя, хуткія і эфектыўныя

## Якія аперацыі беларускія афтальмолагі робяць пры катаракце, глаўкоме і іншых хваробах вачэй



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Урач першай катэгорыі Рэспубліканскага афтальмалагічнага цэнтра, асістэнт кафедры афтальмалогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі Святлана КАРАСЁВА падбірае пацыенту акуляры, вызначаючы вастрыню зроку.

**«У нас на прыёме няпросты пацыент — у 2014 годзе ў яго было навылётнае раненне, якое зачапіла вока. Траўма здарылася на вытворчасці. Тады зрок маладому чалавеку ўдалося захаваць. І вось праз пяць гадоў развілася сур'ёзнае ўскладненне — адслаенне сятчаткі», — каментуе, праводзячы нас па дыягнастычным кабінеце, галоўны пазаштатны афтальмолаг Міністэрства аховы здароўя, загадчык кафедры афтальмалогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, доктар медыцынскіх навук, прафесар Тацццяна ІМШАНЕЦКАЯ. Як спраўляцца з самымі складанымі захворваннямі вачэй найноўшымі метадамі, што адпавядаюць сусветным тэндэнцыям, добра ведаюць у Рэспубліканскім афтальмалагічным цэнтры, які працуе пры 10-й гарадской клінічнай бальніцы г. Мінска. Тут робяць усе віды высокатэхналагічных аперацый пры захворваннях вачэй, траўмах і іх наступствах, у тым ліку прымяняюць самыя сучасныя метады лячэння глаўкомы і катаракты, выконваюць трансплантацыі рагавіцы, а экзапратэзаванне арбіты (яе аднаўленне пасля траўмаў і анказахворванняў) не робіцца больш ні ў адной з краін СНД.**


СТАР. 4


На слыху

## Ігар МАРТЫНАЎ: «Будзем дабівацца, каб салдатам налічваўся страхавы стаж»

**Цяперашняя прызыўная кампанія праходзіць як ніколі ажыўлена. Звязана гэта з тым, што ў пачатку жніўня ўступіў у дзеянне закон «Аб змяненні законаў па пытаннях эфектыўнага функцыянавання ваеннай арганізацыі дзяржавы». Кажучы інакш, цяпер замацавана правіла адной адтэрміноўкі для працягу навучання. На мінулым тыдні градус напалу быў крыху зменшаны — Міністэрства абароны паведаміла, што для магістрантаў і студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў, якія паступалі сёлета, правілы гульні застаюцца ранейшыя. Але толькі на гэты год.**



Фота БелТА.

**Разам з тым канчатковую кропку ставіць тут яшчэ рана. Завесу таямніцы крыху прыадкрыў член Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Ігар МАРТЫНАЎ.**

**— Як доўга сярод парламентарыяў ішла работа датычна змянення колькасці адтэрміновак ад войска?**

— Рашэнне было не спантаннае. Дзесьці з канца мінулага года гэта пытанне ўжо сур'ёзна ўздымалася. Быў праведзены аналіз, колькі чалавек прызываецца, а колькі атрымлівае адтэрміноўку і з якіх прычын. І стала зразумела, што пытанне трэба неяк вырашаць.


СТАР. 2

# «Будзем дабівацца, каб салдатам налічваўся страхавы стаж»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Падчас гэтай работы вывучаўся і міжнародны досвед. Мы глядзелі, як складваецца сітуацыя з адтэрміноўкамі ў краінах СНД, у нашых геаграфічных суседзяў у Еўропе. Напрыклад, у Літве, дзе быў адноўлены прызыў, колькасць адтэрміновак значна меншая, чым у Беларусі. У нас — 47 відаў і 76 катэгорый. У Расіі — 29 адтэрміновак. У Казахстане — 17 адтэрміновак. Таму ў нас і так іх больш за ўсіх.

**— Якія цікавыя прапановы вылучаліся падчас абмеркавання?**

— Гучала ідэя ўвогуле ліквідаваць адтэрміноўку па вышэйшай адукацыі. Вярнуцца да досведу, які меў месца ў 1980-я гады. Розныя гучалі думкі, ішлі вельмі ажыўленыя і сур'ёзныя дыскусіі, і шляхам галасавання прыйшлі да таго выніку, які трансфармаваўся ў закон.

**— Ці павялічыцца колькасць ваенных кафедраў? Нядаўна адна з іх была заснавана ў Беларускім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце. Яна пачне працаваць з 1 верасня. Вядома, што яны дзейнічаюць яшчэ ў 12 установах адукацыі. Але ж застаецца істотная колькасць ВНУ і каледжаў, дзе іх няма.**

— Цяпер мы прапрацоўваем пытанне ўводу яшчэ адной ваеннай кафедры. Мяркуецца, што яна з'явіцца ў адным з абласных цэнтраў. Ці патрэбна павялічваць іх колькасць так, каб яны былі ў большасці ўстаноў адукацыі, — гэта ўжо іншае пытанне. Ваенная кафедра ж заўжды ўводзіцца не проста так. Гэтаму папярэднічае аналіз, у якой ступені зараз патрэбны Узброеным Сілам пэўныя ваенна-ўліковыя спецыяльнасці, якія можна атрымаць у грамадзянскіх універсітэтах.

Акрамя таго, цяпер заканадаўча замацавана норма, згодна з якой выпускнік можа выбраць службу па кантракце замест размеркавання. Увогуле ў нас суадносіны салдат тэрміновай службы і кантрактнай — 40 на 60 працэнтаў. Згодна з артыкулам 5 закона аб воінскім абавязку і воінскай службе, апошняя з'яўляецца асаблівым відам дзяржаўнай службы і мае прыярытэт перад іншымі яе відамі. Таму цяпер гэта норма закладзена больш канкрэтна.

**— Яшчэ адзін немалаважны пункт зменаў — скарачэнне тэрмінаў абскарджвання. Ваеннае ведамства паведаміла, што гэта было зроблена з-за хітрыкаў некаторай часткі прызыўнікоў.**

— Так, яны карысталіся наступнай схемай. Кожны прызыў цягнецца чатыры месяцы — з лютага да мая і са жніўня да лістапада. Праходжанне медыцынскай камісіі звычайна складае каля месяца з улікам усіх дадатковых абследаванняў. Затым прызыўнік атрымлівае рашэнне прызыўной камісіі. Тэрмін абскарджвання ў выпадку нязгоды складаў да месяца. Вось таму некаторыя хітрыны наўмысна цягнулі яго ледзь не да апошняга дня, а пасля накіроўвалі скаргу ў абласную або Мінскую гарадскую камісію. Калі і там урачы не знаходзілі падстаў для вызвалення ад прызыву, — вытрымлівалася паўза яшчэ каля месяца, а ў апошні дзень пастаўу іск у суд. На час абскарджвання, натуральна, прызыўнік атрымлівае «імунітэт» — у войска яго забраць не могуць. А пасля пачынаўся снежань або чэрвень — і прызыў заканчваўся, а падчас наступнага сітуацыя паўтаралася.

**— А ці не паступала прапаноў увесці больш строгі адбор у магістратуру, каб туды паступалі людзі, «заточаныя» больш на навуку?**

— Раней магістратура была як навукова арыентаваная, так і практыка арыентаваная. Ад гэтага года магістратура будзе толькі навукова арыентаваная. Рабіць больш жорсткім адбор сэнсу я не бачу. Ужо цяпер сюды будзе паступаць тая катэгорыя, якая мае працаваць на навуку, атрымліваць рэкамендацыі ў ВНУ, працаваць над дысертацыямі паспяхова.

**— А як будзе паляпшацца ваенна-патрыятычная падрыхтоўка ва ўстановах адукацыі?**

— Сістэма ўжо выбудавана трывалая. У нас стала працуюць у многіх школах адпаведныя класы, пашыраецца кадэцкі рух. У раёнах ствараюцца цэнтры дапрызыўнай падрыхтоўкі, каб ужо ў іх вучань мог упершыню дакрануцца да армейскіх будняў. Пытанне насамрэч у іншым — што такое наогул патрыятычнае выхаванне? Гэта вельмі шырокае і сур'ёзнае паняцце — прышчапіць малому гонар за сваю Радзіму. І займацца ім павінны ўсе: бацькі, выхавальнікі ў дзіцячым садку, настаўнікі ў школе... Ваенна-патрыятычнае выхаванне — гэта толькі маленькае адгалінаванне ад гэтага вялікага комплексу, каб даць юнаку азы пачатковай ваеннай падрыхтоўкі для абароны сваёй зямлі. І тут пастаянна шукаюцца новыя метады, каб армія не была для юнака чымсьці загадкавым, з чым ён упершыню сутыкнецца толькі тады, калі атрымае павестку з ваенкамата.

**— Якія прэферэнцыі мяркуецца даваць абітурыентам, якія ўжо адслужылі ў войску? Напрыклад, пазачарговае выдзяленне інтэрната — важная рэч. Але толькі для іншагародніх студэнтаў. Для «мясцовых» яно з натуральных прычын неактуальнае.**

— Мы зноў будзем уздымаць пытанне, каб налічваўся страхавы стаж за перыяд тэрміновай службы. Ужо ўзгадненне ў многіх дзяржаўных органах атрымана. Гэта тэма вельмі востра стаіць у грамадстве і бурна абмяркоўваецца. Падчас жа паступлення непасрэдна ў ВНУ пры аднолькавай колькасці набраных балаў у абітурыента, які адслужыў, будзе прыярытэт пры паступленні. Разглядаюцца і іншыя прапановы. Думаю, да канца года будзе знойдзены кансэнсус, у якім выглядзе ўсё гэта мець.

**— Ваенкаматы праводзяць апытанне прызыўнікоў і звольненых у запас. Можаце падзяліцца яго вынікамі?**

— Сярод іншага там ёсць пытанне аб адносінах да службы ва Узброеных Сілах. І трансфармацыя тут вельмі цікавая. 40 працэнтаў апытаных указалі, што хочуць служыць, прыкладна траціна ставіцца да гэтага пытання нейтральна — прызвалі і прызвалі. Рэшта адносіцца негатыўна. Але, можа, тут ёсць момант скажэння пункту гледжання пры прызывам, арыентуючыся на думку «як бы чаго не выйшла»? Тады давайце глядзець вынікі апытання, якое праводзіцца ў ваенкаматах ужо пасля звальнення ў запас. Больш за 80 % адзначаюць, што служба прайшла для іх з карысцю, яны атрымалі і досвед, і змянілі погляды на жыццё. А гэтая лічба кажа сама за сябе.

**Гутарыў Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

## ЁСЦЬ ПЫТАННІ? КАЛІ ЛАСКА

**Традыцыйныя тэлефонныя лініі пройдуць у гэтую суботу, 17 жніўня, у аблвыканкамах і Мінгарвыканкаме. З 9.00 да 12.00 іх правядуць:**

намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Вадзім Іванавіч АЛЬШЭЎСКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;

намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Уладзімір Мікалаевіч БЕЛАВУС. Тэл. 8 021 222 22 22;

намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Андрэй Васілевіч КАНЮШКА. Тэл. 8 023 233 12 37;

намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Уладзімір Іосіфавіч ДЗЯШКО. Тэл. 8 015 273 56 44;

кіраўнік спраў МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Рыгор Аляксандравіч ВАРОНІН. Тэл. 8 022 250 18 69;

намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Іван Станіслававіч МАРКЕВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;

намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Арцём Мікалаевіч ЦУРАН. Тэл. 8 017 222 44 44.

## Класныя навіны

# КОЛЬКАСЦЬ ШКОЛЬНІКАЎ ПЕРАСЯГНЕ МІЛЬЁН

**«Занімай, Беларусь маладая мая, свой пачэсны пасад між народамі!» Гэты радок з верша Янкі Купалы «Маладая Беларусь» быў прапанаваны ў якасці тэмы для першага ўрока ў Дзень ведаў. Словы песняра беларускага народа сугучныя з тэмай Года малой радзімы, падкрэсліваюць суверэнітэт і незалежнасць Рэспублікі Беларусь. Таксама ў ходзе першага ўрока знойдзе сваё адлюстраванне тэма Вялікай Перамогі.**

Паколькі сёлета 1 верасня прыпадае на выхадны дзень, то ўсе ўрачыстасці, звязаныя з пачаткам новага навучальнага года, пройдуць у школах і гімназіях 2 верасня.

Як паведамляе прэс-служба Міністэрства адукацыі, у новым навучальным годзе за парты сядуць 1 мільён 30 тысяч школьнікаў, у тым ліку 115 тысяч першакласнікаў. У 2019 годзе ва ўстановы сістэмы адукацыі былі накіраваныя 4,3 тысячы маладых спецыялістаў.

Да новага навучальнага года ў Беларусі расчыняць дзверы восем школ-новабудоўляў, разлічаных амаль на 7,3 тысячы месцаў, у тым ліку дзве ў Мінску: адна ў Першамайскім раёне сталіцы (СШ № 93 на 792 месцы), другая — у Фрунзенскім (СШ № 2 на 1020 месцаў).

Міністр адукацыі Ігар Карпенка наведаў сталічныя навабудоўлі і азнаёміўся з ходам падрыхтоўкі школ да новага навучальнага года. СШ № 93 размяшчаецца ў сучасным будынку, абсталяваным усім неабходным для вучобы, заняткаў спортам і пазакласных мерапрыемстваў. У ёй знайшлося месца для рэсурсных цэнтраў, лабараторый, лінгафонных кабінетаў, спартыўнай, гімнастычнай і трэнажорнай зал з раздзявальнямі. Прадугледжаны радыёвузел і канферэнц-зала на 80 месцаў, інфармацыйна-выставачнае памяшканне, памяшканне для індывідуальных і групавых заняткаў, актавая зала на 260 месцаў з касцюмерным, эстрадным і інвентарным пакоямі і санвузлом. У школьнікаў будзе магчымасць наведваць навучальны цір. Акрамя таго, тут будзе створана безбар'ернае асяроддзе для арганізацыі адукацыйнага працэсу дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

Сярэдняя школа № 2 у Фрунзенскім раёне вельмі падобная па сваім напаўненні: тут таксама будуць функцыянаваць лабараторыі, майстэрні для працоўнага навучання, вучэбна-спартыўныя залы, цір, лыжная база, інфармацыйна-тэхнічны цэнтр, агульнашкольны цэнтр з актавай залай, памяшканні для эстэтычнага выхавання і гуртковай работы і басейн. Створана безбар'ернае асяроддзе.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Данія ўзмацняе кантроль на граніцы са Швецыяй




Дацкі ўрад вырашыў узмацніць кантроль на дацка-шведскай граніцы ў сувязі з інцыдэнтам, які адбыўся 6 жніўня ў Капенгагене. Тады побач з будынкам падатковай паліцыі прагрымеў выбух. Ніхто не пацярпеў. На наступны дзень паліцыя арыштавала падазраванага — 22-гадовага грамадзяніна Швецыі. Яго меркаваны саўдзельнік, таксама шведскі падданы, аб'яўлены ў міжнародны вышук. «Гаворка ідзе не пра людзей, якія жывуць у прыгранічных зонах, не пра тое, што многія ездзяць туды-сюды праз граніцу, і не пра тавары, што ўвозяцца і вывозяцца. Гаворка ідзе пра злачынцаў. І цяпер мы пачынаем вывучаць магчымасць лепшай і больш эфектыўнай абароны граніцы», — адзначыла прэм'ер-міністр Даніі Мэтэ Фрэдэрыксен. Узмацніць кантроль на дацка-шведскай граніцы плануецца праз устаноўку дадатковых камер відэаназірання. Таксама абмяркоўваецца магчымасць электроннага фіксавання аўтамабільных нумароў. Данія і Швецыя злучаныя Эрэсунскім мостам праз 16-кіламетровы праліў. Тысячы грамадзян з двух краін штодня перасякаюць граніцу на цягніку або аўтамабілі.

### Больш за 150 мільёнаў дзяцей у свеце знаходзяцца ў рабстве



Амаль кожнае дзясятае дзіця ў свеце знаходзіцца ў працоўным рабстве. Пра гэта гаворыцца ў апублікаваным даследаванні спецдакладчыка ААН па пытанні аб сучасных формах рабства Урмілы Бхаолы. «Паводле ацэнак, у рамках якіх не ўлічваліся выпадкі дазволенай дзіцячай працы, па ўсім свеце прымусовую працу робяць 152 мільёны дзяцей (64 мільёны дзяўчынак і 88 мільёнаў хлопчыкаў)», — адзначаецца ў дакладзе сусветнай арганізацыі, на які спасылаецца ТАСС. Пры гэтым у найменш развітых краінах «прыблізна кожнае чацвёртае дзіця ва ўзросце ад 5 да 17 гадоў займаецца працай, якая лічыцца шкоднай для здароўя і развіцця». У даследаванні адзначаецца, што праблема дзіцячай працы найбольш характэрная для краін з нізкім узроўнем даходу, аднак яна закранае і іншыя краіны. «Паводле ацэнак на 2016 год, Афрыка перасягнула Азіяцка-Ціхаакіянскі рэгіён і стала рэгіёнам з самымі высокімі паказчыкамі дзіцячай працы», — інфармуюць у ААН. Да формаў эксплуатацыі даследчыкі адносяць у тым ліку выкарыстанне дзяцей для гандлю наркотыкамі, а таксама прымусовыя ранні шлюбы. «Паводле ацэнак, у прымусовым шлюбе знаходзіцца 5,6 мільёна дзяцей, — інфармуе Бхаола. — Самы высокі паказчык дэманструе Азіяцка-Ціхаакіянскі рэгіён, за якім ідзе Афрыка».

### Старажытныя пінгвіны ў Новай Зеландыі былі ростам з чалавека



Навукоўцы прадэманстравалі нядаўна знойдзеныя ў Новай Зеландыі астанкі гіганцкага пінгвіна, рост якога дасягаў 160 см, а вага — 80 кг. Пінгвін жыў у Новай Зеландыі ў эпоху палеацэну (66—56 мільёнаў гадоў таму). Жывёла, якую Кентэрберыйскі музей у горадзе Крайстчэрчы ахрысціў «пінгвінам-монстрам», папоўніла спіс вымерлай гіганцкай новазеландскай фаўны. Гэты від быў характэрны для водных прастораў Паўднёвага паўшар'я. Навукоўцы мяркуюць, што пінгвіны сталі такія вялікія таму, што з акіяна зніклі буйныя марскія рэптыліі (прыблізна ў той жа час, калі вымерлі дыназаўры на сушы). «Мы думаем, што ў той час жывёлы эвалюцыянавалі вельмі хутка, — патлумачыў «Бі-бі-сі» старшы куратар Кентэрберыйскага музея Пол Скофілд. — У той перыяд тэмпература вады каля берагоў Новай Зеландыі была ідэальная для развіцця фаўны». У часы распаўсюджвання гіганцкіх пінгвінаў Новая Зеландыя злучалася з Аўстраліяй, якая, у сваю чаргу, як мяркуюць навукоўцы, была злучаная сушай з Антарктыдай. Пакуль не да канца зразумела, чаму гіганцкія пінгвіны зніклі з вод Паўднёвага паўшар'я. Найбольш імаверная гіпотэза заключаецца ў тым, што гэта адбылося проста з-за большай канкурэнцыі за ежу з марскімі млекакормячымі.

# БЯЖЫМ РАЗАМ

## Пад такім лозунгам пройдзе пяты юбілейны Мінскі паўмарафон, да старту якога застаецца ўсяго месяц

**Традыцыйна самы масавы забег краіны стартуе ў дзень нараджэння сталіцы, сёлета ён адбудзецца 15 верасня. Арганізатары чакаюць убачыць на старце 40 тысяч чалавек, сярод якіх будуць аматары спорту і прафесійныя элітныя бегуны. Роўна за месяц да старту паўмарафону на яго ўжо зарэгістраваліся прадстаўнікі 57 краін, у тым ліку далёкія госці — бегуны з ЗША, Аўстраліі, Індыі, Танзаніі, Эфіопіі і іншых краін.**



Фота БелТА.

Сёлета ўдзельнікі, як і раней, прабягуць адну з заяўленых дыстанцый — 5,5 км, 10,5 км або 21,1 км. За пяць гадоў Мінскі паўмарафон паспеў атрымаць спачатку бронзавы (у 2017 годзе), а пасля і сярэбраны (у 2019 годзе) лэйбл ад IAAF. У 2015 годзе ён сабраў 16 тысяч чалавек, у 2016-м — 20, а ў 2017-м — 30 тысяч прыхільнікаў актыўнага ладу жыцця. Мінскі паўмарафон ужо стаў брэндам не толькі сталіцы, але і нашай краіны ў цэлым, лічыць **намеснік міністра спорту і турызму краіны Вячаслаў ДУРНОЎ**. Гэта падзея, пра якую гавораць не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі. *«Для падрыхтоўкі маштабнага забегу ўжо зроблена вялікая работа, таму нішто, нават надвор'е, не перашкодзіць нам правесці мерапрыемства на высокім узроўні,* — адзначыў Вячаслаў Віктаравіч. — *Здаровы лад жыцця стаў модны ў нас у краіне, гэта вельмі радуе, мы, як краіна, атрымаем ад гэтага вялікі плюс»,* — запэўніў ён, дадаўшы, што сёння на Мінскі паўмарафон людзі рэгіструюцца ўжо цэлымі арганізацыямі і штогод павышаюць сваё майстэрства, пераходзячы ад мінімальных дыстанцый на больш сур'ёзныя.

Традыцыйна ў Мінскім паўмарафоне бяруць удзел не толькі беларусы, але і замежнікі, — напрыклад, летась на дыстанцыю выйшлі прадстаўнікі многіх рэгіёнаў Беларусі, а таксама бегуны з 53 іншых краін. Мінулы паўмарафон наведала 1200 замежнікаў, сёлета іх ужо дакладна будзе больш. На дадзены момант зарэгістраваны прадстаўнікі 57 дзяржаў. Сярод замежнікаў больш за ўсё расіян — гэта аматары спорту з 85 гарадоў гэтай краіны. І таксама будуць прысутнічаць прадстаўнікі Бельгіі, Польшчы, Егіпта, Ірана, Італіі, Галандыі, Марока, Індыі і іншых краін. Іх прыбыццё ў Беларусь і знаходжанне ў ёй аблегчыць трыццацідзённы бязвізавы рэжым. *«Людзі, якія прыедуць на паўмарафон, змогуць выдзеліць час і на знаёмства з нашай краінай. Мы бачым і адчуваем, як цікавасць да Беларусі прачынаецца з кожным годам»,* — адзначыў Вячаслаў Дурноў.

Сярэбраны лэйбл Мінскага паўмарафону прадугледжвае ўдзел у ім і элітных спартсменаў, таму 15 верасня на трасе горада мы ўбачым многіх афрыканскіх марафонцаў, а таксама кваліфікаваных спартсменаў з Еўропы. Вядома, прымуць удзел у ім і беларусы, напрыклад Ніна Савіна і Святлана Кудзеліч. А вось Вольга Мазуронак старт прапусціць — яна планамерна рыхтуецца да чэмпіянату свету.

У сёлетнім паўмарафоне будзе прысутнічаць шэраг нававядзенняў, напрыклад прызавы фонд забегу вырас з леташніх 50 тысяч долараў да 60 тысяч. Новыя будуць і медалі: узнагароды адрозніваюцца колерам у залежнасці ад дыстанцыі



і ўпрыгожаны нацыянальнымі беларускімі ўзорамі. На фінішы іх па-ранейшаму атрымае кожны ўдзельнік. З'явіўся ў маштабнага забегу і свой маскот — заяц. Цяпер у сацыяльных сетках паўмарафону і Беларускай федэрацыі лёгкай атлетыкі аб'яўлены конкурс на пошук імя для талісмана.

*«Мы рады, што кожны год ахвотных прыняць удзел у Мінскім паўмарафоне робіцца ўсё больш, для нас гэта вялікая перамога,* — дзеліцца **старшыня Беларускай федэрацыі лёгкай атлетыкі Вадзім ДЗЕВЯТОЎСКІ** *(на фота).* — *Гэтае мерапрыемства вельмі моцна аб'ядноўвае, там пануе неверагодная атмасфера, да якой далучаецца кожны. Сёння мы бачым, што ідуць моцныя пераходы з пяцікіламетровай дыстанцыі на дзесяцікіламетровую, гэта значыць культура бегу ў краіне развіваецца. Але мне хацелася б звярнуць увагу ўсіх, а асабліва пачаткоўцаў, студэнтаў і школьнікаў, на пытанні здароўя. Тут не трэба подзвігаў, для непадрыхтаванага арганізма нават пяць кіламетраў — гэта стрэс, таму не трэба сароменца перахадзіць на крок, дарэчы, напачатку я і сам так рабіў. Я заклікаю адказна ставіцца да свайго здароўя і бегчы па сваіх магчымасцях».*

На працягу ўсёй дыстанцыі, як і ў ранейшыя гады, будуць дзяжурыць валанцёры, гатовыя аказаць першую медыцынскую дапамогу, а таксама на трасе будуць размешчаны месцы, дзе ўдзельнікі змогуць папіць вады. Сёлета захаваліся ўпадабаныя многімі конкурсы на найлепшы касцюм і плакат, а таксама з'явяцца новыя «фішкі». Арганізатары адзначаюць, што ў час правядзення паўмарафону будуць арганізаваны і дзіцячыя забегі на асобнай тэрыторыі.

Афіцыйна рэгістрацыя на Мінскі паўмарафон адкрыта да 13—14 верасня, але закрыцца яна можа і ў канцы жніўня, таму што на кожную дыстанцыю ёсць ліміт удзельнікаў, які не можа быць перавышаны.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

## СПЕЦНАЗ БЯРЭ «ЗОЛАТА»

**Працягваюць паступаць добрыя весткі з Армейскіх гульняў — 2019. Гэтым разам лепшымі сталі нашы спецназаўцы. Конкурс «Палярная зорка» праходзіў на палігоне пад Брэстам.**

— Аўторак і серада сталі самымі дынамічнымі днямі спаборніцтваў, — паведамілі ў прэс-службе Міністэрства абароны. — Удзельнікі конкурсу выканалі практыкаванні, назвы якіх кажуць самі за сябе: «Рух па азімуце», «Пераадоленне замініраванага ўчастка мясцовасці», «Стрэльбы ў складзе групы спецыяльнага прызначэння ноччу» і «Налёт». Таксама былі адпрацаваны адыход пасля выканання задачы і эвакуацыя групы спецыяльнага прызначэння.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

## КУРСАНТКА АЎТАШКОЛЫ ЎКРАЛА МАШЫНУ

**Здарэнне адбылося ў Іванаўскім раёне: 19-гадовая дзяўчына сагнала аўтамабіль свайго аднавяскоўца.**

У дзяжурную часць райаддзела міліцыі звярнуўся жыхар вёскі Ляскавічы, які заявіў аб прапажы «Аўдзі 100». Увечары ён пакінуў машыну ў двары, а раніцай выявіў, што яна стаіць уздоўж праезнай часткі. Супрацоўнікі крымінальнага вышуку ўстанавілі, што згон здзейсніла 19-гадовая аднавяскоўка пацярпелага.

Каля дзвюх гадзін ночы ўвагу дзяўчыны прыцягнуў легкавік у двары. Вырашыўшы адпрацаваць навыкі ваджэння (яна вучыцца ў аўташколе ў Кобрыне), з дапамогай адвёрткі адчыніла вадзіцельскія дзверы, завяла рухавік і паехала катацца. Раніцай паспрабавала вярнуць транспартны сродак на месца, але гэта ёй не ўдалося, таму давялося кінуць іншамарку каля дарогі. За выкраданне транспартнага сродку заведзена крымінальная справа, дзяўчына затрымана. Ва УУС Брэсцкага аблвыканкама паведамілі, што аналагічны выпадак згону адбыўся ў гэтай вёсцы ў пачатку мая.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**


Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении электронных торгов**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Гомельлён», г. Гомель, ул. Советская, 126 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46 |
| **Адрес ЭТП** | www.ipmtorgi.by |

**Предмет торгов**

| Наименование | Инвентарный номер | Общая площадь кв. м | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Административный корпус** | 311/С-32766 | 163,7 | **9 020,96** |

| | |
|---|---|
| **Место нахождения:** | Гомельская обл., Добрушский р-н, Тереховский с/с, г. п. Тереховка, пр-д Луговой, 1 |

**Сведения о земельном участке:** участок общей площадью **0,1790 га**, предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания производства и размещения объектов промышленности

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на счет BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, получатель платежа — ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15 (пятнадцать)** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Дата и время проведения аукциона: 18.09.2019** в 11.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

**Дата и время окончания приема документов: 16.09.2019** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

**Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**


Надвор'е

# ДАЖДЖЫ СКОНЧЫЛІСЯ!

**Актыўныя атмасферныя франты шчодра палівалі Беларусь дажджамі ў аўторак і сераду. А месцамі ападкаў быў проста перабор. Па звестках спецыялістаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды, у Івацэвіцкім раёне за двое сутак выпаў 101 міліметр ападкаў. Гэта больш чым паўтары месячныя нормы!**

Але сінаптычная абстаноўка нарэшце пайшла на паляпшэнне. У пятніцу і суботу ўплыў атмасферных франтоў захаваецца толькі ў Гомельскай вобласці. Ды і тое кароткачасовыя дажджы пройдуць месцамі. Раніцай у асобных раёнах згусціцца невялікі туман. Тэмпература паветра чакаецца камфортная — ад 10 да 15 цяпла ўначы і ад 18 да 24 — удзень. Прычым у суботу па Брэсцкай вобласці слупкі тэрмометраў падымуцца да 26 градусаў.

У нядзелю тэмпературны разброс павялічыцца. Калі ўначы будзе халадней — ад 7 да 14 са знакам «плюс», то ўдзень сонца прагрэе паветра да 20—26 цяпла. Брэсцкая вобласць адзначыцца знтоў: там месцамі можа быць і плюс 28. А вось невялікія дожджыкі чакаюцца толькі ў асобных раёнах.

Па папярэдніх прагнозах, сапраўднае летняе цяпло вернецца ў панядзелак. Чакаецца ад 23 да 29 са знакам «плюс». Але ці надоўга?

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

Падрабязнасці

# ТРАГЕДЫЯ Ў ГРУЗІІ

## У гарах Сванецыі пацярпела грамадзянка Беларусі, дзве беларускі загінулі

**У прэс-службе Агенцтва па кіраванні надзвычайнымі сітуацыямі МУС Грузіі «Звяздзе» паведамілі, што па дапамогу ратавальнікаў 14 жніўня ўвечары звярнуўся турыст з групы, якая падымалася на гару Тэтнулдзі ў рэгіёне Сванецыя. Ён паведаміў, што пры спуску тры жанчыны зніклі.**



Пошукі працягваліся ўсю ноч, учора раніцай да аперацыі далучыўся верталёт пагранічнай службы. У выніку былі знойдзены целы дзвюх жанчын, трэцяя ў цяжкім стане дастаўлена ў цэнтральную бальніцу горада Месціа, што за 20 кіламетраў ад месца здарэння.

**Саветнік Пасольства Беларусі ў Грузіі Алег ГАРОХАВІК** праінфармаваў карэспандэнта, што жанчына атрымала чэрапна-мазгавую траўму і пераломы. Пасля медыцынскага абследавання, якое доўжылася ўвесь дзень, лячэнне павінна працягнуцца ў Тбілісі.

«МУС Грузіі заведзена крымінальная справа. Да завяршэння расследавання целы загінулых жанчын будуць заставацца ў Грузіі», — сказалі «Звяздзе» ў Міністэрстве замежных спраў Беларусі.

Беларуска, якая пацярпела ў Сванецыі, — жыхарка Брэста 1967 года нараджэння. Па месцы работы яе мужа (яны разам знаходзіліся ў горным паходзе) пацвердзілі, што сужэнцы шмат гадоў займаюцца аматарскім альпінізмам. У Грузію Сяргей і Алена С. накіраваліся падчас водпуску мужа. Жонка — хатняя гаспадыня.

Як паведаміў "Звяздзе" **старшыня брэсцкага горнатурыстычнага клуба «Цытадэль» Сяргей ПАЎЛАВЕЦ**, Сяргей і Алена С. сапраўды дзесяцігоддзямі займаліся альпінізмам. «Гэта не навічкі», — падкрэсліў ён. Ён ведае іх асабіста і сказаў, што гэтую сямейную пару можна назваць ветэранамі клуба, які аб'ядноўвае ў асноўным студэнтаў і дзе менавіта маладыя людзі з'яўляюцца актыўнымі членамі. Клуб, тым не менш, ужо адзначыў сваё 45-годдзе. Каментаваць здарэнне ў Грузіі Сяргей Паўлавец адмовіўся з-за недахопу на момант падрыхтоўкі публікацыі дакладнай інфармацыі.

Гара Тэтнульд (ці Тэтнульдзі) лічыцца адной з самых прыгожых у Сванецыі. Гэта 10-я па вышыні вяршыня Каўказа. Па інфармацыі спецыялізаваных крыніц, зрыў удзельніка ў нязручным месцы можа паставіць пад пагрозу гібелі цэлую групу. Для праходжання альпінісцкага маршруту ў сярэднім патрабуецца 12—15 гадзін.

**Варвара МАРОЗАВА.**

# Бяспечныя, хуткія і эфектыўныя




## Унікальныя метады

— Няма такіх кірункаў лячэння ў афтальмалогіі, якія не ажыццяўляюцца ў Беларусі, — кажа Тацццяна Імшанецкая.

Штогод у нас робіцца амаль 50 тысяч мікрахірургічных афтальмалагічных аперацый і больш за 2,5 тысячы высокатэхналагічных умяшанняў. У тым ліку ў Рэспубліканскім афтальмалагічным цэнтры выконваецца больш за сем тысяч мікрахірургічных аперацый і амаль паўтысячы — высокатэхналагічных. Акрамя таго, штогод у Беларусі выконваецца 50 тысяч лазерных умяшанняў на органах зроку, каля 18 тысяч з іх, паводле слоў **загадчыка аддзялення лазернай мікрахірургіі Рэспубліканскага афтальмалагічнага цэнтра Ігара ЗАБАРОЎСКАГА,** — у яго аддзяленні, дзе працуе 10 дактароў. У асноўным гэта аперацыі пры катаракце, глаўкоме і разрыве сятчаткі. Дарэчы, лазерным афтальмалагічным абсталяваннем аснашчаны ўсе абласныя клінікі.


Прафесар Тацццяна ІМШАНЕЦКАЯ.

У гэты пералік не ўключаны аперацыі па лазернай карэкцыі зроку. Штогод каля трох-чатырох тысяч пацыентаў выпраўляюць такім чынам блізарукасць у прыватных медыцынскіх цэнтрах, каля адной тысячы — у дзяржаўных клініках.

— Мы засяроджаны на больш складаных захворваннях. У нас рэспубліканскі ўзровень аказання дапамогі і ўнікальнае абсталяванне, якое дазваляе рабіць аперацыі пры анамаліях рэфракцыі. Мы спецыялізуемся на лазернай карэкцыі з перасадкай рагавіцы пасля апёкаў і траўмаў. Лазерную карэкцыю выкарыстоўваем і пры лячэнні кератаконуса (дэгенератыўнае захворванне вачэй, пры якім рагавіца станчаецца і прымае канічную форму замест сферычнай — «Зв.»), — кажа **дацэнт кафедры афтальмалогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, урач-афтальмолаг вышэйшай катэгорыі, кандыдат медыцынскіх навук Дзмітрый АБЕЛЬСКІ.**

Асвоілі ў клініцы і яшчэ адзін унікальны метад — суперселектыўную інтраартэрыяльную хіміятэрапію для лячэння раку — рэцынабластомы. Яе выкарыстоўваюць пакуль усяго ў некалькіх клініках Еўропы — у Германіі, Швейцарыі і Францыі. Беларусь стала чацвёртай краінай, дзе асвоілі гэты метад. Ён прадугледжвае ўвядзенне хіміяпрэпарату ў вочную артэрыю. У Беларусі такім чынам ужо вылечылі 15 дзяцей.

## Пацыенты з Расіі, Украіны і... Блізкага Усходу

Менавіта па ўнікальныя аперацыі едуць у Беларусь і замежнікі. Гэта і лазерная мікрахірургія, і перасадка рагавіцы, і лячэнне глаўкомы. Каля 100 тысяч долараў заплацілі замежныя грамадзяне за медыцынскія афтальмалагічныя паслугі летась. Прыязджаюць у асноўным з Расіі, Украіны і краін Бліжняга Усходу — Лівіі, Сірыі, Судана, Ірака. Па лазерную карэкцыю звяртаюцца грамадзяне Германіі і Вялікабрытаніі.

— Некаторыя пацыенты неаднаразова і часам няўдала апераваліся ў розных краінах — Расіі, Лівіі, Тунісе, — і яны псіхалагічна настроены захаваць тое, што ёсць. Прынцып нашай работы — нікому не адмаўляць, — прызнаецца Дзмітрый Абельскі.

Перасадка рагавіцы абыходзіцца замежніку ў суму ад дзвюх тысяч рублёў, з выкарыстаннем фемтасекунднага лазера — каля 4900 рублёў, лазерная карэкцыя — каля 1600—2200 рублёў. Дарэчы, лазерная карэкцыя для беларусаў не нашмат таннейшая — ад 1500 да 1800 рублёў.

— У Маскве лазерная карэкцыя зроку каштуе 1,5 тысячы долараў на адно вока. За гэтыя грошы ў Беларусі можна зрабіць аперацыю на два вокі, і яшчэ застанецца грошы на праезд, — кажуць спецыялісты.


Загадчык аддзялення Ігар ЗАБАРОЎСКІ.

Але замежнікаў прыцягвае не толькі кошт медыцынскіх паслуг, але і іх якасць, якая адпавядае сусветным стандартам.

Лячэнне катаракты, а гэта аперацыя па замене памутнелага хрусталіка, каштуе каля 800 беларускіх рублёў (без уліку цаны хрусталіка). Кошт хрусталіка можа даходзіць да 1,5 тысячы долараў. Але для беларусаў пераважная большасць аперацый, у тым ліку лячэнне катаракты, — бясплатныя. Пры гэтым прапануюць або бясплатны хрусталік беларускай вытворчасці, або платны імпартны. У 30 % выпадкаў пацыенты выбіраюць беларускі.

— У нас кожны, у каго ёсць паказанні да аперацыі, можа разлічваць на бясплатнае лячэнне самымі сучаснымі метадамі. Гэта бясшоўная хірургія — аперацыя доўжыцца каля 10 хвілін, калі выпадак няўскладнены, — адзначае Дзмітрый Абельскі.

## Узрост — не перашкода лячэнню катаракты

Штогод у Беларусі робіцца каля 25 тысяч аперацый з прычыны катаракты. Гэта масавая хвароба пажылых людзей. І сёння сучасныя тэхналогіі дазваляюць апераваць у любым узросце: пацыенты звяртаюцца ў 90—95 гадоў і нават у 100.

— Наш хірург апераваў 77-гадовую пацыентку, паставіў самы просты хрусталік. А праз 15 гадоў яна прыйшла і папрасіла замяніць хрусталік на больш сучасны, — прыводзіць прыклад урач.

Пры гэтым чэргаў для беларускіх пацыентаў няма.

— Калі паталогія патрабуе неадкладнага ўмяшання — пацыент звяртаецца з адслойкай сятчаткі, перфарацыяй рагавіцы, — то чаргі не існуе, дапамога аказваецца адразу, — кажа Тацццяна Імшанецкая. — З планавымі аперацыямі накшталт той жа глаўкомы даводзіцца крыху пачакаць.

## Пры глаўкоме — 5-хвілінная аперацыя

Глаўкома, дарэчы, яшчэ адно распаўсюджанае захворванне. На дыспансерным уліку ў Беларусі з ім стаіць больш за 90 тысяч пацыентаў, трэць з іх — у сталіцы. Пры гэтай хваробе павышаны ўнутрывочны ціск, што вядзе да паступовага зніжэння вастрыні зроку і атрафіі зрокавага нерва, што ў рэшце рэшт заканчваецца слепатой. Вельмі важна выявіць гэта захворванне на раннім этапе, бо зрок удаецца захаваць на той стадыі, з якой пацыент звярнуўся да ўрача, — палепшыць яго, на жаль, немагчыма. У Беларусі з тэрмінальнай стадыяй глаўкомы, калі ў пацыента ўжо адсутнічае перыферычны зрок, выяўляецца 0,4 % хворых. У астатніх выпадках дыягнаставаць хваробу ўдаецца своечасова.


Дзмітрый АБЕЛЬСКІ робіць здымак вочнага дна.

Каварства глаўкомы ў тым, што на пачатковых стадыях яна не мае асаблівых сімптомаў — у адрозненне ад катаракты, калі пацыент бачыць заслону перад вачыма, ці адслаення сятчаткі, калі перад вачамі з'яўляюцца «маланкі».

— Пры глаўкоме доўгі час цэнтральны зрок захоўваецца, а вось перыферычны паступова траціцца. І людзі гэта рэдка заўважаюць самі, — тлумачыць Дзмітрый Абельскі.

Таму ўсе паліклінікі аснашчаны неабходным абсталяваннем для кантролю ўнутрывочнага ціску і падчас дыспансерызацыі праводзіцца скрынінг. Пры падазрэнні на глаўкому пацыента накіроўваюць на больш глыбокае абследаванне. Лячэнне пачынаецца з кропель. Але ёсць і метады лазернай хірургіі. Аперацыя займае 5—10 хвілін, пацыенту няма неабходнасці знаходзіцца ў стацыянары. І ён пазбаўляецца ад неабходнасці выкарыстоўваць кроплі калі не цалкам, то часткова.

## З траўмамі — у кабінет неадкладнай дапамогі

Адзіны ў сталіцы кабінет кругласутачнай неадкладнай дапамогі таксама знаходзіцца ў Рэспубліканскім афтальмалагічным цэнтры. Штосуткі сюды звяртаецца да 150 чалавек — як самастойна, так і па накіраванні паліклінік. Пераважна — з вострымі станамі. Тут праводзяць дыягностыку і аказваюць неадкладную дапамогу, напрыклад выдаляюць іншароднае цела.

— Вялікі наплыў пацыентаў у нас, як правіла, у пачатку тыдня, калі людзі вяртаюцца з дачы. Тры дні ці тыдзень цярпелі, а калі цярпець стала немагчыма, звяртаюцца да нас, — расказвае **Уладзімір РУБІС, загадчык аддзялення мікрахірургіі вока № 2.** — Сёння дачнікі маюць добрае аснашчэнне — пілы, балгаркі. Здымаюць з іх ахову, бо так зручней працаваць, і траўміруюцца. Дастаўляюць да нас людзей і з вытворчымі траўмамі, але апошнім часам іх стала істотна менш.

**Алена КРАВЕЦ.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

### Каб захаваць зрок

**Захаваць зрок дапамагаюць элементарныя правілы здаровага ладу жыцця і гігіены працы. Большасць пацыентаў афтальмалагаў — людзі з вялікай зрокавай нагрузкай. Таму варта правільна арганізаваць сваё рабочае месца. Камп'ютарны манітор павінен стаяць строга насупраць вачэй, каб не даводзілася паднімаць ці апускаць галаву. Седзячы за маніторам, мы забываем часта міргаць, слізістая вока перасыхае. Таму рэкамендуецца выкарыстоўваць кроплі — замяняльнікі слязы. Важна падтрымліваць і водны баланс. Правільнае харчаванне таксама дапаможа захаваць зрок. Морква і чарніцы, а таксама біялагічна актыўныя дабаўкі з імі дапамогуць вачам спраўляцца з нагрузкай.**




# «АДДАЙ МАЁ СЭРЦА!»

Гадамі чытаў я звяздоўскія «праўдзівыя гісторыі» і ўсё чакаў, што нехта напіша маю (ці хоць трохі падобную), але ж потым зразумеў, што расказаць яе магу толькі сам.

У школе я вучыўся добра, у інстытут паступаў смела. На пяцёркі (найвышэйшы бал, ніякіх ЦТ тады не было) здаў тры экзамены. Пра чацвёрты сорамна ўспамінаць дагэтуль, бо выцягнуў, помню, білет, падрыхтаваўся, досыць бойка адказваў... «Добра, малады чалавек, — спыніў экзаменатар (дзве жанчыны побач з ім шапталіся пра нешта сваё). — А вось скажыце мне...»

Я не баяўся дадатковых пытанняў, але адказ на першае пачаў з фразы: «Я не ўпэўнены...», пасля чаго вочы ў экзаменатара неяк дзіўна загарэліся. Ён спытаў нешта яшчэ... І яшчэ. «Падзавёўся» і я, праўда, свае адказы пачынаў часам з той жа фразы...

Пачуўшы яе ці не ў трэці раз, экзаменатар сказаў, што чалавек, не ўпэўнены ў сваім веданні прадмета, павінен сядзець на печы, а не ехаць вучыцца, і «ўляпіў» мне... трояк.

Сказаць, што я пакрыўдзіўся, — значыць прамаўчаць! Я пажадаў выкладчыку (вядома ж, не ўголас), каб ён падавіўся сваёю пыхай ды «глыбокім веданнем прадмета» ды паехаў да дзядзькі. Ён у мяне працаваў прарабам на будоўлі, абяцаў, калі не паступлю, узяць вучнем да плітачніка. Буду, маўляў, зарабляць ды яшчэ і халтурыць (ну там некаму кватэру да ладу давесці ці катэдж...), стаяць у чарзе на жыллё, жыць у інтэрнаце і мазгі не парыць.

З апошнім я, вядома ж, не згадзіўся (і налета паступіў такі на завочнае), а тады і праўда быў... рады, што так атрымалася, бо па суботах у нашым інтэрнаце праводзілі дыскатэкі, на іх прыходзілі дзяўчаты, і сярод іх я бачыў толькі адну. Яна была незвычайная: фігурка — як статуэтка, нідзе нічога лішняга, валасы — ні доўгія ні кароткія, ні светлыя ні цёмныя, а галоўнае — на твары ў яе амаль заўсёды блукала цёплая ўсмешка, ад чаго здавалася, што яна рада і гэтай музыцы, і сяброўкам, з якімі прыйшла, і хлопцам, што болей стаяць ля сцен.

Я быў трохі не такі: я запрасіў дзяўчыну на танец і даведаўся, што завуць яе Наташай, што жыве тут непадалёк, што працуе ў магазіне. Я хацеў распытаць пра ўсё падрабязней, праводзіць яе дадому, прызначыць спатканні, вадзіць у кіно, абдымаць...

Усё, напэўна, так і атрымалася б, але мне зноў не хапала смеласці: я ўсё адкладваў на потым. І напэўна б не прагадаў, калі б...

У нашым інтэрнаце жыў хлопец з Грузіі, які на адной з дыскатэк пазнаёміўся з нашай дзяўчынай, закахаўся, паклікаў замуж, і яна згадзілася выйсці. З гэтай прычыны Гогі з сябрамі прывалаклі тры скрыні з шампанскім і вінаградам, сталі частаваць усіх...

Я па-ранейшаму бачыў толькі Наташу: вось ёй працягнулі шклянку, налілі трохі віна, яна ўсміхнулася і падзякавала, прыгубіла, закрыла вусны рукамі... Апусціла галаву, пайшла... прэч.

Па тым, як уздрыгвалі плечы, я зразумеў, што ў дзяўчыны (справа жыццёвая, як казаў Карлсан) пачалася банальная ікаўка. У нас у такіх вось выпадках смехам казалі: «Аддай маё сэрца!» — і рэзка ўздымалі руку, каб нібыта забраць. Гэта злёгку палохала і дапамагала...

Карацей, я рушыў услед за Наташай.

Бачыў, што яна прайшла ў канец цемнаватага калідора, спынілася пад адчыненай форткай. Я наблізіўся, хацеў сказаць, нават узняў руку... І не вытрымаў — прыгарнуў яе да грудзей і пацалаваў.

Дагэтуль помню смак яе вуснаў...

І гучную аплявуху...

А следам — стук абцасаў...

З хвіліну стаяў не раўнуючы як той слуп, а калі прыйшоў да памяці, дзяўчыны і след прастыў: не было яе ні на прыпынку аўтобуса, ні ў бліжэйшых дварах, ні на дыскатэцы... Я аббегаў усё.

Заставалася кропля надзеі на яе сябровак, аднак, пакуль я мітусіўся, усё шампанскае было выпіта, народ разышоўся.

Спадзяваўся, што зноў сыдзецца ў чарговую суботу, што Наташа ці хоць нехта з яе дзяўчат з'явіцца на танцах, але...

Недзе з паўгода я тупа хадзіў па навакольных дварах (яна ж казала, што жыве блізка!).

І ў крамах Наташ было шмат, але ўсе не мае.

Тую, сваю, я шукаў і не знаходзіў.

Ажаніўся, адвучыўся, выгадаваў сыноў. Але, бываючы ў Мінску, усё роўна гляджу па баках: раптам сустрэну, раптам пазнаю Наташу. Скажу тады...

Мне вельмі шмат ёй трэба сказаць. І — абавязкова — вось гэта: «Аддай маё сэрца!»

**Андрэй В.**

*Барысаўскі раён.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЯШЧЭ РАЗ ПРА КАХАННЕ...

Гэту гісторыю мне расказаў адзін са сталых вяскоўцаў. Некалі ў маладосці ён працаваў у райцэнтры. Там жа сустракаўся з дзяўчынай. Яна была крыху старэйшая за яго, што кавалера зусім не бянтэжыла: ён любіў, можа, нават кахаў і хацеў пазнаёміцца з яе бацькамі.

...Пакуль збіраўся і дабіраўся да досыць далёкай вёскі, вядома ж, хваляваўся. Аднак там, на канцавым прыпынку аўтобуса, яго сустрэла каханая, узяла пад руку, павяла дахаты.

Удваіх яны зайшлі на падворак. Бацькі (будучы цесць і цешча, як думаў жаніх) сустракалі на ганку. Прывіталіся. Гаспадар адразу ж агаломшыў пытаннем:

— У войску быў?

— Быў, — трохі збянтэжыўся хлопец.

— У якіх войсках?

— У будбаце, — ляпнуў першае, што прыйшло ў галаву.

— Ну тады, калі ласка, у хату.

Жаніх зайшоў першы. Убачыў, што ўсё там як мае быць: на пакуці, пад вышыванымі ручнікамі, абразы, на ложках — горы падушак, на падлозе — саматканыя дываны, а ўжо на стале... Адчувалася, што ў хаце жыве прыстойная сям'я, працавітыя людзі. Што ні кажы, а добра з такімі і за работай, і за сталом...

Выпілі за ім па першай, выпілі па другой, а размова неяк не клеіцца, бо гаспадар усё зводзіць яе да службы ў войску, а значыць, госцю трэба ўвесь час выбіраць, альбо хлусіць далей, альбо ўсё ж прызнавацца.

Гэта (і пакуль не позна) здалося яму лягчэйшым. Сказаў:

— Вінаваты я... Схлусіў вам. Не быў я ў салдатах: бацькі мае блат знайшлі, з некім дагаварыліся... Прабачце!

Аднак гаспадар нават не падумаў: ён скрывіўся, як журавін праглынуў, устаў з-за стала і строга прамовіў:

— Той, хто не служыў у войску, маёй дачцэ не пара, не жаніх! Так што, хлопча, вунь бог, а вунь парог. Бывай здаровы!

Пачуць нешта падобнае госць, ну вядома ж, не разлічваў: як з ланцуга сарваўшыся выскачыў з хаты, рвануў дадому, прычым не на аўтобусе (калі ён там будзе?), а пехатою...

У хуткім часе, як далажыла «разведка», тая дзяўчына выйшла замуж (людзі казалі — за былога дэсантніка).

Што кавалер? Ён таксама ажаніўся, праўда, праз гады, ужо сталым халасцяком.

...Што цікава, адбывалася гэта гісторыя, як быццам, нядаўна: калі дзяўчаты яшчэ слухаліся сваіх бацькоў, а тыя за вялікі гонар лічылі службу хлопцаў у войску.

**Генадзь Мішчук,**

*в. Вотчына, Маларыцкі раён.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

***АД ЯЕ Ж. Зачапіла, што называецца, першая фраза з не апошняй, дай бог, гісторыі пра сэрца: «Усё чакаў, што нехта напіша маю (ці хоць трохі падобную) гісторыю, але ж потым зразумеў, што расказаць яе магу толькі сам...»***

***Што праўда, тое праўда. А таму конкурс на найлепшую вясёлую ці праўдзівую працягваецца. Да ўдзелу ў ім запрашаюцца ўсе. Адзінае: дасылаючы свае гісторыі, калі ласка, не забывайцеся паведамляць нумар тэлефона для аператыўнай зваротнай сувязі.***

## Неасабісты суб'ектыў



# Дзе самае зыркае сонца

## Як мы хадзілі ў грыбы. Але зусім не пра іх

УБАЧЫЎШЫ, што каля «Каменнай Горкі» поўным ходам прадаюць грыбы — лісічкі ды падасінавікі (за пяцілітровае вядзерца лісічак дзядзька з-пад Ракава прасіў дваццаць пяць рублёў), вырашыла на выхадныя абавязкова схадзіць у сваё адмысловае «лісічкавае» месца. Памятаеце, як у Панчанкі: «У кожнага быць павінна // Свая баравіна, // Дзе трымаюць на зялёных руках // Сосны // Самае зыркае сонца». Вось гэта самая баравіна кіламетры за тры з паловай ад вёскі і кліча кожны год улетку да сябе, цягне, бы магнітам. І зусім няважна, ці знойдзеш ты там які грыб, — галоўнае туды прыйсці. Гэткі своеасаблівы рытуал, выконваць які трэба кожны год, інакш... Што будзе, калі не выканаеш, я шчыра кажучы, не ведаю, бо ніводнае лета дагэтуль без яго не абыходзілася. Вось і сёлета — і дождж толькі скончыўся, і стамілася пасля напружанага тыдня, а ў грыбы пайсці ўсё роўна аж карцела. Яшчэ і сястру падахвоціла, бо адной у далёкі лес ісці трохі вусцішна. Каб яшчэ сабака быў — іншая справа. Але наш белы маленькі кундаль Джым, заўсёдны спадарожнік маіх лясных паходаў, пражыўшы шчаслівых сытых сямнаццаць сабачых гадоў, сышоў, пэўна, у свой сабачы рай, а новага мы, праз колькі часу ператварыўшыся з вяскоўцаў у прыезджых дачнікаў, заводзіць ужо не сталі.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по месту нахождения общества (Минский район, аг. Вишневка, ул. Центральная, д. 1А) с 8.00 до17.00 с 19 по 27 августа 2019 года.

УНП 600041880

**Ранее считавшимися утерянные страховые полисы по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств ОСГО ВТС серии ВВ6431860, страхование от болезней и несчастных случаев во время поездки за границу серии БА0213917 страховой компании «Промтрансинвест» считать действительными.**

**Утерянные бланки полисов формы 2РН серии КЕн № 0046917-0046921 Закрытого акционерного страхового общества «КЕНТАВР» считать недействительными. УНП 100985903**

# Усходні гараскоп на наступны тыдзень

**АВЕН.** Будзеце адкрываць у сабе ўсе новыя таленты, знаходзячыся на піку формы і працаздольнасці. Нечаканае заступніцтва ўплывовых людзей дазволіць дамагчыся поспеху ў прафесійнай сферы, што значна павысіць ваш аўтарытэт сярод калег і дзелавых партнёраў. У чацвер давядзецца вылучыць час для завяршэння сямейных спраў, якія адкладаліся да апошняга моманту.

**ЦЯЛЕЦ.** Мінімальныя намаганні на гэтым тыдні будуць даваць максімум выніку. А вось залішняя мітусня і празмерная стараннасць ні да чаго добрага не прывядуць. Сцеражыцеся жадаць камусьці зла, хай і цалкам заслужана, бо ваша жаданне можа матэрыялізавацца. Калі ў панядзелак хуткасць рэалізацыі планаў будзе блізкая да звышгукавой, то ўжо да сярэдзіны тыдня яна рэзка ўпадзе, і справы будуць ледзь цягнуцца.

**БЛІЗНЯТЫ.** Трэба верыць у поспех і ажыццяўленне сваёй мары. Спакойна, але цвёрда ідзіце да мэты, і атрымаеце жаданае, прычым вельмі хутка. У сярэдзіне тыдня зможаце даказаць наваколным, што вы незаменны спецыяліст. У чацвер чакаюцца прыемныя падзеі ў асабістым жыцці, якія дададуць упэўненасці ў тым, што вас любяць. Паездкі і падарожжы ў нядзелю будуць удалыя.

**РАК.** Выбраўшы правільную стратэгію і прыклаўшы намаганні, вы дабяряцеся-такі да лаўровага вянка. А калі будзеце ленавацца, то дастанецца толькі лазневы венік. Так што выбірайце самі. У аўторак важная інфармацыя, нібы залатая рыбка, сама прыплыве ў рукі і дапаможа ў вырашэнні прафесійных і асабістых праблем. На нядзелю лепш не будаваць грандыёзных планаў.

**ЛЕЎ.** Спрыяльны час для перамен. Не варта заставацца на дакучлівай рабоце і з нецікавымі вам людзьмі толькі па звычцы. Стаўце перад сабой вялікія мэты. І адчуеце падтрымку ва ўсіх сваіх пачынаннях. Чакаюцца пазітыўныя перамены ў асабістым жыцці. Для таго каб прыняць канчатковае рашэнне ў выхадныя, можа спатрэбіцца сяброўская парада.

**ДЗЕВА.** Магчыма, час разгрузіць свае плечы ад чужых праблем? Тут жа з'явіцца час заняцца сваімі ўласнымі. У аўторак лепш не трапляйцеся на вочы начальству, яно можа аказацца не ў найлепшым настроі. У чацвер калегі па рабоце будуць звяртацца да вас у пошуках справядлівасці, паспрабуйце не падмануць іх чаканняў. У выхадныя самы час сабраць гасцей і здзівіць іх кулінарнымі шэдэўрамі ўласнага прыгатавання.

**ШАЛІ.** Калі хочаце абзавесціся парай-тройкай новых station станоўчых якасцяў, скажам, павысіць працаздольнасць і стаць больш пунктуальнымі, будзе шанц гэта зрабіць. Тыдзень падорыць новых сяброў і аднадумцаў. Не выключана, што вас чакае прасоўванне па кар'ернай лесвіцы. У чацвер магчыма ажыццяўленне даўніх жаданняў.

**СКАРПІЁН.** На гэтым тыдні ў вас можа з'явіцца нагода задумацца пра сэнс жыцця. Адносіны з наваколнымі палепшацца, вам практычна на ўсім будзе спадарожнічаць гармонія. Тыдзень падыходзіць для рамантычных сустрэч, пяшчотных прызнанняў, гутарак па душах. У канцы тыдня з'явіцца шмат магчымасцяў для рэалізацыі фінансавых планаў і задум.

**СТРАЛЕЦ.** Увесь тыдзень давядзецца балансаваць паміж шматлікімі справамі і падзеямі. Важна пры гэтым не стаміцца і не зарабіць нервовы зрыў. Паспрабуйце падключыць таемныя рэзервы — вы самі ведаеце якія. У панядзелак заручыцеся падтрымкай калег па рабоце, інакш сутыкняцеся з перагрузкамі. У канцы тыдня вашай увагі запатрабуюць дом, сям'я, дача.

**КАЗЯРОГ.** Тыдзень чакаецца вельмі супярэчлівы. Перш чым прыняць канчатковае рашэнне, неабходна ўсё прадумаць і не цешыць сябе прыгожай упакоўкай прапаноў. Вашы планы могуць быць парушаныя, важна хутка паставіць новыя задачы. У аўторак паспрабуйце не лезці ў канфлікты без асаблівай патрэбы. У пятніцу сітуацыя, імаверна, кардынальна зменіцца, у гэты дзень давядзецца зрабіць выбар, ад якога могуць залежаць вашы перспектывы на найбліжэйшую будучыню.

**ВАДАЛІЎ.** Высвятляючы адносіны і адстойваючы свае правы ды незалежнасць, набярыцеся цярпення і мудрасці, пагледзіце на сябе збоку, і, магчыма, вы ўбачыце спосаб змяніць сітуацыю на сваю карысць. Важна не страціць душэўнай раўнавагі і захоўваць спакой, тады тыдзень будзе спрыяльны і плённы. У выхадныя не сядзіце дома, адпраўляйцеся ў падарожжа.

**РЫБЫ.** Добры час для творчасці і фантазіі. Выйдзіце за звыклыя рамкі, паспрабуйце штосьці новае. Вам неабходная незалежнасць ва ўсім: і ў думках, і ў справах, і ў дзеяннях, а самае галоўнае — у рашэннях. Але калі будзеце занадта бескампрамісныя, то магчымыя канфлікты на рабоце. Абараняйце і адстойвайце свае інтарэсы, але тактоўна.

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.49 | 20.38 | 14.49 |
| Віцебск — | 5.34 | 20.31 | 14.57 |
| Магілёў — | 5.39 | 20.28 | 14.49 |
| Гомель — | 5.40 | 20.20 | 14.40 |
| Гродна — | 6.04 | 20.52 | 14.48 |
| Брэст — | 6.10 | 20.48 | 14.38 |

## Месяц

*Поўня 15 жніўня.*
*Месяц у сузор'і Рыб.*

## Імяніны

**Пр.** *Аляксандра, Гурыя, Дзмітрыя.*
**К.** *Максіміляна, Яўсея.*



Фота Ліны МАЛІНІНАЙ.

# ЗАЎТРА




## Даты / Падзеі / Людзі

### 16 ЖНІЎНЯ

**У краіне**

**1159** год — 860 гадоў з часу апублікавання ў Іпацьеўскім летапісе першых звестак пра горад Чачэрск (летапісны *Чичерск*). Горад паўстаў у X стагоддзі, пра што сведчаць вынікі археалагічных раскопак. У XII—XIII стагоддзях уваходзіў у Чарнігаўскае княства. З сярэдзіны XIV стагоддзя ў Вялікім Княстве Літоўскім, цэнтр воласці, з 1501 года — уладанне Алены Іванаўны, жонкі вялікага князя Аляксандра, з 1621-га — Сапегаў. З 1510 года таксама цэнтр Чачэрскага староства, меў правы гарадскога самакіравання.

**1911** год — нарадзіўся (вёска Хветкавічы, цяпер у Жабінкаўскім раёне) Андрэй Аляксеевіч Трафімук, вядомы савецкі геолаг. Акадэмік АН СССР. Герой Сацыялістычнай Працы. Аўтар больш як 1100 навуковых прац па праблемах фарміравання радовішчаў нафты і газу, павышэння эфектыўнасці пошуку нафты і газаздабычы. Унёс значны ўклад у падрыхтоўку савецкіх навуковых кадраў геолагаў-нафтавікоў. Двойчы лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, Дзяржаўнай прэміі Расійскай Федэрацыі. Памёр у 1999 годзе.

**1933** год — нарадзіўся Віталь Паўлавіч Чацверыкоў, кінарэжысёр, народны артыст Беларусі. Працаваў на кінастудыі «Беларусьфільм», дзе стварыў каля 20 мастацкіх і дакументальных фільмаў. Сярод іх: «Руіны страляюць...», «Полымя», «Чорная бяроза» і іншыя. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі. Памёр у 1983 годзе.

**1956** год — у Мінску быў утвораны Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа (адкрыты 4 снежня 1959 года).

**У свеце**

**1905** год — дзень нараджэння (Украіна) Марыі Васілеўны Акцябрскай, Героя Савецкага Саюза. У Вялікую Айчынную вайну пасля гібелі мужа — камісара стралковай дывізіі І. Ф. Акцябрскага звярнулася да наркама абароны з просьбай аб асабістым зберажэнні пабудаваць танк і на ім змагацца з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У Чырвонай Арміі з 1943 года, скончыла курсы механікаў-вадзіцеляў танка. 20 лістапада 1943-га



у баі за в. Новае Сяло (Сенненскі раён) экіпаж Акцябрскай у ліку першых уварваўся на пазіцыі праціўніка. Параненая Марыя Акцябрская на падбітым танку трое сутак знаходзілася пад варожым агнём, але, адрамантаваўшы машыну, вярнулася ў свой батальён. У баі за в. Крынкі (Лёзненскі раён) знішчыла дзве гарматы. У баі машына была падбітая, Акцябрская зноў цяжка параненая. Памерла ад ран у 1944 годзе.

**1941** год — праз два месяцы пасля пачатку Вялікай Айчыннай вайны быў выдадзены Загад Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандавання № 270 «Аб адказнасці ваеннаслужачых за здачу ў палон і пакіданне ворагу зброі», згодна з якім усе савецкія салдаты і афіцэры, якія здаліся ў палон па ўласнай волі, а таксама тыя, хто быў захоплены ў палон пры абставінах, якія ад іх не залежалі, аб'яўляліся здраднікамі Радзімы. На падставе гэтага загада, у прыватнасці, былі распачатыя крымінальныя справы супраць генералаў Уладзіміра Качалава, Паўла Панядзеліна і Мікалая Кірылава, якія трапілі ў палон да фашыстаў і якія абвінавачаліся ў здрадзе Радзіме. Усе яны завочна былі прысуджаныя да расстрэлу. Разам з тым, знаходзячыся ў палоне, гэтыя генералы паводзілі сябе мужна і патрыятычна. Пасля вайны, вызваленыя заходнімі саюзнікамі, добраахвотна вярнуліся на Радзіму, дзе іх адразу арыштавалі. У 1950 годзе на падставе таго ж загада № 270 яны былі зноў асуджаныя і расстраляныя. Толькі пасля смерці Сталіна бязвінна пакараныя генералы былі пасмяротна рэабілітаваныя.

## УСМІХНЕМСЯ

**Кажуць, што летам раней нават купаліся...**

Вечар. Жонка кажа мужу:

— Дарагі, не хацелася б цябе засмучаць, але заняцца больш няма чым.

**Я выбіраю здаровую ежу. Таму на вячэру ў мяне сёння пяць здаровых свіных адбіўных са смажанай бульбай і здаровая такая бутэлька гарэлкі.**

Адэса, дама дыктуе суседцы рэцэпт пірага:

— Так, Роза, пішы: узяць чатыры яйкі...

— Ага, значыць, пішу — два...

— Роза, пішы чатыры! У рэцэпце восем было!

**Правільна казаць не «лянівы чалавек», а «чалавек з абмежаваным жаданнем працаваць».**




caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 2792.

Нумар падпісаны ў 19.30 15 жніўня 2019 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

16 жніўня 2019 г. № 33 (518)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ

### Залежыць ад кожнага



Работа па дасягненні Мэт устойлівага развіцця як стыль жыцця. стар. 2

### Прафесійная прабуксоўка



Дзе губляюцца кадры для АПК і як перамагчы кадравы голад. стар. 4,13

### Хачу ў калгас! І кропка



Думаеце, так не бывае? Наш карэспандэнт гатовы пераканаць вас у адваротным. стар. 13

### Вёска ў чаканні інвестыцый



Чаму сельская мясцовасць менш прыцягальная для гандлю. стар. 14

### Жоўты, чырвоны, зялёны!..



Запрашаем на яблычны фэст у Карэліцкі раён. стар. 16

# Усё толькі пачынаецца!




Фота БелТА.

**Сёлета 1 жніўня ў бальніцы і паліклінікі краіны на свае першыя рабочыя месцы выйшла больш за 9 тысяч медыкаў. З іх 5,5 тысячы — маладыя ўрачы-спецыялісты і ўрачы-інтэрны, і больш за 3,5 тысячы — спецыялісты з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй.**

Больш за 80 % маладых спецыялістаў, паводле інфармацыі ўпраўлення кадравай палітыкі, устаноў адукацыі Міністэрства аховы здароўя, застаюцца на сваіх першых рабочых месцах. Гэтага ўдалося дасягнуць у тым ліку і дзякуючы таму, што наймальнік прыязджае на размеркаванне, запрашае студэнтаў у сваю ўстанову, паказвае, дзе спецыяліст будзе жыць і працаваць і якая ў яго будзе зарплата.

Застацца ў рэгіёнах матывуе і жыллё. Наймальнікі нярэдка прапануюць арэндныя кватэру ці дом, а не пакой ці месца ў інтэрнаце. Да таго ж, у сельскай мясцовасці больш магчымасцяў кар'ернага росту, і адпаведна атрымання вышэйшай заработнай платы.

Міністэрства аховы здароўя пастаянна кантактуе з мясцовай выканаўчай уладай, абмяркоўваючы пытанні адаптацыі маладых спецыялістаў.

ТЭМА ТЫДНЯ

# ВЯСКОВЫ МАЛАДЫ СПЕЦЫЯЛІСТ: нюансы і асаблівасці

**ПРАЙШЛО размеркаванне, на руках дыплом аб заканчэнні навучальнай установы. І хутка нядаўнія студэнты і будучыя маладыя спецыялісты выйдуць на работу. Сёлета, напрыклад, у сельгасарганізацыях краіны чакаюць 1820 выпускнікоў вышэйшых і каля 3000 выпускнікоў сярэдне-спецыяльных навучальных устаноў. Якія правы, гарантыі, прэферэнцыі ім належаць і што ўваходзіць у іх абавязкі? Пра гэта і іншае карэспандэнт даведалася ў Беларускім рэспубліканскім камітэце прафсаюза работнікаў аграпрамысловага комплексу.**

## Гарантуе дзяржава...

— Не ўсе выпускнікі — маладыя спецыялісты. У адпаведнасці з заканадаўствам, пад маладымі спецыялістамі, рабочымі, служачымі маюцца на ўвазе выпускнікі, у якіх ёсць на руках пасведчанне аб накіраванні на работу і якія працуюць на працягу абавязковага тэрміну па размеркаванні. Пры гэтым выпускніком прызнаецца асоба, якая навучалася ва ўстанове адукацыі, арганізацыі, што рэалізуе праграмы пасляВУЗаўскай адукацыі.

стар. 3

ВЫБАРЫ-2019

# Хто зойме месцы ў верхняй палаце парламента?

**Выбары членаў Савета Рэспублікі ў нашай краіне з'яўляюцца ўскоснымі — яны адбываюцца на пасяджэннях дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню кожнай вобласці і дэпутатаў Мінскага гарадскога Савета. Такія пасяджэнні адбудуцца сёлета 7 лістапада, і на іх тайным галасаваннем будуць абраныя па восем членаў Савета Рэспублікі ад кожнай вобласці і горада Мінска.**

«Да 8 кастрычніка павінна адбыцца вылучэнне кандыдатаў у члены Савета Рэспублікі, і мы паглядзім, хто гэта будзе, — расказала журналістам **старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзія ЯРМОШЫНА.** — Гэта вырашаюць дэпутаты мясцовага ўзроўню, таму я думаю, што гэта будуць людзі вельмі паспяховыя, тыя, хто сапраўды з'яўляецца тварам нацыі».



Фота БелТА.

Правы вылучэння кандыдатаў у члены Савета Рэспублікі належыць прэзідыумам мясцовых Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню і адпаведным выканаўчым камітэтам, а ў горадзе Мінску — прэзідыуму Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў і Мінскаму гарадскому выканаўчаму камітэту.

Вылучэнне кандыдатаў будзе праходзіць з 9 верасня да 8 кастрычніка ўключна. Пасля абласныя, Мінскі гарадскі выканаўчыя камітэты ў трохдзённы тэрмін прадстаўляць адпаведныя дакументы ў ЦВК. стар. 2

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



# НАТАРЫЯТ НА ПРАКТЫЦЫ

**Пастаянная камісія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве правяла ў Гомелі пашыранае выязное пасяджэнне, прысвечанае праблемам, якія ўзнікаюць падчас прымянення на практыцы закона «Аб натарыяце і натарыяльнай дзейнасці».**

Пасяджэнне прайшло на базе Гомельскай абласной натарыяльнай палаты Беларускай натарыяльнай палаты. У мерапрыемстве ўзялі ўдзел члены Савета Рэспублікі, кіраўніцтва Міністэрства юстыцыі, Беларускай натарыяльнай палаты, кіраўнік і натарыусы Гомельскай натарыяльнай акругі, прадстаўнікі мясцовых органаў улады.

«Зносіны з практыкамі на месцах дапамагаюць парламентарыям паглыбіцца ў іх праблемы і якасна сфармуляваць закон аб натарыяце», — заявіў журналістам **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Віктар ЧАЙЧЫЦ.**

Законапраект аб унясенні змяненняў у закон «Аб натарыяце і натарыяльнай дзейнасці» прыняты Палатай прадстаўнікоў у першым чытанні ў чэрвені. «Аднак яшчэ ёсць магчымасць адшліфаваць нейкія фармулёўкі, ліквідаваць магчымыя недакладнасці. Для гэтага неабходна мець зносіны з натарыусамі. Наша мэта — пачуць людзей на месцах, даведацца з першых вуснаў, з якімі пытаннямі яны сутыкаюцца на практыцы. Гэта дапаможа дакладна і якасна сфармуляваць закон, каб ён спрыяў развіццю і далейшаму ўдасканаленню дзейнасці натарыята», — растлумачыў Віктар Чайчыц.

Ён падкрэсліў, што самае галоўнае патрабаванне да законаў — каб яны былі зразумелыя людзям і выкладзены простай і даступнай мовай. «А гэта немагчыма, калі не ведаць праблемныя аспекты, якія ёсць на месцах», — адзначыў намеснік старшыні Пастаяннай камісіі.

На думку **старшыні Беларускай натарыяльнай палаты Наталлі БАРЫСЕНКІ,** у дзейнасці натарыята няма глабальных праблем, практыка напрацаваная, аднак некаторыя карэкціроўкі ў існуючы закон неабходныя. «Натарыят штодня развіваецца, павышаючы кваліфікацыю і ўдасканальваючы базу для прыёму грамадзян. Людзі прыходзяць у тэхнічна і функцыянальна абсталяваныя памяшканні. Тым самым мы гарантуем выкананне прынцыпаў натарыяльнай дзейнасці, у тым ліку захаванне натарыяльнай таямніцы, незалежнасці і бесстаронnасці», — удакладніла яна.

Пры гэтым важна ўлічваць новыя павевы і патрэбы грамадзян, а такім чынам, і неабходнасць пашырэння функцый натарыусаў. Карэкціроўка закона звязана і з некаторымі зменамі падыходаў да прававога рэгулявання, выкліканымі аўтаматызаваннем працэсаў і магчымасцяў адзінай электроннай сістэмы ўліку натарыяльных дзеянняў. Па словах Наталлі Барысенкі, сёння натарыят краіны валодае сучаснымі электроннымі сэрвісамі і рэсурсамі, якія дазваляюць вынконваць новыя задачы і функцыі.

«Вельмі важна, каб закон быў выверааны ў плане усіх нарматворчых патрабаванняў, аднaзначна прыняты ўсімі практыкамі і спрыяў рашэнню асноўнай задачы — забеспячэнню абароны правоў і законных інтарэсаў грамадзян, юрыдычных асоб і дзяржавы», — сказала яна.

На пасяджэнні разгледжаны шырокі спектр пытанняў, уключаючы дапаўненне закона паняццямі «натарыят», «натарыяльны акт» і «натарыяльны дакумент», пашырэнне кампетэнцыі натарыусаў. Адным з найважнейшых аспектаў стала таксама вывучэнне магчымасцяў электроннага натарыята ў эпоху развіцця лічбавых інфармацыйных тэхналогій. Важнасць шэрагу прапанаваных карэкціровак падкрэсліў таксама намеснік міністра юстыцыі Беларусі Мікалай Старавойтаў. Віктар Чайчыц запэўніў, што ўсе прапановы будуць пачутыя і перададзеныя на прызначэнні. У комплексе гэта дазволіць прыняць даступны і зразумелы для грамадзян закон, які не ўтрымлівае розначытанняў.

# ВЫКАЗАЛІ ЗАЎВАГІ І ПРАПАНОВЫ

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар СІРЭНКА прыняў удзел у пасяджэнні грамадскакансультатыўнага савета па турызме пры Міністэрстве спорту і турызму.**

У мерапрыемстве таксама ўдзельнічалі прадстаўнікі названага міністэрства, Нацыянальнага агенцтва па турызме, іншых міністэрстваў і арганізацый, мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, грамадскіх аб'яднанняў у сферы турызму.

На пасяджэнні быў разгледжаны падрыхтаваны Міністэрствам спорту і турызму праект закона Рэспублікі Беларусь «Аб турызме». Законапраектам прапануецца шэраг новаўвядзенняў у турыстычнай сферы: магчымасць заключэння электроннага дагавора, даванне фінансавых гарантый спажыўцам турпаслуг і іншае. Удзельнікі мерапрыемства выказалі па праекце заўвагі і прапановы, якія вызначылі кірункі яго дапрацоўкі.

Напярэдадні профільным міністэрствам былі падведзены вынікі публічнага абмеркавання праекта закона «Аб турызме» на Прававым форуме Беларусі. Акрамя гэтага, прапановы па праекце накіроўваліся непасрэдна ў адрас Міністэрства спорту і турызму з дапамогай пісьмовых і электронных зваротаў.

Сярод найбольш актуальных падчас публічнага абмеркавання праекта аказаліся пытанні размежавання адказнасці турагентаў і тураператараў (парадак вызначэння салідарнасці адказнасці згаданых суб'ектаў) і ўнясенне ў гэтай сувязі магчымых змяненняў у дагаворныя адносіны паміж суб'ектам і ўдзельнікам турыстычнай дзейнасці. Шмат дыскусій выклікала прапанова ўвядзення інстытутаў фінансавай адказнасці тураператараў (дагавор страхавання грамадзянскай адказнасці, банкаўская гарантыя, фонд персанальнай адказнасці) і актуальнасць паняццяў «турагент» і «тураператар», «турагенцкая дзейнасць» і «тураператарская дзейнасць».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**



Фота Лілі МАЛІНІНАЙ.

НАШЫ МЭТЫ

# Трываласць свету залежыць ад кожнага

**Пра гэта ў сваім выступленні перад афіцэрскім складам цэнтральнага апарату Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь казала намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Нацыянальны каардынатар па Мэтах устойлівага развіцця Мар'яна ШЧОТКІНА. Яе выступленне ў рамках дня інфармавання было прысвечана пытанням дасягнення Мэт устойлівага развіцця, паведамляе прэс-служба верхняй палаты парламента.**



Фота БелТА.

«Работа па дасягненні МУР — гэта не толькі іх непасрэдная рэалізацыя, але і ўцягненне кожнага чалавека ў гэты працэс, — падкрэсліла Мар'яна Шчоткіна. — Гэта стыль жыцця, калі людзей хвалююць пытанні экалогіі ў сваім горадзе, сваёй краіне, на ўсёй планеце ў цэлым, і яны гатовыя нешта зрабіць для яе захавання. У сувязі з гэтым вельмі важная работа з моладдзю, накіраваная на выхаванне беражлівых адносін да навакольнага асяроддзя».

Мар'яна Шчоткіна расказала пра асноўныя прынцыпы Мэт устойлівага развіцця, нацыянальную архітэктуру кіравання МУР, задачы Савета па ўстойлівым развіцці, а таксама пра маніторынг Мэт.

Нацыянальны каардынатар нагадала, што рэалізацыя МУР ідзе па чатырох асноўных кірунках — эканоміка, экалогія, сацыяльная сфера і маніторынг. Яны ўзаемазвязаныя адзін з адным. Асаблівая ўвага сёння аддаецца рабоце па дасягненні МУР на рэгіянальным узроўні. Гаворка ідзе пра тое, каб распрацаваць стратэгіі ўстойлівага развіцця рэгіёнаў, адзначыла Мар'яна Шчоткіна. Магілёўская вобласць ужо падрыхтавала такі дакумент.

«Мы цяпер пачынаем распрацоўку новых праграм на наступную пяцігодку. Гэтыя праграмы павінны быць складзены з улікам тых асаблівасцяў, якія ёсць у кожным канкрэтным рэгіёне», — дадала яна.

Мар'яна Шчоткіна таксама акцэнтавала ўвагу на канцэпцыі развіцця «разумных гарадоў», якая прадугледжвае інтэграцыю і анлайн-каардынацыю гарадскіх службаў, сэрвісаў, інфраструктуры. Гэта якасна новы ўзровень фарміравання гарадскога асяроддзя. Першым такую канцэпцыю пачаў асвойваць Брэст. Аналагічная праграма рыхтуецца ў Мінску.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# Хто зойме месцы ў верхняй палаце парламента?

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

З 9 да 13 кастрычніка Цэнтральная камісія па выбарах зарэгіструе кандыдатаў у члены Савета Рэспублікі і выдасць ім пасведчанні. Не пазней, чым на чацвёрты дзень пасля рэгістрацыі, у сродкі масавай інфармацыі паступіць паведамленне пра рэгістрацыю кандыдатаў у члены Савета Рэспублікі.

У Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь вызначаны пэўныя патрабаванні да грамадзян, якія могуць быць выбраны кандыдатамі ў члены верхняй палаты парламента. Сенатарам у нашай краіне можа стаць грамадзянін Беларусі, які дасягнуў 30 гадоў і пражывае на адпаведнай тэрыторыі вобласці, горада Мінска не менш за пяць гадоў. Згодна з палажэннем Выбарчага кодэкса Беларусі, у члены Савета Рэспублікі не могуць быць выбраныя грамадзяне, якія маюць судзімасць.

Акрамя таго, адна і тая ж асоба не можа адначасова з'яўляцца членам дзвюх палат парламента, членам Савета Рэспублікі і членам урада. Не дапускаецца сумяшчэнне абавязкаў члена верхняй палаты парламента з заняццем пасады Прэзідэнта або суддзі.

На пасяджэнні дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню ў абласцях і Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў прымаецца рашэнне аб уключэнні кандыдатаў у члены Савета Рэспублікі ў бюлетэнь для галасавання, які выдаецца кожнаму дэпутату, які бярэ ўдзел у рабоце пасяджэння. Кожны ўдзельнік галасуе асабіста. Выбраным лічыцца кандыдат, які атрымаў больш як палову галасоў дэпутатаў, што бралі ўдзел у галасаванні.

Такім чынам будуць абраныя 56 членаў Савета Рэспублікі сёмага склікання. Яшчэ восем членаў будуць прызначаны Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Не пазней за 22 лістапада Цэнтральная выбарчая камісія вызначае вынікі выбараў і рэгіструе абраных членаў Савета Рэспублікі, пасля чаго выдае ім адпаведныя пасведчанні. Не пазней, чым праз тры дні пасля падпісання пратакола аб выніках выбараў, ЦВК накіроўвае ў СМІ паведамленне пра абраных членаў Савета Рэспублікі.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# МАЛАЯ РАДЗІМА І АСВЯТЛЕННЕ ВУЛІЦ

**18 тэлефанаванняў адбылося падчас прамой лініі старшыні Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Кацярыны ЗЕНКЕВІЧ. Большая частка з тых, хто дазваніўся, — жыхары Гомеля. Дарэчы, тэматыка зваротаў была традыцыйная: праблемы ЖКГ, утрыманне дарог, сацыяльная абслугоўванне.**

Напрыклад, людзі паведамілі пра тое, што на вуліцы Мільчанскай у абласным цэнтры адсутнічае асвятленне і разбіта дарога ад дэпо і далей. Дарэчы, папярэднія звароты ў адміністрацыю Савецкага раёна не прынеслі станоўчых вынікаў. Грамадзянам адказалі, што пакуль няма грошай для правядзення рамонтных работ. Узяты на кантроль званок жанчыны, што прасіла разабрацца з коштам харчавання для яе дзіцяці, якое жыве разам з ёй у Гомелі, але зарэгістравана ў сельскай мясцовасці.

Жыхар Светлагорскага раёна, ураджэнец Брагіна Аляксандр Цярэшчанка задаволены работай органаў мясцовага самакіравання на яго малой радзіме. Напрыклад, тым, што старшыня Вуглоўскага сельсавета Святлана Протчанка многа робіць, каб, нягледзячы на сумную чарнобыльскую «славу», пра гэтыя мясціны не забывалі людзі, якія там некалі жылі. Таксама мужчына добрым словам успомніў старшыню праўлення гомельскага абласнога аддзялення Беларускага фонду міру Цімафея Глушакова — за дапамогу па ўвекавечанні памяці загінулых землякоў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# ВЯСКОВЫ МАЛАДЫ СПЕЦЫЯЛІСТ...

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)***

Для маладых спецыялістаў заканадаўствам прадугледжаны шэраг дадатковых гарантый і кампенсацый. У тым ліку — грашовая дапамога, якую наймальнік выплачвае яму ў месячны тэрмін. Сума залежыць ад таго, якую адукацыю ён атрымаў, і ад памеру стыпендыі. Маладым людзям належыць таксама кампенсацыя ў сувязі з пераездам на работу ў іншую мясцовасць — яна з'яўляецца абавязковай, але выплачваецца толькі ў тым выпадку, калі арганізацыя, куды прыбыў малады спецыяліст, знаходзіцца ў іншым населеным пункце ў дачыненні да яго пастаяннага месца жыхарства да размеркавання (гэта пацвярджаецца рэгістрацыяй у пашпарце). Кампенсуецца кошт праезду не толькі самога выпускніка, але і членаў яго сям'і — мужа, жонкі, дзяцей і бацькоў абодвух сужэнцаў, якія знаходзяцца на ўтрыманні і пражываюць разам з імі. Маладым спецыялістам наймальнік можа таксама кампенсаваць затраты за наём жылля. Заканадаўствам прадугледжана такая магчымасць, але абавязковымі гэтыя выплаты не з'яўляюцца. Калі наймальнік прымае такое рашэнне, то самастойна вызначае іх памер, а таксама парадак і ўмовы кампенсацыі. Усё гэта прапісваецца ў адпаведным лакальным нарматыўным прававым акце або загадзе, працоўным дагаворы (кантракце) з маладым спецыялістам, — расказала **галоўны спецыяліст па міжнароднай, інфармацыйнай, культурна-масавай рабоце і рабоце з моладдзю Рэспубліканскага камітэта прафсаюза работнікаў АПК Ала КЛІМКОВА.**

## ...гарантуе прафсаюз

Дарэчы, усе маладыя спецыялісты, што прыходзяць на работу ў сельскую гаспадарку, — члены прафсаюза. У прафсаюз яны ўступаюць яшчэ ў навучальных установах, а на новым рабочым месцы становяцца на прафсаюзны ўлік. Членства ў галіновым прафсаюзе мае свае перавагі і дае магчымасць сэканоміць на хатніх і бытавых расходах і ўмацаваць матэрыяльнае становішча.

— Паміж Міністэрствам сельскай гаспадаркі і харчавання і Беларускім прафсаюзам работнікаў АПК заключана Тарыфнае пагадненне, дзе адзін з раздзелаў датычыцца сацыяльнай абароны моладзі. Гарантыі і льготы, прапісаныя тут, абавязковыя для ўключэння ў калектыўныя дагаворы, — уводзіць у курс справы Ала Валер'еўна.— Тарыфным пагадненнем прадугледжана першачарговае забеспячэнне жыллём маладых спецыялістаў, што прыехалі па размеркаванні, а таксама запрошаных. Пры наяўнасці грашовых сродкаў маладым сем'ям цалкам або часткова кампенсуецца расходы за пражыванне на кватэрах у прыватных домаўладаннях або інтэрнатах. Маладым работнікам, якія паспяхова вучацца на завочным ці вячэрнім аддзяленні вышэйшых навучальных устаноў і атрымліваюць першую вышэйшую або сярэдне-спецыяльную адукацыю, незалежна ад спецыяльнасці ўстаноўлены льготы. Маладым спецыялістам са сродкаў арганізацыі выдзяляюць пазыкі для будаўніцтва або пакупкі жылля, прадметаў хатняга ўжытку працяглага карыстання, навучання на платнай аснове па спецыяльнасцях, у якіх маюць патрэбу дзяржаўныя арганізацыі або арганізацыі з доляй дзяржавы. Наймальнікі могуць таксама даваць харчаванне з мінімальнай аплатай. Калі маладыя людзі ствараюць сям'ю, ім гарантаваныя яшчэ большыя льготы, гаспадарка можа бясплатна выдзеліць карову, сена для харчавання жывёлы. А самае галоўнае — засяліць у дом з усімі выгодамі, пабудаваны па дзяржаўнай праграме адраджэння і развіцця сяла.



Фота БелТА.

> У адной з гаспадарак маладыя спецыялісты пабраліся шлюбам, муж — аграном, жонка — эканаміст. Усё іх задавальняе. Але маладыя чакаюць дзіця. Дык вось фельчарска-акушэрскі пункт знаходзіцца за 10 кіламетраў ад дома.

Што да працоўных адносін, то наймальнік можа прапанаваць любую іх форму: кантракт, бестэрміновы працоўны дагавор. Але выпускнік мае права выбіраць той варыянт, які яго больш задавальняе. Кантракт па яго жаданні можа заключацца не толькі на перыяд абавязковай адпрацоўкі, але і на большы тэрмін — 3—5 гадоў. Гэта залежыць ад жадання маладога спецыяліста. Бясспрэчна, большасць выбіраюць кантракт, паколькі ён прадугледжвае дадатковыя меры стымулявання працы — да 50 % павышэння тарыфнай стаўкі і да пяці каляндарных дзён водпуску, якія аплачваюцца. У Тарыфным пагадненні рэкамендуецца даваць маладым спецыялістам не менш як 10 % да тарыфнай стаўкі або акладу і не менш трох дзён водпуску. А па калектыўным дагаворы гэта можа быць усе 50 % і дадатковыя пяць дзён адпачынку. Менавіта так робяць наймальнікі, якія хочуць замацаваць кадры.

## Ці можна звольніцца дачасна?

> Звольніцца маладому спецыялісту па асабістым жаданні нельга, пакуль ён не адпрацуе абавязковы тэрмін пасля размеркавання. У адваротным выпадку чалавек павінен вярнуць сродкі, якія дзяржава патраціла на яго навучанне.

Здараецца, што малады спецыяліст знайшоў новую, больш грашовую работу і хоча пераразмеркавацца. Але гэта можна зрабіць, калі дадуць згоду навучальная ўстанова, цяперашні і будучы наймальнікі. Калі ўсе бакі дамовіліся, то ВНУ выдасць новае пасведчанне аб накіраванні на работу, але толькі па спецыяльнасці.

Наймальнік можа звольніць маладога спецыяліста па асабістай ініцыятыве — за прагулы, знаходжанне на рабочым месцы ў п'яным выглядзе, у выпадку скарачэння колькасці або штатаў. Але ні ў якім разе за недахоп вопыту, прафесіяналізму.

## Што хоча моладзь

Маладыя спецыялісты часта звяртаюцца па кансультацыю ў Рэспубліканскі камітэт прафсаюза работнікаў АПК. У асноўным пытанні датычацца недахвату мінімальных сацыяльных стандартаў на сяле: закрываюцца аб'екты культуры, адукацыі, гандлю. Маўляў, нам падабаецца работа, мы хочам працаваць па выбранай спецыяльнасці, але ж... школа далёка ад месца жыхарства, няма стацыянарнай крамы, два разы на тыдзень прыходзіць аўталаўка. Напрыклад, у адной з гаспадарак маладыя спецыялісты пабраліся шлюбам, муж — аграном, жонка — эканаміст. Усё іх задавальняе. Але маладыя чакаюць дзіця. Дык вось фельчарска-акушэрскі пункт знаходзіцца за 10 кіламетраў ад дома. Вядома, аб праблеме добра ведае і агучвае яе прафсаюз разам з наймальнікам. Разам з тым рашаць праблему неабходна на больш высокім узроўні. Гэта дапаможа ў замацаванні кадраў на сяле, лічаць прафсаюзныя спецыялісты.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

НОВЫЯ ПАДЫХОДЫ

# ЯК ЗАМАЦАВАЦЬ КАДРЫ?

## Вельмі проста: добра плаціць і вырашаць жыллёвыя пытанні

**Вядомае выказванне пра тое, што рыба шукае дзе глыбей, а чалавек дзе лепей, бадай, вельмі ў тэму, калі разважаць пра кадры. Гэтай праблеме ў Віцебскім аблвыканкаме аддаюць вялікую ўвагу. Старшыня аблвыканкама Мікалай Шарснёў уласна аўтар ідэй, якія павінны паспрыяць таму, каб маладыя спецыялісты заставаліся працаваць у глыбінцы. І яшчэ каб паўночны рэгіён стаў прывабным для пераезду на работу з іншых абласцей. Першачарговая ўвага — кадрам АПК.**

Спачатку пра вёску. Аграрны сектар эканомікі вельмі важны для Віцебскай вобласці. У прыватнасці, прадукцыя сяла займае пятую частку з усяго, што адпраўляецца за мяжу. Прадукты з Прыдзвіння ахвотна купляюць у больш чым 30 краінах і амаль ва ўсіх рэгіёнах Расіі. Кожны дзясяты з усіх занятых у эканоміцы — а гэта каля 48 тысяч чалавек — працуе ў аграрным сектары.

Больш пільную ўвагу кадраваму пытанню, на думку губернатара, трэба было аддаваць раней, каб сітуацыя не стала крытычнай. Летась у заатэхнічнай службе не хапала каля 17 % спецыялістаў, у ветэрынарнай — каля 22 %.

Сёння кадравыя пытанні абмяркоўваюцца падчас самых розных мерапрыемстваў. У тым ліку падчас пасяджэнняў аблвыканкама, выездаў у гаспадаркі, наведвання навучальных устаноў і г. д. Між іншым, па ініцыятыве Мікалая Шарснёва ў школах фарміруюцца аграрныя класы. Павялічваецца і мэтавы набор сельскіх жыхароў у ВНУ сельскагаспадарчай спецыялізацыі. Прынцыповае патрабаванне старшыні аблвыканкама: падчас вытворчых практык (працягласць іх павялічылі) хлопцаў і дзяўчат адпраўляюць у найлепшыя гаспадаркі. Канешне, калі, напрыклад, на ферме будучы ветэрынар убачыць, мякка кажучы, не самыя камфортныя ўмовы для персаналу і кароў, то наўрад ці будзе марыць тут працаваць.



**На прадпрыемствах Віцебшчыны.**

Яшчэ адзін важны нюанс датычыцца той жа ветэрынарнай спецыяльнасці. Каб зацікавіць выпускнікоў, па ініцыятыве старшыні аблвыканкама распрацавалі методыку падліку аплаты працы прадстаўнікоў некаторых сельскагаспадарчых прафесій. Напрыклад, пры старанней працы на ферме спецыяліст можа зарабіць 1,5—2 тысячы рублёў, і гэта не мяжа. Такім чынам зусім не фантастычнымі становяцца такія заробкі для найбольш запатрабаваных спецыялістаў. І з часам іх пералік будзе павялічвацца.

Ужо адчуваецца эфект ад новых падыходаў. Як канстатаваў губернатар, выпускнікі Віцебскай акадэміі ветэрынарнай медыцыны (дзе ён і сам, дарэчы, вучыўся) збіраюцца застацца пасля атрымання дыпломаў на поўначы Беларусі.

Рэзонныя патрабаванні аблвыканкама і да старшынь райвыканкамаў: у першую чаргу ў глыбінцы кіраўнікі павінны быць зацікаўленыя, каб моладзь пасля адпрацоўкі нікуды не з'язджала. Таму і заробкі, і жыллё, і годная інфраструктура — усё гэта павінна быць.

Ужо нямала зроблена, каб вырашаць праблему недахвату спецыялістаў з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй. Патрэбнасць Віцебшчыны ў такіх — 4,4 тысячы. У мінулым годзе на 5 % больш стала школьнікаў выпускных класаў, якія вырашылі навучыцца рабочым спецыяльнасцям. Таксама летась па ініцыятыве кіраўніцтва аблвыканкама адказныя асобы сумесна з прадстаўнікамі саюза наймальнікаў прааналізавалі сітуацыю з рабочымі кадрамі. Сярод іншага высветлілася, што прадпрыемствы ў рэдкіх выпадках заключаюць дагаворы на мэтавую падрыхтоўку спецыялістаў. І гэта пры тым, што амаль усім неабходны рабочыя рукі.

Разам з тым многія недзяржаўныя вытворцы рыхтуюць кадры на сваёй базе, улічваючы ўнікальнасць абсталявання і, адпаведна, прадукцыі, якая выпускаецца. (Напрыклад, на прадпрыемствах, дзе вырабляюць кабельную прадукцыю, пад'ёмнікі, пластмасавыя вырабы.)

Дарэчы, конкурс сярод тых, хто жадае працаваць на такіх прадпрыемствах, вышэйшы, чым пры паступленні на самыя цікавыя для моладзі спецыяльнасці ў ВНУ, таму што заробкі там на ўзроўні прафесарскіх і нават больш, ды яшчэ годныя заахвочванні з нагоды асабістых і дзяржаўных свят.

Калі рабочага цэняць, то і на прадпрыемстве ёсць каму працаваць. Тым больш што ў час інтэрнэту ўзнікае ўсё больш высокаінтэлектуальных вытворчасцяў. І там нават людзі з інжынернай адукацыяй не адразу ўнікаюць ва ўсе аперацыйныя нюансы. Не дзіўна, што ў Віцебску ўжо ёсць прадпрыемствы, дзе інжынеры з задавальненнем працуюць на рабочых месцах.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ, фота аўтара.**

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ!

# ПРАФЕСІЙНАЯ

**Кадравы голад у аграпрамысловым комплексе — даўно аксіёма. Ні ВНУ, ні каледжы не могуць задаволіць пастаянны попыт на маладых спецыялістаў. Але і тыя, хто прыйшоў працаваць па размеркаванні, не затрымліваюцца ў гаспадарках надоўга. У чым тут справа? Аказваецца, прабуксоўка пачынаецца ўжо на першым этапе падрыхтоўкі.**

## Сышлі з дыстанцыі

У адпаведнасці са статыстыкай, кадраў у сельскай гаспадарцы павінна хапаць. Толькі Гродзенскі аграрны ўніверсітэт штогод выпускае 400 маладых спецыялістаў, з якіх 300 бюджэтнікаў едуць працаваць па размеркаванні.

Але ці можа кузня кадраў задаволіць усе заяўкі? На гэта пытанне ў аддзеле кадраў аграрнага ўніверсітэта адказалі адназначна: не можа. Попыт значна перавышае прапанову. Напрыклад, заатэхнікаў у сельгаспрадпрыемствы нікравана толькі 48 чалавек, а заявак паступіла 203. На ветэрынарных урачоў яшчэ больш. На 60 маладых спецыялістаў прыходзіцца 223 заяўкі — у 3,5 раза больш за рэальныя магчымасці ВНУ. Прычым асноўная частка заявак паступае менавіта з Гродзенскай вобласці. Толькі ў Гродзенскі раён — самы развіты ў сферы АПК — штогод прыходзіць ад 50 да 70 чалавек.

І гэта не выключна спецыялісты з вышэйшай адукацыяй. Напрыклад, механізатараў, якія вельмі патрэбны, рыхтуюць каледжы і ліцэі — штогод у кожную гаспадарку рэгіёна накіроўваецца па 3-4 і нават больш такіх спецыялістаў.

Але кадраў па-ранейшаму не хапае, аб чым сведчыць колькасць заявак. Да таго ж і маладых спецыялістаў магло быць больш.

> Аказалася, што значная частка будучых аграномаў, заатэхнікаў і ветэрынарных урачоў сыходзяць з дыстанцыі задоўга да фінішу. Многія не вытрымліваюць нагрузкі, іншыя раптам разумеюць, што селі не ў свае сані, некаторых адлічваюць з-за дрэннай вучобы.

Выпускніца заатэхнічнага факультэта расказала, што на першым курсе яе група складалася з 50 чалавек, а да фінішу дайшлі толькі 27, амаль палова адсеялася. Падобная сітуацыя і на ветэрынарнай спецыяльнасці. А між тым гэта самыя запатрабаваныя кадры ў сельгаспрадпрыемствах. Такім чынам, кожны год сыходзіць з дыстанцыі кожны чацвёрты — усяго каля ста чалавек. І гэта першае слабае звяно ў падрыхтоўцы кадраў.

## Хутчэй на «дэмбель»?

Як паказвае практыка, гаспадаркі маюць найбольшую патрэбу ў спецыялістах з вышэйшай адукацыяй. Але ці ўсе яны потым застаюцца на тых месцах, дзе пачыналі свой працоўны шлях? Як сведчыць тая ж статыстыка, замацаванасць маладых спецыялістаў па вобласці складае толькі 50 %, крыху вышэйшы гэты паказчык па Гродзенскім раёне.

Удалося пагутарыць з выпускнікамі аграрнага ўніверсітэта, якія сёлета былі размеркаваны менавіта ў гаспадаркі моцнага Гродзенскага раёна. Абое яны вучыліся па мэтавым накіраванні і цяпер павінны пяць гадоў адпрацаваць. Ці мяркуюць застацца ў калгасе надалей? Пакуль пытанне застаецца адкрытым. І для гэтага, як аказалася, нямала прычын.

Для Віталіны Баран, якая сёлета прыйшла на работу ў СВК «Ніва-2003», калгаснае жыццё знаёма з дзяцінства. Тут працуюць і яе бацькі. Але рашэнне прыйшло не адразу — спачатку хацела паступаць на псіхолага, паралельна наведвала курсы ў аграрным універсітэце. Калі прыспеў час, аддала перавагу АПК — вырашыла паступаць на заатэхніка-селекцыянера. Кажа, што любіць жывёлу і не лічыць сваю работу занадта цяжкай. У любым выпадку, пяцігадовы тэрмін збіраецца адпрацаваць. А далей? Віталіна не хавае будучых планаў. І яны, па ўсёй бачнасці, не звязаны з сельскай гаспадаркай. Што не задавальняе? У нейкай ступені зарплата, але ў асноўным — гэта ўмовы працы. Не апошнюю ролю адыгрывае і стаўленне да маладых спецыялістаў.



Разам з тым Віталіна згаджаецца, што ў гаспадарцы многае робіцца для таго, каб замацаваць маладых. Нядаўняму выпускніку — аграхіміку — тут далі добрае жыллё. Самой Віталіне жыллё не патрэбна, яна жыве з бацькамі, але пры неабходнасці таксама можа атрымаць службовую кватэру — калі выйдзе замуж і застанецца тут працаваць. Але дзяўчына не ўпэўнена ў гэтым. Многія яе аднагрупнікі пасля адпрацоўкі хочуць на «дэмбель».

А вось для ветэрынарнага ўрача Сяргея Кацяка армейскае слоўца якраз дарэчы. Армія «свеціць» яму ўжо сёлета. І гэта, на яго думку, значная перашкода для маладога спецыяліста. Сяргей толькі нядаўна прыступіў да работы ў СВК «Путрышкі». Дарэчы, сустрэлі тут яго добра — разам з жонкай-студэнткай атрымаў трохпакаёвую кватэру.

СВАЯ ТЭРЫТОРЫЯ

# ЕХАЛІ НА АДПРАЦОЎКУ, А ЗАСТАЛІСЯ НАЗУСІМ

## Чаму маладыя спецыялісты затрымліваюцца ў «Белавежскім»

**Белавежскі — пасёлак унікальны. Па-першае таму, што ўзнік адносна нядаўна на пустым месцы. Першы жылы дом быў закладзены ў 1983 годзе. А па-другое, населены пункт цікавы інфраструктурай, архітэктурным праектам. Тут вуліцы не прамыя, а закругленыя. З самой вуліцы не відаць хляваў, гаспадарчых пабудоў, да якіх прадугледжаны асобны пад'езд. З фасада двары выглядаюць даволі прывабна, па даўняй традыцыі перад домам агуркі не садзяць — толькі кветкі. Але галоўнае, лічыць старшыня сельскага Савета Жанна ХІЛЮЦІЧ, людзі любяць свой Белавежскі.**

### КАЛЕКТЫЎ ЖЫХАРОЎ

На будаўніцтва вялікага свінакомплекса ў першай палове 80-х з'язджаліся самыя розныя людзі ледзь не з усёй вялікай краіны. Паступова некаторыя адсеяліся, затое астатнія аб'ядналіся ў адзін калектыў. Цяпер у пасёлку дружна жывуць людзі 13 нацыянальнасцяў. «Ціхія і спакойныя дома сядзелі, — разважае Жанна Сцяпанаўна. — Ехалі сюды тыя, хто не баяўся рызыкнуць, памяняць жыццё — нехта ехаў па жыллё, нехта — па каханне. Але ж гэта былі пераважна людзі з актыўнай жыццёвай пазіцыяй. Такіх і цяпер лягчэй арганізаваць на талаку, на добрую справу. Як у нас дні пасёлка праходзяць — асаблівая тэма».

Сявты становяцца свайго роду аглядам усяго жыцця за год. Вось і гэтым летам яно прайшло ў чэрвені. Але і дагэтуль жыхары зазіраюць у двор таго ці іншага лаўрэата года. Зазіраюць, каб пагледзець і зрабіць нелета ў сябе яшчэ лепш. Усё гэта напрамую датычыцца замацавання маладых спецыялістаў у ААТ «Белавежскі» і сацыяльных установ аграгарадка, якіх тут нямала».

Сам «Белавежскі» ўяўляе сабой буйное сучаснае сельгаспрадпрыемства, якое спецыялізуецца на жывёлагадоўлі. Сёння да ААТ далучылі столькі гаспадарак раёна, што ў склад уваходзяць землі ажно чатырох сельсаветаў: Ратайчыцкага, Вярховіцкага, Раснянскага, Белавежскага. На падыходзе — Воўчынскі. У штаце гаспадаркі 1700 работнікаў, 380 з якіх спецыялісты.

Многія з іх — гэта другое пакаленне тых, хто прыехаў 35 гадоў таму, яны ўжо карэнныя жыхары пасёлка. Такіх можна знайсці не толькі ў гаспадарцы, але і ў школе, садку, на прадпрыемствах гандлю і грамадскага харчавання. Скажам, Таццяна Акеліна, загадчыца дзіцячага садка — дачка тых, хто адным з першых будаваўся на гэтай зямлі. Таццяна Уладзіміраўна хадзіла ў садок, потым у школу. А пасля заканчэння ВНУ вярнулася дадому. Кажа, тут ёсць усё для камфорту, а ў сельскай мясцовасці ўсё роўна жыццё больш таннае, чым у буйным горадзе.

### ПА РАЗМЕРКАВАННІ

Наталля Гарбацэвіч жыве па вуліцы Першамайскай, дзе пасялілася многа маладых спецыялістаў. Наталлю мы застаём дома, бо яна ў дэкрэтным водпуску, даглядае меншага — Архіпа. Муж Дзмітрый, галоўны інжынер мясакамбіната, вядома, днём на рабоце. Абое яны са Слуцкага раёна, там жыве ўся радня. Ехалі сюды па размеркаванні мужа.



Наталля Гарбацэвіч з сынам Архіпам.

— Дзіма прыехаў па размеркаванні ў 2010 годзе, — расказвае Наталля. — Я яшчэ вучылася ў БНТУ, прыехала да мужа ў 2012-м. У мяне спецыяльнасць інжынер-тэхнолаг ювелірнай вытворчасці. Работа па спецыяльнасці можа быць толькі ў горадзе, з заўсёды бачыла сябе ў гарадской інфраструктуры. Ды паколькі замуж выйшла за хлопца з аграрнага ўніверсітэта — ён заканчваў БАТУ — на ўсялякі выпадак яшчэ год павучылася і атрымала эканамічную спецыяльнасць... Але ж мы ехалі адназначна на адпрацоўку. Думалі, два гады — і ўсё. Ды і бацькі, усе родныя хацелі бачыць нас бліжэй да сябе.

А потым неяк хутка ўсё складвалася, спачатку з'явілася кватэра, нарадзіўся Арцём, ён сёлета ў першы клас пойдзе, потым вось Архіпка ў нас з'явіўся. А мы ўжо ў сваім доме, рамонт зрабілі, абсталявалі, мэблю купілі. І ў Дзімы работа добрая.

— Прывыклі мы, — кажа далей Наталля. — Людзі ў пасёлку добразычлівыя, з некаторымі маладымі сем'ямі добра кантактуем. Ёсць каму зайсці да нас альбо нам да каго завітаць на Новы год ці дзень нараджэння. Усё, што трэба для жыцця, — садок, школа, школа мастацтваў — на месцы. Горад недалёка. Нават царкву ў нас пабудавалі. Неяк гаварылі з мужам, што можна ўжо было б усёй сям'ёй часам наведваць службу. Пакуль дзеці малыя, то да гэтага рукі, як той казаў, не дайшлі, а потым, вядома, пойдзем... Хутка з дэкрэтнага выходзіць, дык думаем, ці не «схадзіць» яшчэ па дзяўчынку? — усміхаецца гаспадыня.

І мы са старшынёй сельскага Савета ў адзін голас раім: абавязкова «схадзіць»!

### ІНЖЫНЕР, АГРАНОМ, ВАКАЛІСТ

Паспяхова працуюць маладыя спецыялісты Аксана і Дзмітрый Парцянкіны. Аксана — бухгалтар, Дзмітрый — галоўны аграном аддзялення «Расна». Яны таксама ехалі на адпрацоўку... і таксама засталіся. Юлія і Канстанцін Логвіны працуюць у розных галінах. Канстанцін зараз займае пасаду галоўнага інжынера аднаго з падраздзяленняў. Юлія выкладае вакал у Доме культуры і школе мастацтваў. Таксама Юля самы актыўны член агітбрыгады падчас уборкі. Выязджае ў поле на абедзенны перапынак, дае маленькія канцэрты. Працаўнікі чакаюць, шчыра дзякуюць артыстам.

Падобныя сем'і можна знайсці на кожнай вуліцы ў новай палове пасёлка, бо ў старой яго частцы жывуць найбольш тыя работнікі, якія ехалі сюды раней. А пасёлак-аграгарадок працягвае будавацца і развівацца. Усе 20 яго вуліц маюць асфальтавае пакрыццё. Кожны год будуецца новае жыллё. Вось і сёлета ўжо здадзены чатыры дамы, яшчэ чатыры рыхтуюцца да здачы. І гэта толькі ў адным Белавежскім. Жыллё ўзводзіцца і ў іншых падраздзяленнях акцыянернага таварыства.

— Маладыя спецыялісты штогод прыходзяць у ААТ «Белавежскі». Летась, напрыклад, прыбыло 12 чалавек пасля ВНУ і 20 пасля сярэдніх спецыяльных устаноў. Таксама прынялі на работу 17 выпускнікоў устаноў прафтэхадукацыі, — гаворыць **старшыня прафкама гаспадаркі Валянцін СУПРУНОВІЧ.** — Сёлета толькі пачынаюць прыбываць і прыступаць да работы. У нас усе ўчарашнія выпускнікі забяспечваюцца інтэрнатам. Звычайна гэта трох- альбо двухпакаёвая кватэра на некалькі чалавек. А вось сям'я атрымлівае асобную кватэру. Далей сямейныя спецыялісты, хто адпрацаваў год-другі, пераязджаюць у асобны дом.

Валянцін Міхайлавіч падкрэслівае, што ў гаспадарцы наладжана сістэма работы з кадрамі. Спецыяліст, які паказаў сябе кваліфікаваным, удумлівым, стараным работнікам, даволі хутка прасоўваецца па кар'ернай лесвіцы: скажам, прыходзіць выпускнік з дыпломам агранома, ён можа стаць брыгадзірам вытворчай брыгады, потым галоўным спецыялістам у адным з падраздзяленняў і так далей. Таму ёсць стымул для развіцця і самаадукацыі. Ну і сярэдняя зарплата летась, напрыклад, была самай высокай сярод сельгаспрадпрыемстваў раёна.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

*Камянецкі раён.*

Тэлесеткі

# Новыя размовы пра вечнае

**Ужо на наступным тыдні аўтарская праграма Навума Гальпяровіча «Суразмоўцы», якая выходзіць на тэлеканале «Беларусь 3», пачынае другі сезон.**

У эфір выйдуць новыя выпускі праекта, у якіх вядучы і госці працягнуць абмеркаванне сучаснага стану беларускай мовы і літаратуры, іх ролі ў фарміраванні грамадскай свядомасці і культуры наогул.

Нагадаем, гасцямі праграмы ўжо былі вядомыя аўтары і даследчыкі: кіраўнік Інстытута літаратуразнаўства НАН Беларусі Іван Саверчанка, рэктар Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта Дзяніс Дук, маладзечанскі краязнавец Міхась Казлоўскі і іншыя. А міністр інфармацыі Беларусі Алесь Карлюкевіч, які летась стаў першым суразмоўнікам праграмы, сёлета, напярэдадні Дня беларускага пісьменства ў Слоніме, зноў наведае здымачную пляцоўку 31 жніўня і падвядзе своеасаблівыя літаратурныя вынікі года, а таксама раскажа пра цікавінкі будучага свята.

Дарэчы, з 1 верасня ўсе інтэрв'ю будуць выходзіць і ў аўдыяверсіі — у эфіры канала «Культура» Беларускага радыё.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

## Легендарны гурт The Offspring выступіць на «Wargaming Fest: Дзень танкіста»

**Менш за месяц засталося да гучнай падзеі, якая адбудзецца 15 верасня ў мінскім парку Перамогі — фэсту «Wargaming Fest: Дзень танкіста». Сапраўдным падарункам для больш чым 200 тысяч гасцей свята стануць артысты, якія сёлета выйдуць на галоўную сцэну.**




Перад удзельнікамі сёлетняга фестывалю выступяць знакамітыя ўкраінскія, расійскія і беларускія музыкі: «Воплі Відаплясава», «Звери», «Крамбамбуля», а цвікам музычнай праграмы стане выступленне сапраўды культавай групы з сонечнай Каліфорніі — The Offspring.

У параўнанні з мінулым годам фестываль істотна пашырыў геаграфію ўдзельнікаў: у 2018 годзе на «Дзень танкіста» прыехалі прадстаўнікі 10 краін, у той час як на сённяшні дзень ужо чакаюць гасцей з 28 дзяржаў: як традыцыйных — Германія, Чэхія, Францыя і Польшча, так і экзатычных — ААЭ, Ганконг, Бахрэйн і Кувейт.

Фестываль запрашае ўсіх аматараў гульняў Wargaming і проста прыхільнікаў вясёлага і актыўнага адпачынку прыходзіць разам з сем'ямі і сябрамі — для кожнага знойдзецца шмат цікавых актыўнасцяў і забавак. «Wargaming Fest: Дзень танкіста» адбудзецца 15 верасня ў мінскім парку Перамогі (праспект Пераможцаў, 45), уваход бясплатны.

**Іван КУПАРВАС, фота аўтара.**

## ШАШКІ («Звязда») Выпуск № 94

Абвешчаны рэспубліканскі конкурс па рашэнні шашачных кампазіцый, прысвечаны памяці шматгадовага вядучага шашачнага аддзела газеты «Звязда» майстра спорту СССР па шашачнай кампазіцыі Мікалая Мікалаевіча Грушэўскага.

Згодна з патрабаваннямі спартыўнай класіфікацыі, пераможца конкурсу выканае альбо пацвердзіць норму першага спартыўнага разраду па шашках. Чытачы, якія рашаць усе конкурсныя заданні, атрымаюць права на прысваенне другога разраду. Трое найлепшых атрымаюць прызы з бібліятэкі М. М. Грушэўскага.

За правільнае рашэнне кожнага задання налічваецца адно ачко.

За знаходжанне поўных пабочных рашэнняў або доказ невырашальнасці налічваецца дадаткова па адным ачку, за знаходжанне прыватнага пабочнага рашэння налічваецца дадаткова па 0,5 ачка. За няправільны доказ пабочнага рашэння ці невырашальнасці здымаецца адно ачко. За няправільны доказ прыватнага пабочнага рашэння здымаецца 0,5 ачка. Пабочныя рашэнні трэба выдзеліць. У конкурсе будзе прапанавана 12 заданняў, па 4 у кожным выпуску. Тэрмін на абдумванне заданняў — чатырнаццаць каляндарных дзён з дня выхаду аддзела. Удзельнікі конкурсу павінны даслаць заяўку з указаннем прозвішча, імя, хатняга адраса, тэлефона, даты нараджэння, наяўнасці разраду па шашках (кампазіцыі).

Заданні конкурсу:

**№ 1**



**№ 1**
**Белыя простыя шашкі:** e1, h2, a3, c3, e3, f4, h4 (7).
**Чорныя простыя шашкі:** a5, c5, g5, d6, f6, h6, d8 (7).

**№ 2**
**Белыя простыя шашкі:** e1, g1, f2, e3, b4, f4 (6).
**Чорныя простыя шашкі:** h4, e5, g5, b6, d6, h6 (6).

**№ 3**
**Белыя простыя шашкі:** c3, d4, e3, f2, f4, h6 (6).
**Чорныя простыя шашкі:** b8, d6, f6, f8, g5, g7 (6).

**№ 4**
**Белыя простыя шашкі:** a7, b6, d4, f4, f6, g5 (6).
**Чорныя простыя шашкі:** b2, b4, c5, d2, f2, h4 (6).

Першыя два заданні складзены вядучым аддзела, трэцяе і чацвёртае склаў украінскі шашачны кампазітар С. Рэзнікаў.

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць.

Праверце свае рашэнні:
Выпуск № 93 ад 02.08.19.
№ 55 в6, gf8, c1, f2, e1, d2 (в4, e3) e1 +
№ 56 g5, e3, a3, e7!, g1 +
№ 57 h8, a3, g3, в2!, f2, f2 +

З лістоў чытачоў. Фёдар Карпей з Мядзела піша: «Дзякую аўтару гэтых кампазіцый! Асобная ўдзячнасць вядучаму аддзела за падбор заданняў, пры рашэнні якіх адчуваеш асалоду і душэўную радасць, жаданне рашаць яшчэ і яшчэ! Дзякую і рэдакцыі газеты за магчымасць з задавальненнем праводзіць вольны час і адчуваць у сабе патрэбу да актыўнага жыцця!»

Правільныя адказы даслалі: У. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна), В. Дударэвіч (вёска Новая Мыш Баранавіцкага раёна), Л. Жыхар, Ф. Карпей (абодва Мядзел), У. Статкевіч (пасёлак Зялёны Бор Івацэвіцкага раёна), А. Шурпін (Івянец), В. Ваўчкоў (Маладзечна), П. і В. Шульгі, А. Ліцвінаў (усе Мінск), В. Таўкачоў (Клімавіцкі раён), В. Бандарык (Мінскі раён), С. Рашэцін (Ашмяны).

Пішыце на адрас: газета «Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, г. Мінск, e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru.

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Сядзі і глядзі

# У АДНЫМ ЧАРАВІКУ І З ПАЧУЦЦЁМ ГУМАРУ

**П'ер Рышар Марыс Шарль Леапольд Дэфэ (а менавіта так гучыць поўнае імя французскага акцёра і рэжысёра, якога мільёны гледачоў па ўсім свеце любяць і помняць па фільмах «Цацка», «Няўдачлівыя», «Укол парасонам», «Татулі», «Налева ад ліфта» і іншых) сёння адзначае 85-ы дзень нараджэння.**

Ёсць і яшчэ адна нагода ўспомніць пра знакамітага француза: 45 гадоў таму савецкая публіка ўпершыню пазнаёмілася з яго́ным Франсуа Перэнам — «Высокім бландзінам у чорным чаравіку». Пераглядзець наноў гэты дэтэктыўны фарс, таксама як і рэжысёрскі дэбют Рышара «Рассеяны», можна будзе на наступным тыдні — на канале «Камедыя». А пакуль прапануем падборку малавядомых фактаў з біяграфіі і кінашляху П'ера Рышара.


«Налева ад ліфта».

Адзін з прадзедаў П'ера быў арыстакратам, нашчадкам старога шляхецкага роду з поўначы Францыі (аб чым можна здагадацца па «шматслойным» прозвішчы акцёра), затое другі — браканьерам. І, магчыма, менавіта ад другога П'ер Рышар атрымаў у спадчыну тую авантурную жылку, якая прымусіла пайсці насуперак жаданню сваякоў і не працягнуць сямейны тэкстыльны бізнес, а збегчы ў Парыж, каб вучыцца на драматычных курсах.

Першую ролю ў кіно Рышар, які наўмысна скараціў шляхецкае прозвішча, атрымаў даволі позна: у 33 гады ён сыграў у фільме «Блаславёны Аляксандр», а ў чаканні іншых работ перабіваўся напісаннем забаўных сцэнак-скетчаў і выступаў з імі ў кабарэ і мюзік-холах. Уласна, там ён і стварыў і адтачыў свой фірменны вобраз — гутаперчавы абаяльны прасцячок, адначасова сумны і смешны клоўн. Гэта потым, дасягнуўшы прызнання на сусветным узроўні, ён сам змог выбіраць сабе ролі — пераважна драматычныя, але прабівацца да гледачоў прыйшлося менавіта ў камічным амплуа.


«Высокі бландзін у чорным чаравіку».

Узыходжанне на акцёрскі алімп пачалося якраз з фільма «Высокі бландзін у чорным чаравіку» — камедыі 1972 года. У СССР карціна трапіла на два гады пазней, страціла частку «фрывольных» сцэн пасля цэнзуры і ў лідары па касавых зборах не ўвайшла, аднак пазней гісторыю пра скрыпача-віртуоза, якога выпадкова прымаюць за спецагента, палюбілі ва ўсім свеце. Праз год стужка атрымала «Сярэбранага мядзведзя» на міжнародным фестывалі ў Берліне, а ў 1985 годзе кампанія «20th Century Fox» зняла рымейк «Высокі чалавек у адным чырвоным чаравіку» з Томам Хэнксам у галоўнай ролі. «Вяртанне высокага бландзіна», знятае ў 1974 годзе, замацавала поспех — толькі ў Савецкім Саюзе фільм убачылі звыш 27 мільёнаў гледачоў.


«Цацка».

Дзесяць гадоў акцёр жыў на Сене... у свабодным дрэйфе на ўласнай баржы. Прадаў гэтае жытло пустэльніка акцёр толькі дзеля сваёй другой жонкі, бразільскай топ-мадэлі Сейлы Ласерда, каб набыць ім кватэру ў Парыжы.

Усё тая ж авантурная жылка прадзеда-браканьера адказная за шматлікія падарожжы — па ўласным сцвярджэнні, Рышар ныраў ва ўсе моры на планеце і ўздымаўся на горы ўсіх кантынентаў. А вось яго ўлас-


«Няўдачлівыя».

ныя дзеці атрымалі ў спадчыну музычныя таленты: адзін сын стаў саксафаністам, другі іграе на кантрабасе.

А яшчэ, як, магчыма, стэрэатыпна і чакаецца ад сапраўднага француза, у адзін цудоўны момант Рышар набыў дзясяткі гектараў вінаграднікаў, і яго́ная кампанія выпускае чырвонае віно «Шато Бель-Эбек» (звыш 60 тысяч бутэлек у год).

Напрыканцы 80-х Рышар пачаў выпускаць пласцінкі са сваімі песнямі, але праз нейкі час пераканаўся, што эстрада — не яго́ная сфера. Затое яго ўсё часцей запрашалі ў постсавецкія краіны — і, напрыклад, грузінская камедыя «1001 рэцэпт закаханага кулінара» з яго ўдзелам у 1996 годзе атрымала Залатую пальмавую галіну за найлепшую мужчынскую ролю. Таксама Рышар прадставіў шмат сваіх тэатральных пастановак — адна з іх, спектакль-успамін «П'ер Рычард ІІІ», у 2016-м мела вялікі поспех. Ну і, канешне, з 2006 года Рышар — «Ганаровы Сезар», паводле французскай кінаакадэміі.

### Беларусь 1

**6.45 Меладрама «Адна хлусня на дваіх» (12+).**
**8.20** «Клуб рэдактараў».
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** «Арсенал» (12+).
**9.45 Серыял «След» (16+).**
**10.40** «На вылет!» (12+)
**11.35** «Нашы» (6+).
**12.10** Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**12.35 Серыял «Жанчына ў люстэрку» (16+).**
**14.20** «Тваё месца на кухні» (12+).
**15.15** «Твой горад».
**15.30** «Вакол планеты».
**16.20** «Код нацыі». Дак. фільм (12+).
**16.55 Меладрама «Палёт матылька». 1—4-я серыі (12+).**
**20.40** Навіны надвор'я.
**21.00** «Галоўны эфір».
**22.10 Меладрама «Выбіраючы лёс» (16+).**

### Беларусь 2

**7.00 Серыял «Стаматолаг» (16+).**
**8.30, 19.50** «Тэлебарометр».
**8.35** М/с «Чарапашкі-ніндзя» (12+).
**9.25** «Арол і рэшка. Перазагрузка» (16+).
**10.15** «ЖаннаПажані» (16+).
**11.10 Фантастыка «Вайна светаў» (12+).**
**13.10 Меладрама «Апошняе свята» (12+).**
**15.00** «Калі мы дома». Скетчкам (16+).
**15.50** «Тата папаў» (16+).
**17.45** «Бітва экстрасэнсаў» (16+).
**20.25** «Абмен жонкамі» (16+).
**22.00** «Спортлато 5 з 36», КЕНО.
**22.05 Баявік «Джэк Раян: тэорыя хаосу» (12+).**
**23.50** «Рок за «Бробров». «Ляпіс-98» (16+).

### Беларусь 3

**7.35** «Святыні Беларусі».
**8.00, 14.10, 20.15** Навіны культуры.
**8.20, 14.30, 20.35** «Гэты дзень».
**8.25** «Брыдкае качаня». М/ф (0+).
**8.45 «Дачная паездка сяржанта Цыбулі». Камедыя (12+) [СЦ].**
**10.00** «Наперад у мінулае».
**10.25** «Беларуская кухня». Запечаны гарбуз.
**10.55** «Нацыянальны хіт-парад».
**11.50 «Трое сутак пасля бессмяротнасці». Драма (12+) [СЦ].**
**13.15** «Майстры і куміры». Заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь Уладзімір Карызна.
**14.35 «Саша-Сашачка». Меладрама (12+) [СЦ].**
**15.45** «Дзесяць фатаграфій». Алег Міцяеў (12+).
**16.25 «Каманда 8». Серыял (16+).**
**20.00** «Архітэктура Беларусі».
**20.40** «Калыханка» (0+).
**21.05 «Справа «стракатых». Дэтэктыў (12+) [СЦ].**
**22.40** Канцэрт навучэнцаў Беларускай дзяржаўнай харэаграфічнай гімназіі-каледжа. Балет «Шлях да мары».

### Беларусь 5

**7.00, 20.25, 1.00** Спорт-мікс.
**7.10, 12.05, 14.05** Веславанне на байдарках і каноэ. Чэмпіянат свету.
**10.00** Трэніровачны дзень.
**10.35** Біятлон. Летні чэмпіянат свету. Раўбічы. Прэв'ю.
**11.05** Біятлон. Летні чэмпіянат свету. Раўбічы. Юніёры. Гонка пераследу.
**13.05** Біятлон. Летні чэмпіянат свету. Раўбічы. Юніёркі. Гонка пераследу.
**15.35** Біятлон. Летні чэмпіянат свету. Раўбічы. Мужчыны. Гонка пераследу.
**16.35** Спорт-цэнтр.
**16.45** Піт-стоп.
**17.20** Біятлон. Летні чэмпіянат свету. Раўбічы. Жанчыны. Гонка пераследу.
**18.20** Валейбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Іспанія — Беларусь.
**20.35** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**22.35** Футбол. Чэмпіянат Беларусі. Агляд тура.
**23.20** Дзюдо. Чэмпіянат свету. Паўфіналы і фіналы.

### АНТ

**7.00, 9.00, 16.00** (з субцітрамі) «Нашы навіны».
**7.10** «Ералаш» (6+).
**7.45** «Жыццё іншых» (12+).
**8.40** «Метэагід».
**9.10** «Нядзельная пропаведзь» (з субцітрамі).
**9.25** «Здароўе» (16+).
**10.25** «Бачылі відэа?» (6+)
**12.30 Камедыя «Каралева бензакалонкі» (12+).**
**14.00** «Надзея Румянцава. «Адна з дзяўчат» (12+).
**15.00, 16.20** «Кропля ў кроплю» (16+).
**18.20** «Эксклюзіў» (16+).
**20.00** «Контуры».
**21.05 Серыял «Навучы мяне жыць» (16+).**
**23.00** «Спартклуб» (16+).
**23.20** «КВЗ». Прэм'ер-ліга (16+).

### СТБ

**6.05** «Легенды СССР» (16+).
**7.45, 11.00** Дакументальны спецпраект (16+).
**9.10** «Мінтранс» (16+).
**10.00** «Скардзіцца дазваляецца».
**10.30** «Вялікі горад».
**12.05, 13.40, 16.40 «Мяжа». Серыял (16+).**
**13.30, 16.30** Навіны «24 гадзіны».
**19.30** «Тыдзень».
**20.35** «Засакрэчаныя спісы» (16+).
**23.55 «Баец». Серыял (16+).**
**2.55** «Анекдот-шоу» (16+).

### МІР

**6.00** «Мільён пытанняў аб прыродзе» (6+).
**6.10** М/ф (6+).
**6.40** «Беларусь сёння» (12+).
**7.05** «Пляяванне на працу» (12+).
**7.45** «Культ/Турызм» (16+).
**8.15** «Яшчэ танней» (12+).
**8.45** «Сусветныя гульні розуму» (0+).
**9.25** «Фазэнда лайф» (6+).
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15, 16.15, 19.30, 1.00 Серыял «Страсці па Чапаю» (16+).**
**18.30, 0.00** «Разам».
**1.55 Маст. фільм «Безыменная зорка» (12+).**
**4.20 Серыял «Арлова і Аляксандраў» (16+).**

### РТР—Беларусь

**7.00 Маст. фільм «Змякчальныя абставіны» (12+).**
**10.30** «Смехапанарама» Яўгена Петрасяна» (16+).
**11.00, 20.00** Весткі.
**11.20** «Сто да аднаго» (12+).
**12.15** «Ранішняя пошта» (16+).
**13.00** «Калі ўсе дома» (12+).
**14.00** «Смяяцца дазваляецца» (16+).
**16.40 Маст. фільм «Чалавек-амфібія» (12+).**
**18.30, 20.55 Маст. фільм «Рыжык» (12+).**
**22.40** «Новая хваля — 2019». Юбілейны вечар Ігара Крутога.

### НТБ—Беларусь

**6.15** «Астрапрагноз».
**6.25** Terra incognita. Беларусь невядомая (6+).
**6.55, 23.15** «Зразумець і абясшкодзіць» (12+).
**7.25** «Гатуем з Аляксеем Зіміным» (0+).
**8.00, 10.00, 16.00** Сёння.
**8.20** Спецыяльны рэпартаж (12+).
**8.40** «Вуснамі дзіцяці» (0+).
**9.20** «Хто ў доме гаспадар?» (16+)
**10.25** «Першая перадача» (16+).
**11.00** «Цуд тэхнікі» (12+).
**11.55** «Дачны адказ» (0+).
**13.00** «НашСпажыўНагляд» (16+).
**14.05 Серыял «Мянтоўскія войны» (16+).**
**16.20** «Следства вялі...» (16+)
**19.00** «Вынікі тыдня».
**20.05 Серыял «Шэф» (16+).**
**23.50** «Таямнічая Расія» (16+).

### 8 канал

**7.00, 15.45, 18.40, 21.10, 0.00** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.05 Меладрама «Летуценнік» (0+).**
**8.50** «Шлях АБІ» (0+).
**9.15** «Утрамдзія».
**9.20** «Гатуй як шэф» (12+).
**9.40** «Законы прывабнасці» (12+).
**10.40** «Вячэрні квартал-95» (18+).
**12.10 Камедыя «Па-банку-2, або Удар у адказ» (16+).**
**13.50 Трылер «Спусташэнне» (16+).**
**15.50** «Глядзім усёй сям'ёй»: прыгоды «Джуманджы».
**17.45** «Сябры дзядулі Марка» (0+).
**18.00 Серыял «Касл» (12+).**
**18.45** «Рэальны бізнес» (6+).
**18.50 Драма «Спакуса» (18+).**
**20.50** «Вечарніца» (0+).
**21.15 Вестэрн «Жалезная хватка» (16+).**
**23.10 Серыял «Бульварныя жахі» (16+).**



### ВТБ

**6.05** «Лаві момант» (16+).
**7.00** «Дурні і дарогі» (16+).
**8.20** М/ф «Цімон і Пумба» (0+).
**8.50** «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
**9.55** «Зоркі руляць» (16+).
**11.00** Серыял «Вы ўсе мяне прыводзіце ў шаленства» (16+).
**12.05, 1.05** Серыял «Вароніны» (12+).
**13.40, 3.35** Скетч-шоу «Адна за ўсіх» (16+).
**15.00** Камедыя «Мільянер паняволі» (12+).
**16.55, 0.10** «Уральскія пельмені» (16+).
**18.00** «Узважаныя і шчаслівыя людзі» (16+).
**20.00** Серыял «Два бацькі і два сыны» (16+).
**22.00** Камедыя «Не жартуйце з Зоханам!» (16+)
**2.20** Серыял «Бязмоўны сведка» (16+).
**4.45** Скетч-шоу «6 кадраў» (16+).

### Культура

**6.30** «Лета Гасподняе». Праабражэнне.
**7.00** «Прадукт нашых продкаў». Дак. серыял.
**7.45** «Марк Бернэс: Я раскажу вам песню...» Дак. фільм.
**8.25** «Знішчальнікі». Маст. фільм.
**10.00, 15.00, 19.30, 23.15** Навіны культуры.
**10.15** «Гісторыя кінаначальнікаў, або Будаўнікі і перабудоўшчыкі. 60-я гады». Дак. серыял. 1-я серыя.
**11.00** «Сіта і Рама». Серыял.
**12.55** Да 100-годдзя з дня нараджэння Віктара Мяржанава. «Узыходжанне». Дак. фільм.
**13.35** Раман у камяні. «Германія. Замак Разенштайн». Дак. фільм.
**14.05** «Лінія жыцця». Вера Алентава.
**15.10** Тэатр на экране. Спектакль Малога тэатра «Уяўны хворы». Запіс 2006 года.
**17.30** «Самы наўмысны музей». Дак. фільм.
**18.25, 2.40** «Першая ў свеце». Дак. серыял.
**18.40, 0.20** Расійскія майстры выканальніцкага мастацтва. Дзмітрый Маслееў.
**19.45** «Пісьмы з правінцыі». Петрапаўлаўск-Камчацкі.
**20.15** «Добрай ночы, малыя!»
**20.30** Прыступкі цывілізацыі. «Людзі і камяні эпохі неаліту». Дак. фільм.
**21.25** «Маналог у 4-х частках. Аляксандр Калягін». Частка 1-я.
**21.55** «МУР. 1944». Серыял. 13-я серыя.
**22.45** Сустрэча на вяршыні. «Гульні розуму з Таццянай Чарнігаўскай».
**23.35** «Усё пачалося ў Харбіне». Серыял.
**1.05** «Нататкі экспедытара Тайнай канцылярыі». Серыял.

### Настальгія

**6.00** Маст. фільм «Волга-Волга» (12+).
**7.35, 12.55, 14.35, 17.35, 20.25, 21.45, 22.55, 0.40, 1.45, 3.45, 5.00** Музычная настальгія (12+).
**7.50** «Мы вас любім!» Канцэрт гурта «Воскресенье». 1994 год (12+).
**9.00** «Быў час». 2009 год (16+).
**10.00** Канцэрт гуртоў «Машина времени» і «Цветы». 2010 год (12+).
**11.05** «Галіна Вішнеўская ў «Астанкіна». Фільм-канцэрт. 1993 год (12+).
**12.05, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**13.10** «Вакол смеху». «Інстытут гумару». «Дзень адчыненых дзвярэй». 1982 год (12+).
**15.00** «Мільянерка». Фільм-спектакль. 1974 год (16+).
**18.00** «СеўАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Бітлз». 2005 год (18+).
**19.05** Фільм-канцэрт «Рок». 1987 год (16+).
**21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**0.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1977-ы. 2-я частка. 2009 год (12+).
**0.50** «Тэатральныя сустрэчы». «Непрыдуманыя гісторыі. Смешныя выпадак». 1992 год (12+).

### EuroSport 1

**1.05** Ралі. ERC.
**1.35** Лёгкая атлетыка. Камандны чэмпіянат Еўропы.
**2.30** Снукер. International Championship. Фінал.
**4.00** Веласпорт. «Вуэльта»-2018.
**5.00, 11.30** Веласпорт. «Тур Юты».
**6.00, 9.30** Тэніс. US Open-2018. Мужчыны. Фінал.
**7.00, 13.00** Тэніс. US Open-2018. Жанчыны. Фінал.
**8.00, 14.30** Веласпорт. Binckbank tour.
**15.45** Тэніс. «Ралан Гарос».
**16.45** Тэніс. US Open-2018.
**17.55, 20.00, 23.00** Тэніс. US Open. Кваліфікацыя.

### Кінакамедыя

**0.30** Асаблівасці нацыянальнага палявання (16+).
**2.10** Асаблівасці нацыянальнай рыбалкі (16+).
**4.00, 23.15** 100 рэчаў і нічога лішняга (18+).
**6.05** З 5 да 7. Час палюбоўнікаў (18+).
**7.55** SuperПерцы (16+).
**10.10** Робін Гуд: мужчыны ў трыко (12+).
**12.10** Дзюплекс (12+).
**13.50** З 13 у 30 (12+).
**15.45** Сцерва (16+).
**17.40** Прывітанне, Біл! (18+)
**19.30** Сакавіцкія каты (16+).
**21.20** Халасцякі ў адрыве (16+).

### ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**7.55** «М & S» (12+).
**8.25** Калекцыя «Беларусьфільма». «Дзяржаўная граніца». Маст. фільм (12+).
**10.45** «Перыскоп» (16+).
**11.05, 4.15** «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).
**12.45** «Асцярожна, махляры!» (16+)
**13.20** «Без падману» (16+).
**14.15** «Мой любімы прывід». Маст. фільм (12+).
**16.05, 23.15** «Нераскрытыя тайны» (12+).
**16.45** «Мой герой» (12+).
**17.35** «Развітанне» (16+).
**18.35** «Ларыса Лужына. «За ўсё трэба плаціць...» Дак. фільм (12+).
**19.30, 2.45** «Куля-дура». Серыял (16+).
**21.25** «Пад купалам». Серыял (16+).
**0.10** «Звышнатуральнае». Серыял (16+).
**0.55** «Жаніх напракат». Меладрама (16+).
**5.05** «Часова даступны» (12+).

### ТБ1000

**6.10, 17.50** Ганна Карэніна (16+).
**8.35** Асцярожна, дзверы зачыняюцца! (16+)
**10.20** Разня (16+).
**11.50** Брудныя танцы-2: гаванскія ночы (16+).
**13.25** Легенда Зора (16+).
**15.50** Вобласці цемры (16+).
**20.15** Госця (16+).
**22.30** Ла-Ла Лэнд (16+).
**0.50** Мабільнік (18+).
**2.30** Малавіта (16+).
**4.20** Голас монстра (16+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**7.45** Населены востраў (12+).
**10.05** Нягоднік (16+).
**11.50** Абаронцы (12+).
**13.30, 14.25** Вы ўсе мяне прыводзіце ў шаленства (16+).
**15.30** Тэсты для сапраўдных мужчын (16+).
**16.55** Гусі-лебедзі (6+).
**17.15** Яраслаў. Тысячу гадоў таму (16+).
**19.10** Ёлкі новыя (6+).
**20.45, 5.30** Івановы (12+).
**22.30** Пра што гавораць мужчыны (16+).
**0.15** Цёмны свет (16+).
**2.15** Тэлі і Толі (12+).
**3.45** Каханне ў вялікім горадзе-2 (16+).

### National Geographic

**6.00** Зона будаўніцтва (16+).
**6.25** Унутры неверагодней механікі (16+).
**7.10, 12.50, 19.45** Панарама 360 (16+).
**8.00** Каралі рыбалкі (16+).
**9.35** Асушыць акіян (16+).
**10.30** Шаша праз пекла (16+).
**11.15, 16.40, 20.30, 4.25** Аўта-SOS (16+).
**14.20** Сканучуючы час (16+).
**15.10, 21.15, 2.45** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**15.55** Міжнародны аэрапорт Дубай (16+).
**18.15, 22.05, 0.25, 3.35** Тайная гісторыя (16+).
**22.50** «Наркаман Гітлер» (16+).
**23.35** Ліхтугі за мяжой (16+).
**1.10** Уварванне на Зямлю (16+).
**2.00** Мяжа (16+).
**5.10** Зрабі або памры (16+).
**5.35** Навуковыя недарэчнасці (16+).

### Discovery

**8.00, 11.10, 14.50, 21.15** Як гэта зроблена? (12+)
**8.25, 18.30, 1.50** Голыя і напалоханыя XL (16+).
**9.20, 16.40, 22.10** Махінатары (12+).
**10.15, 17.35, 0.00, 4.35** Хуткія і гучныя (16+).
**12.05, 23.05** Склады (16+).
**13.00** Выжыць любой цаной (16+).
**13.55** Як гэта ўстроена? (16+)
**19.25, 7.10** Чыгунка Аляскі (12+).
**20.20, 5.30** Паляўнічыя на старызну (12+).
**0.55, 6.20** Выжыць разам (16+).
**3.40** Аперацыя «Выратаванне дома» (12+).

## Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 «Добрай раніцы, Беларусь!»
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 18.15, 23.40 «Зона Х» (16+).
9.10, 21.50 Серыял «След» (16+).
**10.50, 12.10, 18.35, 19.20 Серыял «Плюс Любоў» (16+).**
13.05 «Дзіцячы доктар».
**13.35 Серыял «Шлюб па завяшчанні. Вяртанне Сандры». Заключныя серыі (16+).**
**14.30, 15.25 Серыял «Шлюб па завяшчанні. Танцы на вуглях» (16+).**
15.15, 18.00 Навіны рэгіёна.
17.05 «Беларуская часінка».
21.00 «Панарама».
23.20 «Сфера інтарэсаў».
0.00 «Дзень спорту».

## Беларусь 2

7.00 «Уключайся!» (12+)
9.00, 18.00 «Тэлебарометр».
**9.05, 19.55 Серыял «Сляпая» (16+).**
10.00, 22.05 «Экстрасэнсы-дэтэктывы» (16+).
**11.00, 18.05 Серыял «Опер па выкліку» (16+).**
**12.50, 23.05 Серыял «Жаночы доктар-2» (16+).**
13.50 «ЖаннаПажані» (16+).
14.50 М/с «Пінгвіны з Мадагаскара» (0+).
15.40 «Нічога сабе ньюз» (12+).
15.45, 23.55 «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект (12+).
**16.35 Серыял «Стаматолаг» (16+).**
17.25 «Калі мы дома». Скетчкам (16+).
20.55 «Трэці лішні» (16+) [СЦ].
22.00 «Спортлато 6 з 49», КЕНО.

## Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35, 12.25 «Беларуская кухня». Клёцкі па-карэйскую.
8.05, 12.00, 20.15 Навіны культуры.
8.25, 12.20, 20.35 «Гэты дзень».
**8.30, 17.55 «Гэтыя вочы насупраць». Маст. фільм (16+).**
**9.25, 16.40 «Цені знікаюць апоўдні». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
10.40 «Майстэрня. Гісторыя аднаго мастака». Аляксандр Грышкевіч.
11.05 «Белавежская пушча». Дуб-патрыярх (6+).
11.20, 21.05 «Легенды кіно». Анатоль Папанаў (12+).
12.55 «Гарады Беларусі». Ліда.
13.20 «Дзённікі беларускага падполля». Гродна (12+) [СЦ].
13.45, 18.55 «Стаўка». «Перамога» (12+).
**14.25, 21.40 «МУР». Маст. фільм (16+).**
15.10 «Спявае Беларусь».
16.00 «Люблю і памятаю». Рэжысёр Уладзімір Бычкоў.
19.30 «Камертон». Заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Тамара Міронава.
20.00 «Архітэктура Беларусі».
20.40 «Калыханка» (0+).
22.25 «Арт-гісторыі». Май Вольфавіч Данцыг. «На крылах Мая, ці Убачыць горад з вышыні птушынага палёту».
22.55 «Вялікія мастакі». Рэмбрант (12+).

## Беларусь 5

7.00, 9.40, 0.05 Спорт-мікс.
7.10 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Плэй-оф.
9.10 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Плэй-оф. Дзённік гульнявога дня.
9.50, 15.50, 22.00 Веславанне на байдарках і каноэ. Чэмпіянат свету.
14.00 Тэніс. WTA.
19.15 Змешаныя адзінаборствы. UFC.
21.20 Авертайм.
21.50 Спорт-цэнтр.

## АНТ

6.00, 7.05, 8.05 «Наша раніца».
7.00 (з субцітрамі), 8.00 (з субцітрамі), 9.00 (з субцітрамі), 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 (з субцітрамі), 20.30 Нашы навіны.
9.10 «Тэорыя змовы» (16+).
9.55 «Жыць здарова!» (16+)
**11.10 Серыял «А ў нас у двары» (12+).**
12.05 «Модны прыгавор» (6+).
**13.10 Серыял «Простае жыццё» (12+).**
15.00 «Давай пажэнімся!» (16+)
16.20, 0.30 «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
17.25, 18.20 «На самай справе» (16+).
18.50 «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
18.55 «Няхай гавораць» (16+).
20.00 «Час».
21.10 «Маркаў. Нічога асабістага» (16+).
**21.40 Серыял «Суччына вайна» (16+).**
**23.35 Серыял «Бяссонніца» (16+).**

## СТБ

5.35, 22.05 «Глядзець усім!» (16+)
6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 Навіны «24 гадзіны».
6.10, 20.15 «Міншчына».
6.20, 7.40 «Раніца. Студыя добрага настрою» (6+).
9.05 «Анфас».
9.25, 23.00 «Загадкі чалавецтва» (16+).
**10.40 «Саша + Даша + Глаша». Серыял (16+).**
12.20 «Вадзіць па-руску» (16+).
12.40, 21.20, 23.45 «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
13.45, 20.30 «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
14.40, 1.00 «Ежа багоў» (16+).
15.35 «Вадзіць па-руску» (16+).
**15.45, 16.50 «Мяжа». Серыял (16+).**
20.00, 22.55 «СТБ-спорт».
20.05 «Сталічныя падрабязнасці».

## МІР

6.00, 20.40, 22.45, 0.10, 3.15 **Серыял «Закон і парадак» (16+).**
**7.50, 10.10 Серыял «Кодэкс гонару» (16+).**
10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 0.00 Навіны (бягучы радок).
13.15 «Зала суда. Бітва за грошы» (16+).
14.10, 1.20 «Справы сямейныя. Бітва за будучыню» (16+).
15.05, 2.05 «Справы сямейныя. Новыя гісторыі» (16+).
16.15, 0.55 «Такому мама не навучыць» (12+).
**17.20, 19.20 Серыял «Вяртанне Мухтара-2» (16+).**
19.55 «Гульня ў кіно» (12+).
2.50 «Наша кіно. Гісторыя вялікага кахання» (12+).

## РТР—Беларусь

7.00 «Раніца Расіі».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.25 «Пра самае галоўнае». Ток-шоу (12+).
12.35 «Лёс чалавека» (12+).
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
14.30, 23.10 «Хто супраць?» Ток-шоу.
17.25 «60 хвілін». Ток-шоу.
18.35 «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
**20.40 Серыял «Пагоня за мінулым» (12+).**
**0.55 Серыял «Фальшывая нота» (12+).**

## НТБ—Беларусь

6.00 «Астрапрагноз».
6.05, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
6.10 «За гранню» (16+).
6.25 «Рэальны свет» (12+).
**7.10, 8.05 Серыял «Мухтар. Новы след» (16+).**
**8.50, 10.20 Серыял «Адвакат» (16+).**
9.40, 23.00 «НЗ.by».
**11.15 Серыял «Ляснік» (16+).**
13.25 Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05, 16.30 Серыял «Мянтоўскія войны» (16+).**
**17.25, 19.50 Серыял «Павуцінне» (16+).**
19.40 Сёння. Галоўнае.
**21.05 Серыял «Пёс» (16+).**
**23.25 Серыял «Сведкі» (16+).**

## 8 канал

7.00, 15.55, 18.25, 21.05, 0.25 «Надвор'е» + «Эрана».
7.05, 16.05 «Мультпарад». «Цімон і Пумба».
**7.30 Дэтэктыў «Шпіён, які мяне кінуў».**
**9.30, 18.30 Серыял «Без тэрміну даўнасці» (16+).**
10.35, 16.00 «Гумарынка».
10.40 Дак. фільм «Дарога ў школу» (0+).
**11.10 Прыгоды «Легенда Зора» (6+).**
**13.20, 19.20 Серыял «Мар'ін гай» (16+).**
**14.50 Серыял «Нябесны замак».**
**16.15 Драма «Камандзір шчаслівага «Шчупака» (16+).**
17.50 «Фэшн is my прафэшн».
18.00 «Гатуй як шэф» (12+).
19.15 «Рэальны бізнес».
20.50 «Вечарніца» (0+).
**21.10 Фантастыка «Галодныя гульні. І ўспыхне полымя» (12+).**
**23.35 Серыял «Бульварныя жахі» (16+).**

## ВТБ

6.05 «Лаві момант» (16+).
7.00 «Дурні і дарогі» (16+).
8.20 «Ералаш» (6+).
8.30 М/ф «Цімон і Пумба» (0+).
9.05, 18.00 «Уважаныя і шчаслівыя людзі» (16+).
11.00 Серыял «Вы ўсе мяне прыводзіце ў шаленства» (16+).
12.05, 0.50 Серыял «Вароніны» (12+).
13.40, 3.20 Скетч-шоу «Адна за ўсіх» (16+).
14.30 Мюзікл «Бурлеск» (12+).
16.55, 23.55 «Уральскія пельмені» (16+).
20.00 Серыял «Два бацькі і два сыны» (16+).
22.00 Баявік «Брыльянтавы паліцэйскі» (16+).
2.05 Серыял «Бязмоўны сведка» (16+).
4.30 Скетч-шоу «6 кадраў» (16+).

## Культура

6.30 «Пешшу...» Масква пісьменніцкая.
7.00 «Раскрываючы сакрэты кельцкіх грабніц». Дак. фільм.
8.00, 23.35 «Усё началося ў Харбіне». Серыял.
8.45 «Тэатральны летапіс». Сяргей Юрскі.
9.15, 21.55 «МУР. 1944». Серыял.
10.00, 15.00, 19.30, 23.15 Навіны культуры.
10.15 «Гісторыя кінаначальнікаў, або Будаўнікі і перабудоўшчыкі. 90-я гады». Дак. серыял.
11.00 «Сіта і Рама». Серыял.
12.35 «Паліглот». Італьянская з нуля за 16 гадзін! № 15.
13.20, 22.45 Сустрэча на вяршыні. «Гульні розуму з Тацццянай Чарнігаўскай».
13.50 «Пісьмы з правінцыі». Вёска Прысланіха (Ульянаўская вобласць).
14.15 «І Бог начуе паміж радкоў...» Дак. серыял.
15.10 Тэатр на экране. Спектакль Тэатра імя Яўг. Вахтангава «Дзядзькаў сон». Запіс 2001 года.
18.15 «Першыя ў свеце». Дак. серыял.
18.30 Расійскія майстры выканальніцкага мастацтва. Венера Гімадзіева, Васіль Ладзюк, Агунда Кулаева і Аляксей Татарынцаў.
19.45 «Пісьмы з правінцыі». Ізборск (Пскоўская вобласць).
20.15 «Добрай ночы, малыя!»
20.30 Прыступкі цывілізацыі. «Страчаныя плямёны чалавецтва». Дак. фільм.
21.25 «Маналог у 4-х частках. Аляксандр Калягін».
0.20 «Кінескоп». 67-ы Міжнародны кінафестываль у Лакарна.
1.00 «Нататкі экспедытара Тайнай канцылярыі». Серыял.
2.30 Раман у камяні. «Партугалія. Замак слёз». Дак. фільм.

## Настальгія

6.00 «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «ДКНЗ: апошнія «дзекабрысты» Вялікай Імперыі». 2005 год (16+).
6.50, 7.45, 8.40, 9.45, 10.55, 15.45, 16.55, 19.05, 20.45, 21.45, 22.55, 2.25, 3.45, 5.00 Музычная настальгія (12+).
7.10 «Няма праблем?!» 1991 год (12+).
8.00 «Аншлаг». 1983 год (12+).
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
10.00, 16.00, 22.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР» (12+).
12.00 «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. 2007 год (12+).
12.55 Тэлеспектакль «Ноч памылак». 1984 год (16+).
18.05 «Ялловая субмарына» з Аляксандрам Ліпніцкім. «Машина времени». 1-я частка: «Віно з дзьмухаўцоў». 2019 год (16+).
19.20 Дак. фільм «Вельмі вас усіх люблю» (16+).
0.00 «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Бітлз». 2005 год (18+).
1.05 Фільм-канцэрт «Рок». 1987 год (16+).

## EuroSport 1

0.00, 6.00, 9.30, 16.30, 20.00, 23.00 Тэніс. US Open. Кваліфікацыя.
4.00 Веласпорт. Арктычная гонка Нарвегіі.
5.00, 13.30 Веласпорт. «Джыра-д'Італія».
8.00, 14.30 Веласпорт. «Тур дэ Франс».
9.00 Алімпійскія гульні. «Сіла асобы».
11.30 Алімпійскія гульні. «Жывыя легенды».
12.00 Гольф. PGA Tour. The BMW Championship.
13.00 Ралі. ERC. All Access.
15.30 Веласпорт. «Вуэльта»-2018.

## Кінакамедыя

0.35 Ушчэнт (16+).
2.40 Любоў-маркоў пафранцузску (18+).
4.25 Эйр Амерыка (16+).
6.35 Халасцякі ў адрыве (16+).
8.30 З 13 у 30 (12+).
10.25 Дзюплекс (12+).
12.05 Неверагодныя прыгоды Факіра (16+).
13.55 Вялікі салдат (16+).
15.50 Кароль вечарынак (16+).
17.35 Сцерва (16+).
19.30 Дзяжурны тата (6+).
21.20 Усе пары робяць гэта (16+).
23.10 Вельмі страшнае кіно-2 (16+).

## ТБ3

6.00 М/ф (6+).
7.15 «Школа доктара Камароўскага» (6+).
7.45 «Доктар I...» (16+)
8.15, 19.05, 3.30 «Справа суддзі Карэлінай». Серыял (12+).
10.00, 23.45 «Улегцы» (12+).
10.30, 14.50, 5.10 «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).
12.10, 17.55 «Варажбітка» (12+).
13.45, 16.50 «Містычныя гісторыі» (12+).
15.55 «Натуральны адбор» (12+).
21.05 «Пад купалам». Серыял (16+).
22.55 «Знак якасці» (16+).
0.15 «Звышнатуральнае». Серыял (16+).
1.00 «Гангстар». Драма (18+).

## ТБ1000

6.10 Трыстан і Ізольда (12+).
8.40 Сямейка Крудс (6+).
10.40 Белфягор — прывід Луўра (12+).
12.30 Абяцанне (16+).
15.05 Людзі ў чорным-2 (12+).
16.45 Асцярожна, дзверы зачыняюцца! (16+)
18.35 Брудныя танцы-2: гаванскія ночы (16+).
20.10 Елізавета (16+).
22.25 Даруй, хачу з табой ажаніцца (12+).
0.25 Бандыты (16+).
2.35 Голас з каменя (18+).
4.05 Ла-Ла Лэнд (16+).

## ТБ1000 Рускае кіно

7.10 Сведкі (16+).
9.20 Пра што гавораць мужчыны. Працяг (16+).
11.15 Чорная вада (16+).
13.30, 14.25 Вы ўсе мяне прыводзіце ў шаленства (16+).
14.55 Нягоднік (16+).
16.40 Насельны вострaў (12+).
18.55 Нявеста любой цаной (16+).
20.45, 5.30 Памяць восені (16+).
22.35 Паляўнічы-1. Чалавек з мінулага (16+).
0.30 Івановы (12+).
2.20 Пра што гавораць мужчыны (16+).
4.00 Ёлкі новыя (6+).

## National Geographic

6.00 Зона будаўніцтва (16+).
6.25 Інжынерныя ідэі (16+).
7.15, 13.35 Суперзбудаванні (16+).
8.05 Карялі рыбалкі (16+).
9.40 Інстынкт выжывання (16+).
10.25 Карялі шахт (16+).
11.10, 15.10, 16.40, 21.15, 0.25, 2.45 Расследаванні авіякатастроф (16+).
12.45 Афрыканскі мегапералёт (16+).
14.20 Мегазаводы (16+).
15.55 Міжнародны аэрапорт Дубай (16+).
19.45 Панарама 360 (16+).
20.30, 4.20 Аўта-SOS (16+).
22.50 Ліхтугі за мяжой (16+).
1.10 Уварванне на Зямлю (16+).
2.00 Мяжа (16+).
5.10 Зрабі або памры (16+).
5.35 Навуковыя недарэчнасці (16+).

## Discovery

8.00, 11.10, 15.45, 21.15 Як гэта зроблена? (12+)
8.25, 18.30, 1.50 Голыя і напалоханыя XL (16+).
9.20, 16.40, 22.10 Махінатары (12+).
10.15, 17.35, 4.35 Хуткія і гучныя (16+).
12.05, 23.05 Склады (16+).
13.00 Лабараторыя вybуховых ідэй (16+).
19.25, 7.10 Чыгунка Аляскі (12+).
20.20, 5.30 Паляўнічыя на старызну (12+).
0.00 Выжыць любой цаной (16+).
0.55, 6.20 Выжыць разам (16+).
2.45 У пагоні за класікай (12+).
3.40 НАСА: невытлумачальныя матэрыялы (12+).

# ПРАБУКСОЎКА

## Дзе «губляюцца» работнікі для АПК?

І вопыт ужо паспеў напрацаваць, добра ведае свой статак. Але за год армейскай службы многае можна забыць, кажа Сяргей. І нават разглядае альтэрнатыўную сітуацыю — наогул пайсці ў армію кантрактнікам. Тады і адпрацоўка не патрэбна. А прэферэнцый таксама нямала...

Шкада, што лёс маладых спецыялістаў падпадае пад міжведамасныя «жорны» і даволі моцна б'е па кадравым патэнцыяле сельскай гаспадаркі.

### Алё! Шукаем кадры!

Здаецца, што выраз «кадравы голад» устойліва замацаваўся за сельскай гаспадаркай. І тэндэнцыі да паляпшэння не назіраецца. Куды знікаюць маладыя кадры і як іх затрымаць? На гэту тэму гутарым са **старшынёй СВК «Ніва–2003» Гродзенскага раёна Русланам ГАМАНЧУКОМ.** На яго думку, адток студэнтаў падчас вучобы — гэта не страта, бо спецыялістаў з іх усё роўна не атрымалася б. І добра, што яны гэта зразумелі ў працэсе вучобы. Значна горш, калі такое рашэнне прымаюць спецыялісты з дыпломам. У гаспадарцы «Ніва-2003» зараз тры «мэтавікі» — ветэрынарны ўрач, аграном, інжынер па сельгасмашынах. Але двое з іх служаць у арміі, а значыць, іх трэба некаму замяняць. Ці ўсе яны вернуцца назад — таксама вялікае пытанне. Былі маладыя спецыялісты ў бухгалтэрыі, адпрацавалі два гады — і пайшлі. Прытым што адна з іх мясцовая дзяўчына, якая цяпер ездзіць на работу ў Гродна за 30 кіламетраў.

Як вырашыць праблему кадраў? Кіраўнік, здаецца, і сам у роспачы. Калі раней гэту праблему вырашалі з дапамогай жылля, цяпер і гэты стымул не асабліва трымае. У гаспадарцы, напрыклад, ёсць і трохпакаёвая кватэра, і дом сядзібнага тыпу, але няма каго туды пасяляць. Руслан Яўгенавіч нават спрабаваў перацягнуць да сябе спецыяліста з суседняга раёна. «І ведаеце, што ён мне адказаў? Кажа, ты будзеш шмат патрабаваць ад мяне. У вас там трэба напружана працаваць, а тут у мяне менш клопатаў. І гэта прытым што я прапаную ў два разы павялічыць зарплату!», — адзначае кіраўнік гаспадаркі. <u>Такім чынам, матэрыяльны стымул перастае быць матывацыяй для маладога спецыяліста ў аграпрамысловым комплексе. Іх больш усяго палохае</u>



У чаканні заатэхнікаў і ветэрынараў...

<u>і не задавальняе работа «на знос», цяжкія ўмовы працы.</u> Асабліва, калі нехта звальняецца. Тады яго абавязкі кладуцца на іншых спецыялістаў, у тым ліку і маладых.

— Мы гатовы даць мэтавае накіраванне і плаціць стыпендыю, але ахвотных мала, — рэзюмуе Руслан Гаманчук. — Такую прапанову, дарэчы, я агучыў выпускнікам нашай мясцовай школы. Але нават вясковыя дзеці не хочуць ісці ў сельскую гаспадарку. З 11 выпускнікоў толькі адзін узяў такое накіраванне і паступіў сёлета ў аграрны ўніверсітэт.

Між тым нельга сказаць, што ў аграрны ўніверсітэт няма конкурсу. Быў ён і сёлета падчас уступнай кампаніі. Праўда, невысокі — 1,4 чалавека на месца. Найбольш папулярныя спецыяльнасці інжынерна-тэхналагічнага факультэта — «тэхналогія хлебапякарнай, макароннай, кандытарскай вытворчасці», «тэхналогія мяса і мясных прадуктаў», эканамічны профіль. Але гэта спецыяльнасці, як бачым, у асноўным для перапрацоўчай галіны.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

**Аляксандр ШЫШКО, старшыня СВК «Азёры» Гродзенскага раёна, дэпутат абласнога Савета дэпутатаў, член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі:**

— Моладзь не імкнецца ісці ў сельскую гаспадарку, бо гэта вельмі цяжкая праца. Здаўна так было. Дэфіцыт кадраў звязаны і з памяншэннем сельскага насельніцтва. Раней школы ў вёсцы былі запоўненыя, а цяпер многія ўжо закрытыя.

Са свайго боку, кіраўнікі гаспадарак ствараюць усе ўмовы для сваіх работнікаў, у першую чаргу, для маладых спецыялістаў. Але і гэта ўжо не працуе. Адзінае выйсце — павелічэнне прадукцыйнасці працы, высокатэхналагічная тэхніка, аўтаматызацыя вытворчых працэсаў. І гэта сусветная тэндэнцыя. Важны крок у гэтым кірунку зроблены. Пабудаваны новыя фермы, развіваецца жывёлагадоўля. Але ёсць значны рэзерв для мадэрнізацыі, і яго трэба актыўна прымяняць. Больш накіроўваць сродкаў на сельскую гаспадарку, якая была і застанецца галоўнай стратэгічнай галіной краіны.

# ХАЧУ Ў КАЛГАС! І КРОПКА

**Думаеце, так не бывае? Ну і дарма. У СВК «Калгас «Радзіма», што ў Бялыніцкім раёне, 30 % работнікаў маладыя людзі да 35 гадоў. Нават пасля арміі не затрымліваюцца дома. Напрыклад, з Іванам Рагаўцовым, які месяц таму звольніўся са службы ў пагранвойсках, я пазнаёмілася непасрэдна на калгасным полі. Малады хлопец назірае за супрацьпажарнай абстаноўкай на ЗІЛе–130, які спецыяльна абсталяваны пад гэтыя мэты. «А што дома без справы сядзець, — паціскае ён плячыма. — Сумна ды і нявыгадна. А тут грошы неблагія плацяць».**

— Ужо сёлета да нас прыбыло некалькі выпускнікоў Клімавіцкага аграрнага каледжа, яшчэ некалькі студэнтаў Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі (БДСГА) праходзяць у нас практыку, — расказвае пра абстаноўку з маладымі спецыялістамі **намеснік старшыні СВК Міхаіл СКУСАЎ.** — Вострага кадравага дэфіцыту няма, хоць можам разглядзець кандыдатуры ветурачоў і заатэхнікаў, якраз у ліпені ўвялі ў строй новую ферму. Да нас прыходзяць у асноўным сяльчане, якія не баяцца працаваць і ведаюць, што тут створаны ўсе ўмовы для гэтага. У нашай гаспадарцы ўвогуле шмат дынастый працуе, прычым нават у чацвёртым пакаленні!

На мехдвары знаёмлюся яшчэ з адным маладым спецыялістам. Дзмітрый Журыкаў ужо адпрацаваў у калгасе неабходныя два гады пасля заканчэння БДСГА, але звальняцца не збіраецца. Ён загадчык рамонтнай майстэрні, і на яго адказнасці ўся калгасная тэхніка.

— Сам я родам з Бялыніч, гаспадарку выбіраў мэтанакіравана, — прызнаецца хлопец. — Калгас заможны, усё ёсць. Работа падабаецца, і зарплата годная. А яшчэ вельмі добры калектыў і шмат моладзі.

Гаспадарка, у сваю чаргу, мае ўсе падставы ганарыцца сваім работнікам. Не ведаю як у іншы час, але ў гэты панядзелак ніводнай няспраўнай машыны ў калгасе не было. І гэта, што знамянальна, у самы разгар жніва.

— Наш кіраўнік Аляксандр Лапацентаў ужо 38 гадоў узначальвае гаспадарку, — кажа Міхаіл Скусаў. — І калектыў падбірае з такіх жа нераўнадушных, як і сам. У маладога спецыяліста перш за ўсё цікавіцца, ці адданы ён прафесіі?

Сяргею Ванцэвічу, які загадвае машынным дваром, усяго 27 гадоў. Пяць з іх ён працуе ў гаспадарцы. На яго адказнасці каля 500 адзінак тэхнікі, і нічога — спраўляецца.

— Прыйшоў у калгас пасля размеркавання з Беларускага агратэхнічнага ўніверсітэта (БАТУ), — расказвае ён. — Сам родам з Віцебскай вобласці і пра калгас «Радзіма» ніколі раней не чуў. Пры размеркаванні ва ўніверсітэце ішоў 62-м. Гляну ў на спіс з назвамі калгасаў, што ляжаў перада мной, і тыкнуў пальцам наўгад, — нават і не здагадваўся, што так пашчасціць. Мяне тут усё задавальняе. Ажаніўся з тутэйшай дзяўчынай, калгас дом даў, жывём, выхоўваем сына. Малому хутка ўжо два гады споўніцца. На вяселле гаспадарка падарыла пральную машыну. Акрамя зарплаты, існуе шэраг даплат. За тое, што, напрыклад, не куру, дадаюць 10 %. Дагэтуль смаліў, а, калі стаў тут працаваць, забыўся пра цыгарэту. За ўдзел у культурным жыцці даплачваюць яшчэ 10 %. Нават за тое, што малады, існуе даплата. Плюс да свят выдаюць прадуктовыя пакеты. А яшчэ запрашаюць на экскурсіі. Нядаўна, напрыклад, ездзілі ў Гродна. А некалькі гадоў таму па выніках працы за год быў прэміраваны паездкай за мяжу. Ездзіў з калегамі па гаспадарцы адпачываць у Феадосію. Жылі там на поўным забеспячэнні.





Сяргей ВАНЦЭВІЧ (злева) і Дзмітрый ЖУРЫКАЎ працуюць у калгасе з задавальненнем.

**Алена АЎРАМЁНАК, галоўны эканаміст СВК «Калгас «Радзіма»**, прадстаўляе ўжо трэцяе пакаленне па лініі бацькі. Дзяўчына ведала, што гаспадарка добрая, і пасля школы ўпэўнена падала дакументы ў БДСГА. Працуе ў гаспадарцы 16 гадоў.

— Ды такіх, як я, у нас больш чым хапае, — усміхаецца маладая жанчына. — Дынастый шмат. Аляксандр і Ганна Казаковы, напрыклад. Іх бацькі тут працавалі, і яны ўслед за імі прыйшлі. Або Міхаіл Канцавы, наш кіроўца — у яго тут бацька і дзед адзначыліся.

Гнуткая сістэма аплаты дазваляе не толькі забяспечваць работніку годнае існаванне, але і стымуляваць актыўнасць. Па 10 % даплачваюць за ўдзел у мастацкай дзейнасці, спорце, нават за паспяховую вучобу дзяцей у школе. Калі ў дзённіку толькі добра і выдатна, трымайце, маці і бацька, па 10 % да заробку. Калі дзіця наогул выдатнік, трымайце яшчэ 10 % да першых 10. Дзеці таксама не пакрыўджаны. За добрыя і выдатныя адзнакі гаспадарка ім раз у чвэрць выплачвае стыпендыю ад 35 да 107 рублёў.

> Не крыўдзяць тут і маладых спецыялістаў. Тым, хто прыбыў па размеркаванні, выплачваюць пад'ёмныя і на два гады вызваляюць ад аплаты за камунальныя паслугі. Тых, у каго няма жылля, селяць у інтэрнат. Калі два гады адпрацаваў без парушэнняў і застаўся працаваць, атрымліваеш правa на пазыку ў памеры 2,5 тысячы рублёў.

Яшчэ больш выгадна працаваць у гаспадарцы разам з жонкай або мужам. Па 2,5 тысячы атрымае і адзін, і другі. Плюс дадаецца права яшчэ пяць гадоў не плаціць за камуналку. А калі за гэты час не будзе парушэнняў, то і пазыку не прыйдзецца вяртаць. Наадварот, можна браць яшчэ адну. Наогул, чым больш членаў сям'і працуе ў гаспадарцы, тым больш ільгот. Напрыклад, некалькі разоў у год бясплатна выдаецца зерне, ёсць магчымасць — таксама бясплатна — карыстацца калгасным транспартам. Сямейным выдзяляюць дом, і калі 10 гадоў адпрацаваў у гаспадарцы, атрымліваеш права яго выкупіць.



Аграгарадок Вішоў — цэнтральная сядзіба гаспадаркі.

СВК «Калгас «Радзіма» — гаспадарка вялікая, ёсць дзе прыкласці свае веды і павучыцца чамусьці перадавому. У яе складзе функцыянуе 8 ферм аў. На абслугоўванні — каля 10 тысяч гектараў зямлі, у тым ліку 7,8 тысячы ворнай. Сялянская праца цяжкая, таму калгас паклапаціўся, каб у яго работнікаў (а гэта на 90 % мясцовае насельніцтва) былі і амаль гарадскія ўмовы пражывання. За сродкі гаспадаркі ў аграгарадку Вішоў пабудаваны царква ў гонар Святых апосталаў Пятра і Паўла, амфітэатр, музей, закладзены сад міру. Летась на Дзень Незалежнасці ў населеным пункце адкрылася алея Славы.

— Праблема не ў тым, што нехта жадае ад нас «адкасіць», — дадае Міхаіл Скусаў. — Крыўдна за іншае — калі заатэхнік з вышэйшай адукацыяй не можа скласці для жывёлы рацыён кармлення. Калі б аграрныя ВНУ аддавалі перавагу дзецям з вёскі, хай нават троечнікам, было б больш карысці. Ад калгаса звычайна прабуюць «адкасіць» у асноўным гараджане, якія ідуць вучыцца ва ўстановы нашага профілю толькі дзеля таго, каб атрымаць дыплом.

**P.S.** Калі ўжо бегла на рэйсавы аўтобус, пазнаёмілася з жанчынай, якая гуляла па вуліцы з дзіцячай каляскай.

— Мы з мужам сюды з Магілёва пераехалі, — прызналася Наталля Радзькова. — І работа была добрая, і жыць было дзе. Але вельмі захацелася ў вёску. Прадалі магілёўскую кватэру і купілі тут, у доме каля храма. Ведаеце, мы 10 гадоў чакалі дзіця, але нічога не атрымлівалася. А тут зацяжарала. Веранічка ў нас ужо вішоўская. А працаўладкавацца ў калгас «Радзіма» не так проста. Гаспадарка перадавая. Муж спрабаваў, але з першага разу не атрымалася.

**Нэлі ЗІГУЛЯ,**
*Бялыніцкі раён.*
**Фота аўтара.**

ПРАБЛЕМЫ І РАШЭННІ

# ГАНДЛЯВАЦЬ У ВЁСЦЫ, ЯК У ГОРАДЗЕ

## Чаму сельская мясцовасць менш прыцягальная для інвестараў?

**За першае паўгоддзе 2019-га колькасць рознічных гандлёвых аб'ектаў у Беларусі павялічылася на 3 % і склала больш за 117 тысяч, іх плошча перавысіла 6,6 мільёна квадратных метраў. Акрамя таго, на плошчы 2 мільёны квадратаў працуюць 615 гандлёвых цэнтраў, што на 1,5 % больш у параўнанні з леташнім перыядам. У краіне налічваецца 388 рынкаў больш чым на 80 тысяч гандлёвых месцаў. Асаблівая ўвага аддаецца развіццю абслугоўвання сельскага насельніцтва.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— Сапраўды, па-ранейшаму актуальнае пытанне гандлёвага абслугоўвання ў малых гарадах і ў сельскіх населеных пунктах. На сяле сёння пражывае кожны пяты жыхар краіны, а гэта больш за два мільёны чалавек. Разам з тым сельская мясцовасць эканамічна менш прыцягальная. І не толькі для гандлю. У асобных рэгіёнах назіраецца тэндэнцыя зніжэння ўзроўню гандлёвага абслугоўвання. Асноўныя прычыны — змяншэнне колькасці насельніцтва, нізкая рэнтабельнасць продажу. Арганізацыі спажывецкай кааперацыі вымушаны закрываць магазіны ў пэўных населеных пунктах. Як правіла, гэта невялікія вёсачкі або тыя, дзе зніжаецца колькасць насельнікаў. У гэтым выпадку на змену стацыянарным пунктам прыходзяць аўтакрамы, — расказаў **першы намеснік міністра антыманапольнага рэгулявання і гандлю Артур КАРПОВІЧ.**

**Удзельная вага сельскіх магазінаў складае 14 %, а па гандлёвай плошчы — 12 %. За першае паўгоддзе іх колькасць зменшылася на 10 %, аб'ектаў грамадскага харчавання — на 1 %, а пасадачных месцаў у іх — амаль на 2 %. Практычна ж палова пунктаў грамадскага харчавання прадстаўлены сталовымі.**

Якія захады прымаюцца для паляпшэння сітуацыі? Па-першае, прыняты Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 22 верасня 2017 года № 345 «Аб развіцці гандлю, грамадскага харчавання і бытавога абслугоўвання». Гэты дакумент заклікаНы стварыць перадумовы для таго, каб бізнес актыўней ішоў у вёску. Нормамі ўказа з 1 студзеня 2018 года да 31 снежня 2022 года прадугледжаны шэраг падатковых ільгот, іншых прэферэнцый. Дзеянне дакумента на сённяшні дзень распаўсюджваецца практычна на 18 913 населеных пунктаў, 18 847 з іх аднесены да сельскай мясцовасці, і 66 — да малых гарадскіх паселішчаў.

Па інфармацыі Міністэрства па падатках і зборах, ільготамі, якія дае Указ № 345, у 2018-м скарысталася 1107 суб'ектаў гаспадарання: 272 юрыдычныя асобы і 835 індывідуальных прадпрымальнікаў. За мінулы год яны пералічылі ў бюджэт амаль 200 мільёнаў рублёў падаткаў і стварылі 189 новых рабочых месцаў.

На 1 ліпеня 2019-га адкрыта 388 гандлёвых аб'ектаў і 77 пунктаў грамадскага харчавання.

Колькасць аўтамагазінаў за гэты перыяд павялічылася на 75. І цяпер «парк на колах» налічвае 822 машыны, якія калясяць амаль што па 2000 маршрутаў.

— Паводле Указа Прэзідэнта № 227, з 1 жніўня 2018-га да 31 снежня 2022 года суб'ектам гандлюададзена права набываць, арандаваць у межах Аршанскага раёна Віцебскай вобласці дадатковую гандлёвую плошчу з улікам таго, што іх доля ў аб'ёме рознічнага гандлю перавысіла 20 %. У межах дзеяння ўказа пачалі функцыянаваць чатыры магазіны Еўрагандлю — па адным у Оршы і Барані, два ў гарадскім пасёлку Арэхаўск. На працягу 2019-га на тэрыторыі Аршанскага раёна прадугледжваецца пілотны праект па арганізацыі ўдасканаленай сістэмы дзяржаўных сацыяльных стандартаў па абслугоўванні насельніцтва, — канстатаваў Артур Карповіч. — Мы працягваем работу па развіцці гандлю і грамадскага харчавання шляхам стварэння і паляпшэння ўмоў для вядзення бізнесу ў названых сферах. У гэтых мэтах у міністэрстве створана спецыяльная рабочая група па ацэнцы дзеяння нормаў 345-га ўказа, а таксама яго ўдасканаленні. Ужо распрацаваны праект змяненняў і дапаўненняў у гэты ўказ. Сярод асноўных новаўвядзенняў варта адзначыць працяг тэрміну яго дзеяння з 2022 года да 2030-га ў плане льгот і прэферэнцый. Акрамя таго, прадугледжваецца асобны льготны тарыф на электрычную энергію для рознічных гандлёвых аб'ектаў і пунктаў грамадскага харчавання ў сельскай мясцовасці. Цяпер склалася наступная сітуацыя: арганізацыі, якія ажыццяўляюць гандаль на сяле, плацяць за электраэнергію больш, чым тыя, што аказваюць бытавыя паслугі. Акрамя таго, даецца права адчужаць і здаваць у арэнду аб'екты нерухомай маёмасці без наяўнасці дакументаў, якія пацвярджаюць дзяржаўную рэгістрацыю іх стварэння. Такую прапанову ўнёс Белспажыўсаюз. І мы пастараліся яе ўлічыць.

**Што датычыцца ў цэлым спажывецкага рынку, то яго можна ахарактарызаваць як адносна стабільны і збалансаваны. У гандлёвай сетцы ў наяўнасці шырокі асартымент тавараў — як харчовых, так і нехарчовых.**

Значна павялічыліся продажы рэчаў высокага цэнавага сегмента: новыя легкавыя аўтамабілі, бытавая тэхніка, верхняе адзенне, скураны абутак. А вось удзельная вага нехарчовых тавараў айчыннай вытворчасці ў рознічным таваразвароце знізілася. Як адзначыў першы намеснік міністра, гэта часткова сведчыць пра тое, што не ўсе беларускія тавары выйграюць канкурэнтную барацьбу. Аднак часам спажывец у пагоні за нізкай цаной забывае аб якасці набытага. Не заўсёды тое, што таннае, — даўгавечнае. Некаторыя тавары ў Беларусі наогул не выпускаюцца, і іх завозяць з-за межаў краіны. Напрыклад, шматаперацыйныя швейныя машыны, іанізатары і ўвільгатняльнікі паветра, электракавcomponentsаркі, кавамашыны, электраблэндары, аўтамабільныя відэарэгістратары, планшэты камп'ютарныя, ноўтбукі, радыётэлефоны, смартфоны, прынтары, сканеры, ксераксы і іншае. А гэта значная частка нашага імпарту. Ну, і адпаведна доля ў таваразвароце нехарчовых тавараў. Пакуль у недастатковым асартыменце выпускаецца элегантны абутак для жанчын, мужчын, асабліва моладзі, абутак для адпачынку і спорту як для дарослых, так і дзяцей, кеды, паўкеды. Міністэрства антыманапольнага рэгулявання штогод на аснове аналізу імпарту тавараў і маніторынгу продажу распрацоўвае пералік імпартазамяшчальных тавараў, якія прапануюцца для выпуску айчыннымі вытворцамі.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**


## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

**извещает о проведении аукциона**

| |
|---|
| ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 420/С-56857 (назначение — здание специализированное розничной торговли, наименование — здание магазина), площадью 189,9 кв. м, расположенное по адресу г. Лида, ул. Криничная, 1 с оборудованием: котел отопительный КСТБ-30, молниезащита, охранная сигнализация «Аларм 6», пожарная сигнализация Л606 СПИ «Молния», ванна моечная, емкость |
| Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый номер 423650100013001424, площадью 0,1668 га (назначение — для обслуживания магазина), находящемся по адресу: г. Лида, ул. Криничная, 1. Земельный участок имеет ограничения (обременения прав в использовании: земли, находящиеся в охранных зонах линий электропередачи, код — 6, площадью 0,0022 га |
| Начальная цена продажи — 137 950 р. (сто тридцать семь тысяч девятьсот пятьдесят рублей) с учетом НДС |
| Сумма задатка — 13795 р. (тринадцать тысяч семьсот девяносто пять рублей) |
| Продавец — Лидский филиал Гродненского областного потребительского общества, 231300, г. Лида, ул. Фурманова, 19, тел. 8-0154-549-297 |
| Организатор торгов — Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38 |
| Условия аукциона — аукцион без условий. Условия оплаты — по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи — не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона. |
| Номер р/с для перечисления задатка — BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Аукцион состоится 30 сентября 2019 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3-209** |
| **Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник — четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница) Последний день приема заявлений — 24 сентября 2019 г. до 15.00** |
| *Телефон для справок: 45-05-38, 41-98-32 — Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by/* |

**18 сентября 2019 г.** **ИЗВЕЩЕНИЕ** **№ 12-А/2019**

**о проведении открытого аукциона на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Гомеле**

| № лота | Адрес земельного участка: г. Гомель | Кадастровый номер участка | Площадь, га | Целевое назначение | Наличие ограничений | Срок аренды, лет | Начальная стоимость, руб. | Сумма задатка, руб. | Расходы на подготовку докум-ции, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Район индивидуальной жилой застройки Романовичи (участок № 169 по генплану) | 340100000008002396 | 0,0840 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | Охранная зона линий связи и радиофикации, зона санитарной охраны водопроводных сооружений | 99 | 5 779,20 | 200,00 | 2 689,14 |

1. Организатор аукциона — Коммунальное топографо-геодезическое унитарное предприятие «Гомельгеодезцентр» (далее — Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр»).
2. Аукцион проводится комиссией, созданной Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр», в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462. Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории осуществляется согласно техническим условиям, выданным эксплуатирующими и согласующими организациями на стадии производства проектно-изыскательских работ. Желающим предварительно ознакомиться с документами и характеристикой расположенных на участке инженерных коммуникаций, строений, сооружений, инженерно-технических условий необходимо обращаться в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр» (г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. № 3—6, № 3—14).
3. **Аукцион состоится 18 сентября 2019 г. в 14.30 в Гомельском городском исполнительном комитете по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, каб. 115,** при наличии не менее двух участников на каждый лот. Если заявление на участие подано только одним гражданином, юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем, право аренды земельного участка предоставляется этому лицу при его согласии с внесением платы за право аренды в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.
4. К участию в аукционе допускаются граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, подавшие в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр» в указанные в извещении сроки следующие документы: заявление по установленной форме; документ, подтверждающий внесение суммы задатка за каждый лот в размере, указанном в извещении с отметкой банка, на **р/с BY74 BAPB 3012 2030 8001 3000 0000 в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30, УНП 400230163, БИК BAPBBY2X. Получатель платежа — Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр». Наименование платежа — оплата задатка за участие в аукционе.** Кроме того, **НЕОБХОДИМО открыть текущий расчетный счет (с указанием транзитного счета) в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30 — для возврата задатка за участие в аукционе** (в случае непобеды на аукционных торгах) — это только для физических лиц. Индивидуальные предприниматели и юридические лица производят оплату задатка со своего расчетного счета.

Необходимые документы:
4.1 граждане — копию документа, содержащего их идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;
4.2 представители или уполномоченные должностные лица юридических лиц Республики Беларусь — доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;
4.3 идивидуальные предприниматели — копию свидетельства о государственной регистрации без нотариального засвидетельствования;
4.4 представители гражданина или индивидуального предпринимателя — нотариально удостоверенную доверенность;
4.5 представители или уполномоченные должностные лица иностранного юридического лица — легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;
4.6 представители иностранногогражданина — легализованную в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или другой кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык.
4.7 при подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность, и его копию.
5. **Кроме стоимости предмета аукциона и затрат на подготовку документации, победитель обязан возместить организатору торгов затраты на подготовку и проведение аукциона.** Оплата стоимости предмета аукциона и возмещение расходов, связанных с проведением аукциона, подготовкой документации осуществляется в установленном порядке в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона.
6. Гомельским городским исполнительным комитетом в установленном законодательством порядке может быть предоставлена рассрочка внесения оплаты стоимости предмета аукциона в соответствии с решением Гомельского городского исполнительного комитета от 04.02.2009 г. № 83 «Об утверждении Инструкции о порядке предоставления рассрочки по внесению платы за право заключения договоров аренды земельных участков или платы за земельные участки, предоставляемые в частную собственность».
7. **Заявления для участия в аукционных торгах принимаются Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр» с 17 августа по 16 сентября 2019 г. включительно. Дни приема: понедельник, среда, пятница с 08.00 до 16.30 (обед 12.00—13.00) по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. 3—6 и 3—14.**
Контактный телефон: +375 232 30 12 46. Информация размещена на сайте: www.gomeloblzem.by либо geodezcentr.by

А Ў НАС... А Ў ВАС?

# Дзе ўзяць грошы на дзіцячую пляцоўку?

## ...Як жыхары Краснаполля знаходзяць паразуменне са сваімі дэпутатамі



Цяпер у дзяцей ёсць занятак.

**Нядаўна ў шматлюдным мікраараёне райцэнтра — Машэраўскім — з'явілася дзіцячая гульнявая пляцоўка, грошы для якой часткова сабралі самі жыхары. Астатнюю суму дадала асацыяцыя мясцовых Саветаў дэпутатаў. Гэта адзін з першых прыкладаў таго, як добрую справу можна зрабіць без капейкі бюджэтных грошай.**

### Першы блін не камяком

Да сустрэчы з карэспандэнтам рэспубліканскай газеты жыхары мікрараёна падышлі творча. Некаторыя нават прыхапілі папяровыя шарыкі, як на свята. З суседніх дамоў падцягнуліся дарослыя з калясказмі. А дзяцей, ад года і больш, нават і клікаць не трэба было, яны тут з раніцы да самага вечара.

Горкі, арэлі, лесвічкі, пясочніца — цэлы гульнявы гарадок пасярод вялікага двара. Раней, кажуць, тут было няўтульна, праз усю пляцоўку цягнуліся вяроўкі для бялізны, дзеці не ведалі, дзе прытуліцца. Цяпер іншая справа. А пачалося ўсё з таго, што жыхары самі паставілі дэкаратыўную агароджу і пасадзілі кветнікі. Потым паступова сталі запаўняць дваровую прастору. Акрамя завадскога гульнявога абсталявання, з'явіліся драўляныя арэлі, якія змайстраваў прадпрымальнік Аляксей Варапаеў. А тутэйшы майстар па метале Аляксандр Васіленка разам з Віталіем Макарэвічам зрабілі яшчэ і металічныя арэлі. Дзеці зараз аж пішчаць ад захаплення.

Знаёмімся з Кацяй — маладой маці, якая прыйшла сюды з сынамі-двайнятамі Андрэем і Сашам.

— Для нас гэта пляцоўка вельмі важная. Мы і грошы здавалі, і самі гатовы былі зрабіць усё, каб яна хутчэй з'явілася, — кажа жанчына.

— Калі паставілі арэлі, дзеці стаялі ў чарзе, каб пакатацца. Столькі радасці было, словамі не перадаць! А вечарам малыя выносяць лялькі, расстаўляюць цацачную мэблю, і дамоў іх ужо не дакліцацца, — усміхаецца **Таццяна КРЫЖЭЎСКАЯ**. Яна, дарэчы, прадстаўніца мясцовага камітэта тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, асабіста заклікала жыхароў удзельнічаць у сумесным фінансаванні праекта.

— Усе ішлі насустрач, нават дзядулі з бабулямі, — кажа яна.— Мы і прыватны сектар абышлі, там таксама знайшліся людзі, якія адгукнуліся. Меней, чым пяць рублёў ніхто не даваў. Але асноўную суму, вядома, выдзелілі дэпутаты. Дзякуй ім за дапамогу. Гэта добра, калі народ і ўлада побач. За апошнія два гады мы вельмі зблізіліся.

— Нашы жыхары вельмі дружныя і актыўныя, выходзілі на суботнік без усякага там прымусу, — адзначае **Віталій МАКАРЭВІЧ**. — Працавалі ўсе разам, кожны стараўся сумленна, задавальненне атрымалі неверагоднае. Нават тыя, хто трымаўся паасобку, зараз у нашай камандзе. Галоўнае было пачаць, цяпер ужо ёсць ахвотныя працягнуць справу, падраўняць пляцоўку, пасадзіць кустоўе, вінаграднік — ідэі нараджаюцца адна за адной.

Звяртаю ўвагу на вялікі кветнік. Гэта справа рук сужэнцаў-пенсіянераў Жанны і Аляксандра Васіленкаў, якія ахвяравалі



Мару дапамаглі ажыццявіць дэпутаты (*другая злева* Анжаліка ГОМАН, *крайні справа* Віталій МАКАРЭВІЧ).

сваёй старой павеццю, каб можна было зрабіць такую прыгажосць. «Вельмі хацелася, каб з'явілася нешта карыснае», — кажа Жанна Мікалаеўна. Яе муж наогул майстар ад Бога. Побач з кветнікам паставіў лаўку ды яшчэ змайстраваў мудрагелістую металічную сметніцу... Па шматлікіх просьбах жыхароў у нашай прысутнасці ён дэманструе яшчэ і самаробную газонакасілку да матаблока. Адным словам, пашчасціла тутэйшым з суседам.

На гэтай жа пляцоўцы летась упершыню ў Краснаполлі прайшло свята двара. Дагэтуль такія мерапрыемствы ладзіліся толькі ў вёсках. Але, як паказвае вопыт, гэта вельмі карысная практыка і для гарадскіх тэрыторый. Жыхары быццам бы чакалі нагоды, каб сабрацца. Майстрыхі прынеслі свае рукадзельныя рэчы, напяклі булак, мужчыны паставілі сталы, гарадскія ўлады запрасілі артыстаў з Чэрыкава — і свята адбылося. Увесь мікрараён Машэраўскі гуляў тут да самай ночы.

### Раналда... з нашага двара

Спачатку была ініцыятыва **дэпутата райсавета Наталлі ГЕРАШЧАНКІ**.

— На адной з сустрэч з выбаршчыкамі да мяне паступіла прапанова зрабіць футбольную пляцоўку для дзяцей, — расказвае яна. — Я звярнулася з дэпутацкім запытам у наш «Жылкамунгас» да дырэктара Мікалая Лістападава, і ён падтрымаў ідэю. Камунальнікі ўстанавілі нам вароты, мы ж з хлопцамі капалі ямкі, рабілі разметку. Калі футбольнае поле было гатовае, дзеці нават не верылі, што іх мара збылася. Спецыяльна падыходзілі да мяне, каб сказаць «дзякуй».

Тут цяпер збіраецца палова Краснаполля. Прыходзяць аматары з вуліц Цімірязева, Антонава, Будаўнікоў. Па вечарах практыкуюцца дарослыя, а днём ганяюць мяч школьнікі.

— Ці падабаецца пляцоўка? — пытаюся ў іх.

— Канешне! Гэта ж эмоцыі! — выкрыкваюць на хаду дзеці. І трэба яшчэ пачакаць, каб яны на некалькі хвілін спынілі гульню і расказалі пра сябе. Аказваецца тут сабраліся сапраўдныя зоркі. На розных спаборніцтвах у Клімавічах, Касцюковічах, Крычаве юныя краснапольскія футбалісты займаюць выключна прызавыя месцы. Нядаўна ў Краснаполлі адкрыўся ФАК, і там ёсць усе ўмовы для трэніровак. Але адпрацоўваць удары ім усё ж такі падабаецца на сваім полі. І той мяч, які яны зараз ганяюць, не проста так ім дастаўся — Максіму, аднаму з удзельнікаў тутэйшай каманды, яго ўручылі як найлепшаму іграку гульні на кубак двара. Яны ведаюць пра футбол усё, на адным дыханні пералічваюць прозвішчы вядомых футбалістаў — Раналда, Месі, Міранчук, Смолаў, Дзюба, Акінфееў...

— Марыце таксама стаць футбалістамі? — спрабую я спыніць гэты маналог з імёнаў.

— Мы ўжо футбалісты, — смяюцца хлопцы. — Хутка нашымі імёнамі будуць усе ганарыцца!

Адзін з малых у пацвярджэнне слоў дэманструе «вясёлку» — ёсць у футболе такі мудрагелісты фінт — праўда, сціплую. Трэба, каб мяч праляцеў вышэй галавы. Але ж у хлопца яшчэ ўсё наперадзе...

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.**

*г. п. Краснаполле.*

### Каментарый у тэму

**Анжаліка ГОМАН, старшыня Краснапольскага раённага Савета дэпутатаў:**

— Калі праходзілі выбары дэпутатаў мясцовых Саветаў, мы сустракаліся з насельніцтвам і вывучалі іх прапановы. Мікрараён Машэраўскі адзін з самых вялікіх у нашым гарадскім пасёлку, тут жыве больш чым 60 дзяцей. І ім толкам не было дзе гуляць. Наш дэпутат Віталій Макарэвіч, дарэчы, начальнік раённай службы газазабеспячэння, агучыў праблему, і мы сталі думаць, як яе рашыць. Паколькі ў бюджэце лішніх грошай ніколі не бывае, прыйшлося шукаць іншыя крыніцы фінансавання. Асацыяцыя мясцовых Саветаў дэпутатаў пагадзілася падтрымаць ідэю, але толькі ў тым выпадку, калі паўдзельнічаюць і жыхары. Апошнія былі не супраць — сабралі больш чым 200 рублёў. Астатнія 1200 выдзеліла асацыяцыя. На гэтай пляцоўцы мы наогул упершыню распыталі, што гэта такое — суфінансаванне. Вельмі ўдзячныя старшыні абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў Анатолю Мацюліну і старшыні Магілёўскага аблсавета Дзмітрыю Харытончыку — дзякуючы іх намаганням у бюджэты раёнаў былі закладзены гэтыя грошы.

Але разам з тым шукаем магчымасць прыцягнуць фінансавыя сродкі і ўцягнуць людзей у карысную дзейнасць. Заўжды прыслухоўваемся да пажаданняў жыхароў. Ёсць запыт — і мы дзейнічаем, робім усё, што ў нашых сілах. Тая ж Наталля Герашчанка стала яшчэ і ініцыятарам сямейнай алеі ў двары дамоў, дзе жывуць шматдзетныя. Шмат людзей адгукнулася на яе прапанову, прыйшло з рыдлёўкамі, вёдрамі, палівачкамі. І дзеці нам дапамагалі. А мы, у сваю чаргу, сумесна з ратавальнікамі, міліцыяй, нашымі ідэолагамі, БРСМ, раённай грамадскай арганізацыяй «Белая Русь» правялі там сямейнае свята. Заказалі вялікі смачны торт і наладзілі чаяпіцце. А райаддзел па НС арганізаваў паказ тэхнікі і амуніцыі, ахвотныя маглі прымераць баявое адзенне. Дзеці былі ў захапленні.

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

| Извещение о проведении повторного аукциона | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «СМТ № 8», г. Минск, ул. Пионерская, 37 |
| **Предмет аукциона** | |
| **Лот № 1** Месторасположение: **Минская обл., г. Жодино, ул. Дорожная, д. 2** | |
| **Производственная база** в составе: **здание ремонта транспорта** (78 кв. м, 612/С-7856), **здание склада** (404 кв. м, 612/С-4244), **здание склада** (234,5 кв. м, 612/С-5843), **здание мастерских** (458 кв. м, 612/С-4246), **здание ангара** (661 кв. м, 612/С-4240), **здание столярного цеха** (113,7 кв. м, 612/С-4248), **здание административно-бытового корпуса** (318,8 кв. м, 612/С-4999, составные части: две пристройки, навес, ограждения, покрытия, площадка ТБО), **здание склад масел** (55 кв. м, 612/С-4241), **здание автозаправочной станции** (6,7 кв. м, 612/С-4242), **электролиния ВЛ-0.4** (509,7 м, 612/С-6757, составные части: кабельная электролиния, опоры, подстанция (КТП-160кВа-10/0.4)), иное имущество (можно ознакомиться на сайте организатора аукциона www.cpo.by). ***Сведения о земельном участке:*** **пл. 1,9586** га, предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания зданий и сооружений производ. базы. Ограничения (обременения) прав: охранная зона канализац. коллекторов, пл. 0,2678 га | |
| **Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 300 654,04 бел. руб.** (снижена на 70 %) | |
| **Лот № 2** Месторасположение: **Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, пр-т Революции, 9** | |
| **Административно-хозяйственная база** в составе: **административное здание** (1028,6 кв. м, 610/С-2201, составные части: пристройка, водопровод, канализация, теплотрасса, ограждение, площадка, тротуар), **здание служебных гаражей** (214 кв. м, 610/С-2506), **многолетние насаждения** (инв. № 8945) в количестве 16 штук. ***Сведения о земельном участке:*** **пл. 0,3856** га предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания административно-управленческого корпуса и служебных гаражей | |
| ***Обременения***: площади зданий частично сданы в аренду. Более подробную информацию можно узнать у организатора аукциона | |
| **Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 631 190,89 бел. руб.** (снижена на 40 %) | |
| **Лот № 3** Месторасположение: **г. Минск, ул. Кальварийская, д. 37, корп. 1, пом. 2** | |
| **Административное помещение** (653,9 кв. м, 500/D-681880) | |
| **Начальная цена с НДС 20 % – 1 411 255,76 бел. руб.** (снижена на 10 %) | |
| **Задаток 1 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60 BLBB 3012 0191 0213 9000 1001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, г. Минск, ул. Коллекторная, 11, БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки» | |
| **Срок подписания договора купли-продажи: 10** рабочих дней после проведения аукциона | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, условия оплаты предмета аукциона, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by | |
| Извещения о проведении предыдущих аукционов опубликованы в газете «Звязда»: по лотам № 1 и № 2 — 06.07.2019, по лоту № 3 — 18.06.2019 | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия | |
| **Дата и время проведения аукциона: 02.09.2019 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 29.08.2019 до 17.00 по указанному адресу. Тел.: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. E-mail: auction@cpo.by** | |

**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже когенерационной установки JMC 620GS-N.L, принадлежащей ОАО «Тепличный комбинат Мачулищи» (Продавец)**

**Лот № 1.** Когенерационная установка JMC 620GS-N.L, производства австрийской фирмы «JenBacher», состоящей из двух модулей. Г. в. — 2009. Адрес: Минский р-н, г. п. Мачулищи, ул. Солнечная, 6. Начальная цена с НДС — 10 395 600,00 бел. руб. Задаток — 519 780,00 бел. руб. Шаг аукциона — 2 %

**Аукцион состоится 27.08.2019 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4**

Порядок оформления участия в аукционе, условия участия в аукционе, срок заключения договора купли-продажи, условия оплаты, а также полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by.

Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X. Получатель — РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе 27.08.2019 (ОАО «Тепличный комбинат Мачулищи», Лот № 1). Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений 23.08.2019 в 11.00. Организатор торгов вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты его проведения. Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 27.06.2019.

**☎ Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 ● www.ino.by ● e-mail: torgi@ino.by**

ІНІЦЫЯТЫВА ВІТАЕЦЦА

# ЦЯПЕР ЧАРГА ЗА ІНШЫМІ

**Пры фінансавай падтрымцы Пасольства Каралеўства Нідэрландаў у вёсцы Гара ўсталявалі дзіцячы гульнявы гарадок, а ў клубе з'явілася добрае гукавое абсталяванне.**

У Задуброўскім сельскім Савеце дэпутатаў Віцебскага раёна падзяліліся вопытам, як можна атрымаць фінансаванне ў рамках праекта (ПраААН) садзейнічання развіццю сельскай тэрыторыі на мясцовым узроўні.



**Намеснік старшыні Віцебскага райвыканкама Жанна ЧАРКУНОВА** адзначыла, што мясцовая ўлада падтрымлівае ініцыятыву ва ўсіх пытаннях, калі гэта датычыцца паляпшэння жыцця людзей: зялёнае свята ўсім, хто хоча стаць індывідуальным прадпрымальнікам, займацца аграрным турызмам, аказваць паслугі аўтамабілістам на аб'ектах прыдарожнага сэрвісу і гэтак далей.

Бабініцкі і Мазалаўскі сельскія Саветы ўжо пасяхова рэалізавалі праекты развіцця сваіх тэрыторый. Беражлівае стаўленне да прыроды, інтарэс да культуры, камп'ютарная адукацыя людзей сталага ўзросту, захаванне і вывучэнне традыцый продкаў — гэтыя і іншыя пытанні былі ключавымі. Цяпер чарга за іншымі сельсаветамі Віцебскага раёна.

І ў ліку іншага – прыцягненне грантавых сродкаў – гэта адзін са шляхоў у рэалізацыі сямнаццаці глабальных Мэт устойлівага развіцця. Як вядома, Беларусь вельмі актыўна ўключылася ў адпаведную дзейнасць. І рэгіёны ў гэтым бяруць актыўны ўдзел.

**Старшыня Задуброўскага сельскага Савета Сяргей МАКУХА** канстатаваў, што, на жаль, вяскоўцам пакуль што асабліва ганарыцца няма чым. Насельніцтва скарачаецца, людзі з'язджаюць, купляюць жыллё ў пасёлках раёна, дзе створана сацыяльная інфраструктура.

Хоць, напрыклад, добрыя перспектывы ў пытанні развіцця турызму. Было б толькі каму ім займацца.

У згаданай вышэй вёсцы Гара ўжо прымалі гасцей, у тым ліку і замежных. А скрыпень і іншыя экалагічна чыстыя прадукты адсюль прадаюцца ў крамах.

Кіраўнік сельвыканкама, дарэчы, адзначыў, што гарбата са скрыпеню вельмі спадабалася прадстаўнікам Казахстана, якія наведалі з афіцыйным візітам раён. Можна было б наладзіць збор, апрацоўку і фасоўку карыснага для здароўя прадукту ў прамысловых маштабах.

Сярод удзельнікаў форуму быў **Аляксей ТАЛАЙ, рэкардсмен свету і Еўропы, член Нацыянальнай параалімпійскай зборнай па плаванні, майстар спорту, зорны пасол II Еўрапейскіх гульняў і факеланосец «Полымя міру».** А яшчэ ён прадпрымальнік і грамадскі дзеяч, мецэнат. Яго ведаюць і як матывацыйнага спікера — выступаў у Расіі, Еўропе, Індыі, ЗША і іншых краінах.

Аляксей сказаў, што экалагічна чысты турызм вельмі папулярны ў Еўропе. А за экспартам ежы без «хіміі» — будучыня. І ён вельмі рады будзе асабіста спрыяць таму, каб у Віцебскі раён прыязджалі з-за мяжы, каб тую ж гарбату і іншую прадукцыю экспартавалі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ, фота аўтара.**

*Віцебскі раён.*

# Гедымін прызямліўся ў Лідзе

## На гэтым тыдні завяршылася ўстаноўка помніка вялікаму князю ВКЛ



Бронзавая скульптура, вагой 2,5 тоны прыбыла з Мінска і ўстаноўлена каля Лідскага замка на падрыхтаваны пастамент, паведамляе «Лідская газета». Работа па ўстаноўцы вялася спецыяльным кранам. Аўтары праекта і непасрэдна самой скульптуры – Сяргей Аганаў і Вольга Нячай таксама прыехалі ў Ліду, каб завяршыць справу. Апошнім штрыхом стаў надпіс на пастаменце «Гедымін» і герб «Калюмны», якія зроблены аўтарамі з дапамогай трафарэта.

Падчас работы прысутнічалі і спонсары праекта — ІП «Белтэкс Оптык» і Лідская ЖКГ. Урачыстае адкрыццё помніка адбудзецца 7 верасня, у Дзень горада.

КАБ НЕ ЗНІКЛІ

# Занатавана краязнаўцамі

## Захаванню гістарычнай і культурнай спадчыны малой радзімы вучыліся старшыні раённых Саветаў дэпутатаў Гомельскай вобласці ў Лоеўскім раёне

**Дарэчы, на тэрыторыі Лоеўшчыны 125 аб'ектаў спадчыны. 54 з іх уключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь. Дэпутаты наведалі помнік архітэктуры першай паловы XIX стагоддзя — сядзібу графіні Бараноўскай, купецкі дом Далгіных, пабывалі ў Лоеўскім музеі бітвы за Дняпро, на мемарыяльным комплексе «Героям Дняпра» і ўсклалі кветкі на брацкім пахаванні.**



Як расказала **старшыня Лоеўскага раённага Савета дэпутатаў Ірына ПАСТУХОВА,** менавіта помнікі гісторыі, звязаныя з Вялікай Айчыннай вайной, складаюць самую значную групу гісторыка-культурных каштоўнасцяў Лоеўскай шматпакутнай зямлі:

— Асобная размова пра помнікі археалогіі. Гэтая зямля ўтойвае ў сабе вытокі мясцовай культуры, захоўвае рэшткі старажытных селішчаў, сляды гаспадарчай дзейнасці чалавека, яго матэрыяльнай культуры. Тут навукоўцы і археолагі карпатліва збіраюць і аднаўляюць гістарычныя рэліквіі.

Супрацоўнікі музея бітвы за Дняпро паведамілі пра ўдзел у арганізацыі і правядзенні шэрагу вучэбных і кансультацыйных навукова-метадычных семінараў па ўвекавечванні памяці загінулых. Ва ўстанове пастаянна вядзецца работа па кансультаванні ўласнікаў і карыстальнікаў гісторыка-культурных каштоўнасцяў. (Размова пра выкананне ахоўных абавязацельстваў і рэжыму ўтрымання аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны.)

Цяпер у музеі наладжана супрацоўніцтва з грамадскай арганізацыяй «Беларускі зялёны крыж»: арганізуюцца азнаямленчыя экскурсіі па аб'ектах спадчыны, актывізавалася краязнаўчая работа па вывучэнні малой радзімы. Так, з 2016 года пры музеі працуе сямейны клуб «Спадчыннікі Лоя». Яго дзейнасць накіравана на аб'яднанне энтузіястаў-аматараў, краязнаўцаў, гісторыкаў, навукоўцаў і патрыётаў сваёй малой радзімы ў мэтах вывучэння гісторыі Лоеўшчыны, захавання традыцый, прыцягнення моладзі да памнажэння спадчыны.

Сумесны праект Лоеўскага музея бітвы за Дняпро і Лоеўскай цэнтральнай раённай бібліятэкі мае назву «Захавальнікі спадчыны». Краязнаўцы і гісторыкі распрацавалі апытальнікі, ажыццяўляюць аналіз бібліяграфічных, археалагічных і гістарычных матэрыялаў, робяць аналітычны агляд айчыннай, замежнай літаратуры і мясцовага друку, а таксама вывучаюць сацыяльна-культурныя, архітэктурныя і эканамічныя матэрыялы. Навуковымі супрацоўнікамі створана база даных «Жыхары Лоеўскага краю, вывезеныя на прымусовыя работы ў Германію», збіраецца інфармацыя ў выглядзе інтэрв'ю і ўспамінаў людзей.

Тыя вёскі, якія непазбежна знікаюць з карты Лоеўскага раёна, супрацоўнікі музея імкнуцца захаваць у фотаздымках і нататках былых жыхароў. Сабрана больш за 700 электронных копій фатаграфій, на якіх — выявы мясцовых жыхароў і населеныя пункты раёна.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

ЗАПРАШАЛЬНІК

# Жоўтыя, чырвоныя, зялёныя...

## Феерверк кветак і яблычны фэст адбудуцца 17 жніўня ў Карэліцкім раёне

**Суботні дзень мае быць насычаным колерамі кветак ды яблычным водарам. На Карэліччыне праспяваюць гімн яблыку, пакаштуюць прысмакі з гэтай садавінай і нават зробяць з яе сувеніры. А кветкамі тут упрыгожаць ровары ды іншыя рэчы, сплятуць вянкі і станцуюць кветкавы танец.**

Аграгарадок Аюцавічы стане кветкавай сталіцай раёна. У 15 гадзін свята пачнецца каляровым шэсцем «Феерверк кветак». Далей гасцей чакаюць конкурсы на найпрыгажэйшы вянок, на самы маляўніча аздоблены кветкамі ровар, найлепшую фігуру з кветак і іншыя.

Дзецям пакажуць гульнявую праграму «Кветачка сямікольрная» і дазволяць ад душы памаляваць на асфальце. А дарослыя змогуць паўдзельнічаць у танцавальным флэш-мобе, набыць кветкавыя сувеніры і паслухаць святочны канцэрт.

А 17-й гадзіне раённыя забавы перанясуцца ў вёску Кожава Жухавіцкага сельсавета, дзе пройдзе «Яблычны фэст». Сельскагаспадарчы вытворчы кааператыў «Жухавічы» – адзіная ў раёне гаспадарка, якая спецыялізуецца на вырошчванні яблык і мае 40 фруктовых гектараў.

Гасцей чакае тэатралізаваная праграма «Гімн яблыку», пляцоўка, дзе можна пабачыць «100 яблычных забаў», і яблычныя прысмакі. На свяце вызначаць найлепшага кулінара, які прыгатуе самую смачную і прыгожую шарлотку, і адшукаюць найлепшы яблыневы сад. Госці згуляюць у яблычныя шашкі, змайструюць на памяць сувенір з яблык і, вядома, пакаштуюць самыя розныя сарты жоўтых, чырвоных і зялёных фруктаў.

Падчас яблычнага фэсту ў вёсцы ўганаруюць пары залатых і сярэбраных юбіляраў, а таксама наймаладзейшага і найстарэйшага жыхара Кожава.

Бліжэй да вечара, пасля 20.00, свята перамесціцца на бераг мясцовага возера.

**Ірына СІДАРОК.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**

**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 287 18 31;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 15 жніўня 2019 года.**